БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА, ЗАСНАВАНАЯ Ў 1906 Г. У ВІЛЬНІ, АДНОЎЛЕНАЯ ТАМСАМА Ў 1991 Г. З 1 САКАВІКА 1996 Г. ВЫХОДЗІЦЬ У МЕНСКУ. ВЫДАВЕЦ РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ «НАША НІВА»

* * *


Тое, што потым
схавае найменьне сваё,
варта дарозе закончыцца —
можа, любоў?... —
поўніць мяне адзінотай тваёй
да краёў –
я то сьмяюся,
то ціха пяю, то заплачу...

Нешта трывае ўва мне,
покуль будуць расстаньні,
існае сёньня, што, потым,
як морак, растане...
Сьмешнае слова прыдумалі людзі —
«каханьне»,
чуеш: «кахаю»,
хоць словы нямногае значаць.

Нішчыць адлегласьці ноч.
Пасьля зморы будзённай,
я паўтараю твае залатыя імёны,
нібы зямля пасьля граду
жаданых насёнаў,
багаслаўляю жыцьцё, і сьвятло,
і вясну...

Нішчыць адлегласьці сон,
а на золку здаецца —
злоснае сонца наўжды
упіваецца ў сэрца,
вострымі промнямі ў вокны
насьмешліва б'ецца —
што ж, да спатканьня, —
да ночы, да новага сну!

Т.С.



НАША НІВА

№ 10 (107) 1 чэрвеня 1998 г.

Адлюстраваньне аблокаў

Адноўленая напрыканцы траўня 1991 году «Наша Ніва» пачынае сёньня восьмы год свайго існаваньня.

За гэты час не аднойчы зьмяняўся сьвет вакол газэты, зьмянялася і сама «НН». Але пачатковыя прынцыпы засталіся непарушнымі — мы імкнуліся адпавядаць Беларусі. Не паветрыям, што праносяцца па-над ёю, ня ўладам і іхным апанэнтам, і нават не чытачам. Часам нам гэта ўдавалася. Тады ў старонках газэты адбіваўся нясьпешны рух аблокаў, што плывуць па небе нашае Бацькаўшчыны.

У закалотах людзкое нянавісьці мы атрымалі найменьне апазыцыйнай газэты. Нас спрабавалі любіць або ненавідзець у катэгорыях антыўрадавасьці або прыхільнасьці да фронту. Урэшце нас папракалі малым тыражом, слабым уплывам на электарат. «Гэта наша Беларусь яшчэ ня можа ўплываць болей, — казалі мы сабе. — Але мы ня будзем патрафляць электарату, бо гэта значыць — забіваць у сабе Беларусь. Выданьні, якія пайшлі гэтым шляхам, даўно страцілі мэту і смак жыцьця».

Вялікія тыражы сёньня дасяжныя толькі наўзамен прынцыпаў і ідэалаў. І справа нават ня ў тым, што ты пішаш пра групу «на-на», кпіш з калхозьніка-ППРБ або друкуеш рашучыя воклічы лідэра апазыцыі, якія ніколі не спалучаюцца з адпаведна рашучымі дзеяньнямі. Справа ў розумах змагароў за тыраж, якія ня мысьляць сябе ў прасьцягу нацыянальнае традыцыі, ня ведаюць сапраўднае вартасьці слова, бо ніколі не пачыналі з тыражоў «пад капірку». Мы ж памятаем, што якая-небудзь падпольная публікатка 70-х гадоў накладам у 2 асобнікі праз 20 гадоў апасродкавана прывяла да гістарычнага перавароту ў Беларусі, тады як мільённыя газэтныя фаварыты таго (і нашага) часу ў тым часе і засталіся, ніяк не паўплываўшы на сытуацыю.

Няпросты шлях масавае аўдыторыі да беларушчыны. На сёньня прыйшлі толькі тысячы, а ня сотні тысячаў, якія пакуль прыйшлі ў нікуды. Вось на тых, «нікудышных», і робяцца сёньня тыражы. Але для гэтага выдаўцам даводзіцца падладжвацца пад нікудышнасьць. Ці далучаюць свайго чытача да Беларусі сучасныя апазыцыйныя газэты? Па-мойму, наадварот, яны толькі самі аддаляюцца ад яе.

Лукашэнкава РБ і абумоўленая ёю апазыцыйная анты-РБ, электарат і анты-электарат, — гэтыя каардынаты ўсё менш тычацца Беларусі як ідэалу і прынцыпу, як паветра, якім можна дыхаць і за якое можна скласьці галаву. Яны, процілеглыя, усё больш зліваюцца ў сваёй саўковай скрайнасьці, дзе няма месца ані высокай культуры, ані прафэсійнай навукі або палітыцы. Урэшце ўсё ператвараецца ў пагоню за тыражом саўка — за- або супрацьлукашэнскага — бяз розьніцы.

Зразумела, нас усьцешвае, што за апошні год падпіска на «НН» павялічылася ўдвая, бо мы разумеем вартасьць свае аўдыторыі, якая гуртуецца фармальна вакол «НН», а сутнасна — у Беларусі. Але наша задача — працягваць сваю справу нават тады, калі б з намі не засталося ніводнага чытача. Бо нават калі б у Беларусі не засталося ніводнага абаронцы, мусіць захоўвацца тое месца, куды заўтра змаглі б прыйсьці мільёны.

Беларусь сёньня зноў, як і за саветамі, — па-за палітыкай. Пройдзе яшчэ трохі часу, і яна апынецца па-за навукай і па-за культурай — убогімі падабенствамі савецкіх узораў. Чыстая, яна будзе жыць, як жыла за саўдэпам — міма ладу і міма соцыюму, міма тыражоў і абэцэдаршчыны. Нашая мэта — застацца зь ёю, быць люстэркам жаданьняў, адлюстроўваць нясьпешны бег аблокаў па ейным небе.

Сяргей Дубавец

ДАЧАКАЛІСЯ...

Я доўга чакаў, калі ж нарэшце зьявіцца той творца, які «воспоет» новыя, зацьверджаныя рэфэрэндумам сымбалі краіны. Гэты час цягнуўся неяк да прыкрасьці доўга. Мяне нават ахопліваў нейкі сорам за прэзыдэнцкую эліту.

Але вось да трэцяй гадавіны Першага Рэфэрэндуму у № 65 БПСМаўскай «Знамя Юности» я пабачыў два вершы, прысьвечаныя новым сьцягу і гербу. Браніслаў Спрынчан адзін зь першых захапіў гэтую нішу. «Наш Флаг», «Герб Державы Белорусской». Віншуем!

Вершы перапоўненыя гонарам за нашую краіну і яе сымбалі. Прыгожа напісана: «... Не гривастый лев и не орел, и не всадник, вскинувший клинок, — Утреннего солнца ореол, Из колосьев и цветов венок...» Але шмат людзей, якія не жылі на вёсцы, могуць зблытаць узыходзячае сонца з заходзячым. А вянок... гм... няёмка і сумна прыгадваць, дзе яго можна пабачыць найчасьцей.

Паэт Уладзімер Дубоўка, закатаваны пад чырвоным сьцягам, мабыць, у магіле павярнуўся — цяперака ягоны ўрывак ідзе эпіграфам да верша пра «Наш Флаг»: «О Беларусь, мая шыпшына, зялёны ліст, чырвоны цьвет!» — некалькі гадоў таму ў модзе быў працяг — там дзе: «чарнобылем не зарасьцеш». Але цяперака, як лічаць некаторыя пра Дубоўку: «Дорогого мне поэта мог ли я не вспомнить, если Два его любимых цвета на полотнище воскресли...» Ну нарэшце зьдзейсьнілася апошняя мара Дубоўкі пра беларускі сьцяг. Стаяў сабе паэт перад магілай, марыў, а НКВДэшны кат цэліў у патыліцу.

Дарэчы, пацягнула ад твораў нечым старым і знаёмым. Памятаеце: «Всегда мы помним Ленина и думаем о нем. Мы день его рождения считаем лучшим днем!»

Трэба ўсё ж такі распачаць гаворку пра літаратурных творцаў і рэжымы. Праглядаў неяк старыя нумары «Полымя». Калі зь сёньняшняга дня лічыць — колькі паперы змарнавалі на ўхваленьне Партыі і Правадыра. Некаторым вядомым і «заслуженным», мабыць, крыху няёмка — раптам унукі пажадаюць пачытаць дзядулевы маладзёвыя творы.

Пасьля 90-га адкрыйце «ЛіМ». Здаецца, быццам бы конкурс быў аб'яўлены ці які спаборніцтвы ішлі — хто болей напіша пра вершніка на чырвоным полі і сьцяг з крывавай паласой.

Дзе вы цяпер, тыя вядомыя й «заслужаныя»? Куды падзелася вашая вялікая любоў да нашых сымбаляў. Ці вам зноўку сорамна і няёмка — перад новым урадам і прэзыдэнтам? Не падумалі, не перачакалі! Цяперака пра «Пагоню» і бел-чырвона-белы пішуць толькі маладыя нацыяналісты і рэштка «изгоев», але зь імі й так усё зразумела.

Нашая літаратурная эліта вырашыла зноў перачакаць пэўны час. Агледзецца. Але ж трэба пачынаць некаму, хтосьці павінен быць першым. Пасьля можа й нейкую ўзнагароду за сьмеласьць дадуць, якое званьне. У «новыя» падручнікі разам зь іншымі знакамітасьцямі трапіш. На месца Геніюш, Арсеньневай і Сяднёва.

Ды невялікая памылачка адбылася. Ня будуць помніць гэтыя творы Спрынчана нашчадкі. Бо не патрапяць яны ў падручнікі беларускай літаратуры. Не на той мове напісаныя. У падручнікі па расейскай ці сусьветнай літаратуры? Неяк няёмка казаць, але... ня цягне... не па тэме...

Калі толькі ня зьявіцца ў нашых школках новая дысцыпліна — «Белорусская русскоязычная литература». А то нейкае парушэньне правоў адбываецца.

Руслан Равяка

Сёньня многія патрыёты праяўляюць вялікую цікаўнасьць да «беларускай лацінкі» — лацінкавага альфабэту, якім пэўны час у гісторыі пісалі па-беларуску. Прыхільнікі лацінкі заклікаюць таксама адрадзіць лацінку — ці то як адзіны альфабэт, ці то як паралельны з кірыліцай.

Вядома, што ці найбольш моцным довадам каштоўнасьці чагосьці ёсьць традыцыя. Гэты тычыцца і альфабэту, таму прыхільнікі лацінкі згадваюць пра самабытнасьць традыцыі яе ўжываньня, і гэтым падмацоўваецца яе папулярнасьць.

Якая ж традыцыя ў беларускай лацінкі? Апошнім часам можна пачуць, што беларуская лацінка нарадзілася аж у часы ВКЛ, а значыць яе самабытнасьць бясспрэчная: часы ВКЛ — наш «залаты век». Але ці так гэта ўзапраўды? Які яе сапраўдны ўзрост?

Распаўсюдзілася памылковае меркаваньне, што беларуская лацінка ўпершыню зафіксаваная ў 16 ст., яшчэ дакладней (але бліжэй да 17 ст.), у 1596 г. («Наша Ніва», № 13-14, 1997 г., «Беларуская лацінка», Ю.Б., Б.: «Першыя фіксацыі лацінкавага напісаньня беларускіх тэкстаў адносяцца да 16 ст.». «Наша Слова», № 9, 1995 г., «Не панацэя, але важны сродак ўратаваньня нашай мовы і нацыі», Язэп Стапановіч: «Адной зь першых значных кніг, напісаных па-беларуску лацінскім шрыфтам, лічыцца «Казаньні Кірыла» С.Зізанія (Вільня, 1596). На жаль, стваральнік беларускай лацінкі невядомы.»). Памылковасьць такога меркаваньня была даведзеная ў артыкуле «Асьцярожна з лацінкай!» («Наша Слова», № 50, 1995 г.). Тым ня менш, гэта не перашкодзіла па-

Носьбіты мовы

Мову не абараняюць, на ёй гавораць; культуру не абараняюць, а спажываюць яе прадукцыю. Гэтыя простыя праўды згадваюцца кожны раз, як чуеш на мітынгах заклік прафэсара Карпенкі «забаронім нашу Беларусь ад плянаў дыктатара», або верш прафэсара Шарэцкага пра «няшчасны народ працалюбівы». Мову, культуру носяць: каля сябе, за сабой, у сабе, на сваім гарбе.

ЗАРАЗІЦЬ АБО ПАМЕРЦІ

Носьбіт мовы, культуры — вырак і выйсьце — жорстка і трапна. Носьбіт зараду, інфармацыі, віруса і — мовы, культуры. Паспрабуйце перакласьці гэты выраз на іншыя мовы — цяжка.

Калі яе носьбітаў застаецца мала, быццам запалак у пушцы турыстаў, што заблукалі ў лябірынтах (пячоры ці катакомбаў — хто яго знае), мова робіцца сымбалем, знакам богаабранасьці, ці багаборства, ці бажавольства. Носьбіт: можа заразіць, а можа выклікаць жаль, або нянавісьць, пагарду, можа напалохаць, можа загінуць — як пракажоны, як шызафрэнік, як геній.

У вялікіх гарадах Беларусі беларускамоўных цяпер прыкладна столькі сама, як заражаных СНІДам. Кожны прыналежны да моўнай меншасьці носіць у сабе часьцінку гета, расьцярушанага па урбаністычнай прасторы. Гета — гэта я і ты.

Цяжка пазбыцца адчуваньня жывога экспанату ў заапарку «Беларусь», экзатычнага калекцыйнага жука на шпільцы («папаўся, жучку, у панскую ручку!»). «Вы так красіва размаўляеце! Па рабоце ілі как?» — вось адна з рэплік, якую носьбітам мовы часта даводзіцца чуць. Як чалавек, на якога ўвесь час паказваюць пальцам, гарадзкі белмоўны хутка пачынае цаніць маўчаньне і разумець абмежаванасьць рэакцыяў, якія выклікае ў буржуа (о, слодыч і паскудзтва іх сытага жыцьця). Часам нянавісьць: «Мёртвые языки, ну-ну, достояние человечества...» Fuck off, вы здохнеце хутчэй, чым «мёртвая» мова. Часам парнаграфія: «Как рецензент могу сказать, что работа очень интересная. Правда, белорусским языком я не владею, поэтому не могу полностью оценить...» Кітайскай мовай не валодаю, але магу адзначыць вельмі харошы герогліф у кутку на пятай старонцы.

Бязь яснага ўсьведамленьня таго, што беларускамоўныя жывуць у культурным гета, а іх мастацтва і літаратура ёсьць, папраўдзе кажучы, дыяспарнымі ў сябе на бацькаўшчыне, мы будзем і далей грузнуць у манілаўскіх пражэктах і дурнаёпстве. Сёньняшні стан рэальны, а, дык жа, нармальны. Гэта драматычны, але не трагічны і не камічны стан, як тое спрабуе прадставіць нашая расейскамоўная інтэлігенцыя, гаворачы то пра «звычайнага прэзыдэнта», то пра «калхоз «Беларусь». Гэта ня новы для Беларусі стан (ён паўтараецца ў пасьлясярэднявечнай гісторыі краіны). Гэта не ўнікальны для сьвету стан. Дакладней, ён унікальны толькі тым, што ён стварыўся ва ўмовах існаваньня амальдзяржавы «рэспублікі Беларусь», фармальна ўтворанай вакол тытульнай групы, ядро якой складаюць якраз белмоўныя. Сёньняшняя фіктыўна-беларуская дзяржаўнасьць моцна ўводзіць у зман, але яна стане — у свой час, праз пяць ці сто пяць гадоў, калі ўзьнікнуць мінімальныя эканамічныя перадумовы ці трансфармуецца будова эўрапейскай эканомікі — неацэненай падставай для дасягненьня рэальнай незалежнасьці і яе замацаваньня далучэньнем да палітычнага і ваеннага блёку эўрапейскіх дзяржаваў. І тых, хто мае моцнае пачуцьце грамадзянскага нацыяналізму, гэтае «пяць ці сто пяць» не найбольш турбуе. Проста кожная эпоха мае сваё прызначэньне. Зразумець — вось задача.

Пра аналёгіі. Мы знаходзім іх на Пуэрта-Рыка, у Ірляндыі, Паўночнай Ірляндыі, Нарвэгіі, Чувашыі, Прыднястроўі, Македоніі, Славаччыне, на каморскім востраве Анжуан, жыхары якога патрабуюць, каб іх прынялі назад пад францускую ўладу, ва Ўкраіне, нарэшце (пра «прыклад Украіны» можна пісаць і пісаць, бо ён ужо згуляў і яшчэ згуляе неабыякую ролю). Аналёгіяў сьвет, як і варыянтаў разьвіцьця, і жыцьцё можа павярнуцца любым бокам.

Каб зразумець, трэба дэміталягізаваць сытуацыю.

Маецца фіктыўна-беларуская квазідзяржава, якая што ёсьць моцы выконвае заданьне: не дапусьціць утварэньня ў Беларусі моцнай грамадзянскай супольнасьці. Маецца пануючая сацыяльная група, якая зьяўляецца падмуркам гэтай квазідзяржавы і стаўляе ёй заданьні. Гэтую групу нельга назваць «буржуазіяй», бо яе члены — ня ўласьнікі, а самі найманыя кадры, рабы ананімнай структуры, што хаваецца пад псэўдонімам «дзяржава». Трэба акрэсьліць, з каго складаецца гэтая квазібуржуазія.

Маецца нешматлікая шпрэхтрэгерская беларуская інтэлігенцыя — нацыяналістычная, але кепска адукаваная, неспадчынная і аморфная, а таму схільная да рэзыгнацыі. Маюцца пачаткі грамадзянскай супольнасьці з зародкамі партыяў, рэлігійных грамадаў і ўсяго іншага. Маюцца дзьве культуры і... неакрэсьленая колькасьць моваў і ідэалёгіяў.

У беларускім грамадзтве суіснуюць дзьве культуры, беларуская і расейская, але яно не двухполюснае. Старыя падзелы (камуністы/антыкамуністы) суняліся; новыя або нетрывалыя й нясутнасныя (лукашысты/антылукашысты, багатыя/бедныя), або неўсьвядомленыя (панская група/прыгонная большасьць). Традыцыйныя статыстычныя зьвесткі таксама кажуць няшмат.

Рэальна сёньня маюцца беларускамоўныя (прыкладна 8-11% насельніцтва), расейскамоўныя (прыкладна 45-50% насельніцтва) і тыя, хто выкарыстоўвае «трасянку» (35-40%). Але і гэты падзел не канчатковы.

Расейскамоўныя (іх колькасьць няспынна расьце, пачынаючы ад Другой сусьветнай вайны ды нават ад даўней, за кошт дзьвюх іншых групаў) распадаюцца на два ідэалягічна-культурныя лягеры. Першы складаецца з расейскамоўных расейцаў і татальна дэнацыяналізаваных абарыгенаў (яны акрэсьлівалі расейскую мову як родную нават на перапісе) (усяго 20-25% ад насельніцтва Беларусі). Гэтая група карыстаецца выключна расейскай культурай, заснаванай на ідэалёгіі расейскага (імпэрскага) нацыяналізму або ў ягонай адкрытай этнічнай, або ў прыхаванай нігілістычна-касмапалітычнай форме, і складае ядро панскай вярхушкі. У яе складзе таксама сьвет усялякіх маргіналаў, падобных да старажытнарымскай чыстакроўнай галоты. Усе падзеі 80-90-х гадоў вельмі мала паўплывалі на сьветагляд гэтых людзей: яны працягваюць ігнараваць існаваньне беларускай нацыі і культуры, уважаючы іх калі не за «прыдумку палякаў і пісьменьнікаў», дык, прынамсі, за «сапсаваны», часовы, штучны і нічога ня варты варыянт расейскага («усе мы славяне — адзін народ»).

Да другога адносяцца расейскамоўныя беларусы. Гэтыя, дасканала валодаючы расейскай мовай і карыстаючыся толькі ёю, захоўваюць сувязь зь беларускай культурай (сьвяты, пабытовыя звычкі, вартасьці, пасіўнае валоданьне мовай, эпізадычнае сымбалічнае або настальгічнае спажываньне культурнай прадукцыі, грамадзянска-палітычны нацыяналізм).

Але гэтыя другія таксама не аднародныя. Частка, адукаваная, актыўна выступае за рынкавыя рэформы, незалежнасьць, супраць Лукашэнкі, за дэмакратычныя вартасьці і нават за экспансію беларускай мовы і культуры і «пазытыўную дыскрымінацыю» сваёй (так-так!) расейскай. Такіх нямала, але ўсё ж меншасьць. Іншай частцы расейскамоўных беларусаў усьведамленьня нацыянальнай ідэнтычнасьці бракуе. Іх «бело-(западно)-русскость» больш падобная на тэрытарыяльны патрыятызм, чым на акрэсьленае этнічнае пачуцьцё.

Тым ня менш, абедзьве гэтыя падгрупы займаюць сваё месца ў прэстыжным расейскамоўным сьвеце, «першым сьвеце» савецкай эпохі — сьвеце гарадзкім, адукаваным, адным словам, панскім.

ТРАСЯНКА ЯК КАМПРАМІС

Узьлёт Лукашэнкі стаў проста адной з праяваў фэнамэнальнага выйсьця на грамадзкую авансцэну трасянкамоўных. Трасянкаю традыцыйна дазвалялася карыстацца «мясцовым кадрам» вышынёю аж да Дземянцея. Трасянка была дапушчальным, бясьпечным для калянізатараў этапам па шляху дэнацыяналізацыі. Што такое трасянка?

Лінгвістычна група, што ўжывае яе, распадаецца на дзьве падгрупы. Першыя гавораць сапраўды на мяшанцы беларускіх і расейскіх словаў з захаваньнем пераважна беларускага сынтаксысу (жыхары ўсходнебеларускіх вёсак, хутчэй слабей мадэрнізаваных; панямонскіх і паазерскіх мястэчкаў; нізкакваліфікаваныя работнікі ў гарадах; хутчэй жанчыны, чым мужчыны, што служылі ў войску; хутчэй людзі старэйшага ўзросту). Гэтая мяшанка — вельмі ўнутраны дыялект і мае ўжытак толькі ўнутры сям'і, унутры вёскі. У іншых камунікатыўных сытуацыях яго носьбіты хутчэй-хутчэй пераходзяць на расейскую.

Пераход на расейскую мову — пропуск у «лепшы» сьвет. Ад савецкіх часоў замацаваўся стэрэатып, што такі пераход — умова ўваходу ў панскую клясу. Тыя, хто ўжо амаль скончыў гэты пераход, карыстаюцца другім варыянтам трасянкі: расейскай мовай з пэўнай колькасьцю беларускіх і проста гутарковых лексычных, граматычных і, вядома, фанэтычных элемэнтаў.

Культурна-ідэалягічна тыя, хто гаворыць на трасянцы, адрозьніваюцца большай схільнасьцю да ідэяў этнічнага, а не грамадзянскага нацыяналізму і іншымі рысамі, характэрнымі для людзей зь нізкім узроўнем адукацыі.

Колькасна гэтая група будзе ўвесь час зьмяншацца, бо прырастала за кошт беларускамоўных, а крыніца вычарпалася, і бо дзеці трасянкамоўных, пачынаючы з пачатку 90-х, вучацца мове не ад бацькоў, а ад тэлебачаньня. Калярытная гаворка-трасянка мае незаслужаную, але непапраўную адмоўную рэпутацыю, лічыцца прыкметай «бескультурнасьці» і «неадукаванасьці» так, як яшчэ ўчора хамскай лічылася белмова. Трасянкі, як і дыялектаў, не ўратуе ніхто. Аднак жа ў 90-х з трасянкай прымірыліся як з своеасаблівым кампрамісам, а lean compromise, узгадваючы тую ангельскую мудрасьць (ужо ня кажучы пра тое, што соцыяідэялягічная група носьбітаў трасянкі была самай шматлікай).

Беларусафоны. Тут можна адзначыць, з аднога боку, сельскіх жыхароў старога веку, з другога, сіх-тых жыхароў Панямоньня і Паазер'я, а з трэцяга, вельмі малалікую групу інтэлігенцыі і нацыяналістаў (якіх 0,1% ад насельніцтва Беларусі). Першыя неўзабаве адыйдуць, а другія і трэція застануцца носьбітамі таго, што аднойчы

УЗРОСТ БЕЛАРУСКАЙ ЛАЦІНКІ

мылцы паўтарацца — ужо ў «Нашай Ніве». Таму лічу патрэбным яшчэ раз і падрабязней зьвярнуць увагу на гэтую памылку, каб зман не пашыраўся далей.

Ні Ю.Б., ні Я.Стапановіч не ўказалі крыніцы пададзеных зьвестак. Аднак яна відавочная: энцыкляпэдыя «Беларуская мова», артыкул «Лацінка», а менавіта сказ: «Лацінка ўжывалася побач з кірыліцай і ў друкаваных кнігах рэлігійных жанраў, напрыклад, «Казаньні Кірыла» (Вільня, 1596), дзе паралельна зь беларускім зьмешчаны польскі тэкст». Сапраўды, будучы настроеным знайсьці зьвесткі менавіта пра беларускую лацінку, можна зразумець гэты сказ так: у ВКЛ па-беларуску пісалі не толькі кірыліцай, але і лацінкай, і прыкладам апошняга — «Казаньні Кірыла» 1596 г., такім чынам, гэта — першая фіксацыя беларускай лацінкі. Магчыма, што і адна зь першых. Магчыма, што ўсе яны адносяцца ня толькі да канца 16 ст., а да ўсяго, цэлага 16 ст.

Тым ня менш, гэты сказ нічога не гаворыць пра беларускую лацінку, пагатоў ня ўказвае яе прыкладаў. Сапраўды, напісана, што лацінка ўжывалася побач з кірыліцай, і ўказаны прыклад такога ўжываньня. Але маецца на ўвазе ня тое, што побач зь беларускамоўнымі тэкстамі на кірыліцы былі беларускамоўныя тэксты і на лацінцы, а тое, што былі кнігі, дзе побач з тэкстамі на мове з кірылічнай графікай былі тэксты на мове з лацінкавай. Якраз пра гэта і гаворыцца ў самым канцы сказу: «... Казаньні Кірыла» (Вільня, 1596), дзе паралельна зь беларускім зьмешчаны польскі тэкст», г.зн., у «Казаньнях...» на кірыліцы — беларускі тэкст, а на лацінцы — польскі, і гэта прыклад, калі ў кнігах лацінка ўжывалася побач з кірыліцай (а ня першая фіксацыя беларускай лацінкі). Такім чынам, памылка — у няслушным вытлумачэньні згаданага сказу.

А калі ж узьнікла беларуская лацінка? Зрэшты, можа, А.М.Булыка сапраўды адносіць яе першую фіксацыю да 16 ст.? (Згадзіцеся, сказ даволі двухсэнсоўны і спрэчны). Тады гэта павінна пацьвердзіцца і ў яго іншых артыкулах. Цытую артыкул таго ж А.М.Булыкі «Алфавіт» (тамсама): «Кірылічны алфавіт выкарыстоўваўся ў старабеларускім пісьменстве ад 14 да 18 ст. У 18 — пачатку 20 ст., у сувязі зь яго заняпадам стаў ужывацца лацінскі альфабэт, які дагэтуль служыў толькі для афармленьня польскіх і лацінскіх тэкстаў». Як бачым, на гэты раз аўтар вырашыў ясна і недвухсэнсоўна: беларуская лацінка ўзьнікла не раней за 18 ст. Іншыя навукоўцы таксама не аспрэчваюць гэтага.

Значыць, няма падставаў лічыць яе самабытнай традыцыяй, бо ўзьнікла яна як адгалінаваньне ад традыцыйнага альфабэту польскай мовы, якая выцесьніла нашую з нашай дзяржавы, а зь ёю і нашую кірыліцу; калі ў 1696 беларуская мова была ператвораная зь дзяржаўнай мовы ў крэсовы дыялект, а польская — з замежнай у літаратурна-афіцыйную. Дыялекты, як вядома, ня маюць сваёй пісьмовасьці, і прыкметай ператаварэньня нашай мовы ў крэсовы дыялект якраз была страта ёю афіцыйна-літаратурнага статусу і як наступства — асобнай, кірылічнай пісьмовасьці.

Лацінка — не самабытная, а крэсовая традыцыя. Самабытная — кірыліца, альфабэт вольнай Літвы, а ня Крэсаў. Гэтак лічыў і вядомы патрыёт-мовазнавец Ян Станкевіч (гл. «Гісторыя беларускага языка», Вільня, 1939). І лацінка — не прыкмета «эўрапейскасьці» (ці да 18 ст. на Беларусі панавала «азіяччына»?).

Зрэшты, калі даўнія традыцыі для кагосьць неістотныя, хай ён згадае, што менавіта яны былі падставай самаўсьведамленьня нашай нацыі і вытокамі Адраджэньня, я маю на ўвазе першы яго маніфэст — прадмову Багушэвіча да «Дудкі беларускай», дзе самабытнасьць беларусаў ён грунтаваў самабытнасьцю іх мовы, бо «чытаў старыя паперы» на гэтай мове.

Магчыма, ня ўсе згодзяцца з гэтымі камэнтарамі і прымуць такі погляд. Але, спадзяюся, іх зацікавіць заця б нескажоная гісторыя лацінкі на Беларусі, данесьці якую лічу сваім патрыятычным абавязкам.

Віталь Станішэўскі

ПОШТА «ШУФЛЯДЫ»

Узнагароды для «лясных братоў»

Як падала газэта «Навіны» (№ 54, 26.5.1998), прэзыдэнт Літвы Валдас Адамкус нядаўна ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды некалькім удзельнікам літоўскага антысавецкага Супраціву 1944-1952 гадоў. Былі адзначаныя 6 удзельнікаў Супраціву, яшчэ 17 падпольшчыкаў і партызанаў узнагароджаныя пасьмяротна. Прэзыдэнт Літвы (сам, дарэчы, у мінулым «лясны брат») падзякаваў літоўскім партызанам — жывым і мёртвым, — за іх гераізм і ахвярнасьць у барацьбе з акупантамі. Гэтай жа тэме было прысьвечанае й адмысловае пасэджаньне Сэйму...

У Літве незалежная дзяржава ўшаноўвае сваіх герояў. Гэта як тэст на «нармальнасьць». Ці можа прэзыдэнт «незалежнай» Беларусі паўтарыць учынак свайго літоўскага калегі?!

А між іншым, можна яму дапамагчы ды скласьці сьпіс меркаваных кандыдатаў на ўзнагароды. З зразумелых прычынаў нельга пакуль называць прозьвішчы тых беларускіх «лясных братоў», якія яшчэ жывуць (а такія ёсьць!).

1. Вітушка Міхал
2. Родзька Усевалад
3. Перагуд Іван
4. Харэўскі Якуб
5. Філістовіч Янка
6. Раманчук Іван
7. Жыхар Аўген
8. Гелда Іван
9. Таўпека Язэп
10... многія чытачы газэты могуць папоўніць гэты далёка ня поўны сьпіс.

Успомнім усіх пайменна! Ушануем сваіх герояў!

Сяргей Ёрш

супраць квазібуржуазіі

стане гэтак запатрабавана. Носьбітамі чаго?

Дзьве заўвагі. Ёсьць яшчэ традыцыйна ігнараваная група (5-6% ад насельніцтва) жыхароў Берасьцейшчыны і Піншчыны, якія карыстаюцца ўкраінскай мовай або расейска-ўкраінскім суржыкам — патэнцыйныя кліенты расейскага нацыяналізму і расейскай культуры. Некаторыя сацыёлягі пнуцца даказаць, што белмоўныя ў масе сваёй больш рэакцыйныя за расейскамоўных і ўхваляюць аўтарытарных вартасьці, Лукашэнку і іншае. Здаецца, аднак жа, гэтыя сацыёлягі проста ня ўмеюць вызначыць, каго лічыць белмоўным і каго — сацыяльна значным. Зрэшты, гэта іх ідэйная аблуда.

Белмоўная меншасьць — усе яе групы — жыве па-ранейшаму ў сацыяльным і культурным прыгоне і, як напісаў Мікола Рабчук, «... незалежнасьць зьмяніла яе становішча не нашмат больш, чым незалежнасьць ЗША — становішча мясцовых нэграў ці індзейцаў». Апошнім часам яна сталася і зусім безабароннай, часам нават д'ябалізаванай.

Між тым белмоўныя ўсё яшчэ ўяўляюць сабой досыць вялікую групу, каб прэтэндаваць на роўнасьць з расейскамоўнымі як у грамадзянскіх, так і ў культурных правах (ужо ня кажучы пра гістарычныя і маральныя падставы для такой роўнасьці, а таксама пра тое, што беларуская культура абслугоўвае значна шырэйшыя групы насельніцтва, чым тыя 10% белмоўных ці нават пару дзясяткаў працэнтаў «дзекаючых» і «цекаючых», і таму дыскрымінацыя белмоўных рыкашэтам б'е й па расейскамоўных беларусах, бо эвалюцыя белкультуры наўпрост залежыць ад лёсу белмовы).

Можна доўга пералічаць, якіх магчымасьцяў беларусафоны пазбаўленыя: атрыманьня на сваёй мове вышэйшай а нават школьнай адукацыі, пазашкольных заняткаў для сваіх дзяцей, магчымасьці карыстацца мовай на вайсковай і дзяржаўнай службе, атрымліваць на ёй элемэнтарны набор інфармацыі і культурнай прадукцыі (глядзець тыя самыя кіна- і тэлефільмы), чуць яе ад расейскамоўных — ад выканкамаўскага чыноўніка да бібліятэкаркі... Гэта ня проста «паражэньне ў правах», гэта прыніжэньне. Усіх гэтых правоў, напрыклад, права на белмоўную вайсковую службу трэ' было б дамагацца — і праз суд, і кулакамі — але ж апошнія гады канчаткова паставілі дыскрымінаваную меншасьць у стан, калі дамагчыся нейкага толку можна адно тэрарызмам або ўхіленьнем (у нашым прыкладзе — пазьбягаючы службы ў войску).

Законна, што белмоўныя ў будучыні, дабіўшыся палітычнай улады, зноў, як на пачатку 90-х, паспрабуюць увесьці «дзяржаўную падтрымку» для белмовы і культуры (тое, што на Захадзе называецца пазытыўнай дыскрымінацыяй ці affirmative actions). Такія захады скіраваныя зусім не на замацаваньне верхнасьці настаўнікаў беларускай мовы над настаўнікамі расейскай (або, у ЗША, нэграў і індзейцаў над белымі), а на аднаўленьне рэальнай роўнасьці раней дыскрымінаваных групаў. Дарэчы, на Захадзе такую «пазытыўную дыскрымінацыю» прыдумалі зусім не нацыяналісты, а очань дажэ лібэралы, і падтрымка такой палітыкі з боку расейскамоўных ёсьць проста праверкай на гуманнасьць. Будзем спадзявацца, што нашы вельмі хітрыя расейскамоўныя інтэлігенцыя і палітыкі, навучаныя горкім досьведам лукашысцкага тупіка, ня будуць тады ў чарговы раз узьнімаць гвалт.

ІЗНОЎ, ПРАБАЧЦЕ, ПРА ЛУКАШЭНКУ

Найвялікшая памылка лічыць, што Лукашэнку прывялі да ўлады маргіналы, або сяляне, або нізкаадукаваны электарат, або што ён сам такі — самародак і самадзержац. Усё так, але, галоўнае, старая панская вярхушка савецкага грамадзтва, якая трохі не папусьціла ўладу з рук на пачатку 90-х, зноў бліскуча і цьвёрда авалодала сытуацыяй, знайшоўшы масам улюбёнага, харызматычнага правадыра. Лукашэнка — гэта як Напалеон III пасьля рэвалюцыі 1848 году ў Францыі. Панская група, якая навязвае рэшце грамадзтва свае правілы гульні, вартасьці і прынцыпы — гэта сёньня досыць шырокі слой дробнай і сярэдняй квазібуржуазіі: ад завуча школы Зоі Іванаўны да кагэбіста Сяргея Сяргеевіча, ад Станіслава Дамінікавіча, старшыні калгаса, да Рымы Іосіфаўны, загадчыцы крамы, і Ўрала Рамдраковіча, начальніка службы кантролю, — вайсковай і чыноўніцкай, гандлёвай і службісцкай. Гэта клясычная для мадэрнай эпохі пануючая група з размытымі межамі: яна неаднародная і нязамкнутая, адны пакідаюць яе, другія трапляюць. Пра яе можна сказаць, што «яе няма», што гэта сымулякр, што яна нябачная: яна існуе ў форме сыстэмы вартасьцяў і культурных кодаў, тканкі стасункаў. Унутры панскай групы ёсьць і супярэчнасьці, і апазыцыя. Толькі нават калі гэтая апазыцыя зьменіць калгаснага банапарта, як Т'ер зьмяніў Напалеона Малога, гэта нічога ня зьменіць. Белмоўным ня стане лягчэй. Галоўнае ж, у краіне ня будзе ажыцьцёўлена тых неабходных рэформаў, у выніку якіх у будучыні маглі б стварыцца эканамічныя і сацыяльныя перадумовы для скіданьня расейскага каляніяльнага ярма, дасягненьня рэальнай незалежнасьці і жорсткай, глыбокай эўрапеізацыі.

Сёньняшні апазыцыянэр-дэмакрат Б. гэтак жа пасядзе на расейскай нафтавай, газавай і транзытнай трубе, як сядзеў учарашні дыктатар А. Сёньняшняя панская група сталася галоўным тормазам разьвіцьця краіны. Квазібуржуазія — самы антыбеларускі слой, пранікненьне ў які заўжды абумоўлівалася дасканалым валоданьнем расейскай мовай і веданьнем апарату расейскае культуры. Гэтая кляса, якая раней верай і праўдай служыла каляніяльным уладам, а цяпер забясьпечвае функцыянаваньне квазідзяржавы, аджыла свой час і мусіць сысьці.

Пытаньне пра мову — гэта пытаньне пра ўладу. Сьцьвердзіўшы свае правы ўсюды ўжываць беларускую мову, белмоўныя сьцьвердзяць права на сваю долю ва ўсім, а калі спатрэбіцца краіне — дык і на панаваньне.

Квазібуржуазія ёсьць натуральным ворагам белмоўных, а яе ворагі — саюзнікамі. Змаганьне зь ёй — гэта падрыў і зьнішчэньне яе мяшчанскай сыстэмы вартасьцяў і дэмістыфікацыя культурных кодаў.

Гісторыя паўтараецца: як на пачатку стагодзьдзя сьвядомыя беларусы складаліся зь сялянаў, інтэлігенцыі і нешматлікіх пралетарыяў, так і белмоўныя цяпер. Цяжка паверыць, што квазібуржуазія, якая падхапіла традыцыі зрасейшчанай буржуазіі пачатку стагодзьдзя, раптам «беларусізуецца», і нічога страшнага, што яна не беларусізуецца. Яна так і так ужо аджывае: у любым разе яна, якая ўмее толькі слухацца загадаў праз каляніяльную ці якую іншую «вэртыкалі», няздольная весьці рэй у постіндустрыяльным, супэрінфармацыйным грамадзтве.

Заўважце, аднак, як частка беларускай інтэлігенцыі сёньня загразае ў буржуазных густах: у апошнія гады набралі сілы нэамяшчанскія плыні ў нашай культуры, нарцысічныя, манерныя і сытыя — дастаткова схадзіць на пінігінскі спэктакаль «Арт» або пачытаць, як Алесь Аркуш ходзіць «па Парыжу» ці Дранько-Майсюк Парыжам стамляецца. Заўважце таксама, што беларуская літаратура вельмі рэдка гаварыла ад імя сапраўднага работніка або жабрака, які корпаецца ў сьметніках палацаў на Плошчы Перамогі.

Сучасныя «элітарныя» пісьменьнікі і музыкі, бомонд і бонтон новай беларускай культуры, у сублімаванай форме паўтараюць шлях пакаленьняў беларусаў-беднякоў, зачараваных «сьціплым шармам квазібуржуазіі». Яны ліжуць ганкі, якія трэба трушчыць, і імкнуцца спадабацца тым, каго трэба шакаваць.

РАСЕЙСКАЯ=МЯШЧАНСКАЯ

Сам выбар беларускай мовы і беларускай культуры — ужо бунт супраць пануючых мяшчанскіх вартасьцяў. Расейская мова сёньня — гэта мяшчанская мова. Першасны, фундамэнтальны бунт можа і мусіць мець лягічны працяг. Картаген нашай мяшчанскай правінцыйнасьці павінен быць разбураны.

«Незалежніцкія» і «дэмакратычныя» прыярытэты расейскамоўных, пра якія трубяць сацыёлягі, часта ёсьць проста выбарам пратэсту і мрояй пра неакрэсьлены горад шчасьця (раней-раней ён называўся камунізмам, цяпер — незалежнасьцю і дэмакратыяй). Здаецца, большасьць зь іх, як бы пачула, што незалежнасьць — гэта калі ня будзе ні ОРТ, ні НТВ, дык і разьвіталася з усімі сваімі прыярытэтамі.

Ня тое зь белмоўнымі.

Наўрад ужо сёньняшняе іх пакаленьне зьдзейсьніць свае мары пра Аркадыю і сканструюе лепшую Беларусь. Гэта будзе пасьля. Наўрад ці так хутка «беларус» ператворыцца з паняцьця этнічнага ў паняцьце этычнае — «працуе як беларус», «шчыры як беларус», «надзейны як беларус». Наўрад ці мы хутка ўзьнясем прынцыпы салідарнасьці белмоўных аж да вынікненьня беларускай мафіі (свой за свайго; каму падабаецца таямнічасьць, няхай назаве яе масонствам). А што сёньняшняе?

Ці не заўважала публіка, што ў наш час рэдкі белмоўны гарадзкі жыхар абыходзіцца безь літаратурнага хобі. Культура, літаратура ў першую чаргу, зноў пачынае кампэнсаваць адсутнасьць дзяржавы, а Беларусь і беларускасьць у чарговы раз — ссыхацца да літаратуры. На жаль, зноў спраўджваецца стары і заганны народніцкі прынцып: «творачы літаратуру, мы творым бацькаўшчыну». (Хоць, кажуць, добрыя творы цяпер могуць зьявіцца толькі на платах, комінах і камэрных сьценах).


Захапленьне белмоўнай брацііі літаратурай азначае, што ўсе мы падсьвядома зразумелі сваё прызначэньне — пранесьці мову, захаваўшы і ўдасканаліўшы. Пачуцьце мовы сёньня — гэта пачуцьце Бога — пачуцьце сябе — пачуцьце сваёй мэты — пачуцьце сэнсу гэтага стагодзьдзя і тысячагодзьдзя.

Мы — носьбіты мовы, а ўсё астатняе — прыкладаецца, калі чалавек досыць разумны, каб стаць багатым. Клопат пра мову ня можа зводзіцца да літтворчасьці. Клопат пра мову — гэта клопат пра сябе. Каб удасканаліць мову, чалавек павінен самаўдасканаліцца, каб узбагаціць — абагаціцца, прычым пажадана і ў прамым сэнсе таксама. Маршрут вядомы: трэба спачатку ў дасканаласьці вывучыць мову, каб пасьля таксама вывучыць сябе, а пасьля — сьвет. Бліскуча авалодаць ёю, а пасьля сабою, каб кіраваць сьветам. Тады спраўдзіцца старая беларуская масонская казка пра Івана, удовінага сына.

Андрэй Каўчук

Таму, хто ў Вільні быў

З красавіка да сярэдзіны траўня ў Вільні, на Сьвятаянскай, у залі Саюзу мастакоў Літвы (Medaliu galerija), экспанавалася выстава трох студэнтаў Беларускай Акадэміі Мастацтваў: Віталя Трафімава, Дзяніса Сінюгіна і Дзяніса Раманоўскага. Яна мела назву «Таму, хто ў горадзе быў...» Гэтак юнакі перафразавалі цытату з Джона Кітса «таму, хто быў у горадзе ўвязьнёны...» Паводле іхнае канцэпцыі, гэтая выстава трох прысьвечаная ўсім, хто знаходзіцца ці хоць калі знаходзіўся ў горадзе. Калі зважаць на перафраз Кітса, дык атрымліваецца, што выстава прысьвечаная зьняволеным.



«Знаходзячыся ў горадзе, чалавек сутыкаецца з мурамі. Адныя іх абыходзяць і рухаюцца ўздоўж вуліцаў. Іншыя называюць муры роднымі і абагаўляюць іх. Некаторыя дранцьвеюць перад імі, назаўжды...

Але кожны пераўвасабляе прастору, у якой знаходзіцца, усё адно — ці то абмяжоўваючы гэта сваім уяўленьнем, ці то зьдзяйсьняючы нейкія мэтанакіраваныя дзеяньні. Сьляды гэтых пераўтварэньняў застаюцца ў архітэктуры, аздобе вуліцаў, на сьценах. Таму, кожнага разу сутыкаючыся са сьцяною, мы сутыкаемся са сваім адлюстраваньнем. І не істотна, у якім горадзе гэта адбываецца...» — гэтак лічыць аўтар канцэпцыі Дзяніс Раманоўскі.

Між тым, у сваіх пастэлях Раманоўскі выявіў не абстрактныя краявіды, а пазнавальныя фрагмэнты менскае банальнасьці, на маргіналіях прыроды і урбаністыкі, ні натуры, ні культуры — яшчэ ня высьпелы плод цывілізацыі. Роўна ж як і плады мастацкай дзейнасьці Дзяніса Сінюгіна і Віталя Трафімава. Трафімаў даў магчымасьць віленчукам сузіраць менскія графіці, натуралістычна выкананыя ў сапраўдную велічыню, Сінюгін — аб'екты да фільму «Дарога дамоў», дзе зьмяшаліся розныя тэхнікі, жанры, нават літаратурныя. І тут любы глядач зразумее, дзе дом гэтага хлопца, куды ён гэтак імкнецца праз дарогі Нямеччыны, Чэхіі, Польшчы, якімі вачыма ён глядзіць на сьвет. Вачыма менчука.

Паасобку кожны з трох аўтараў прадэманстраваў бы толькі набор артыфактаў. Сабраная ў адно з фрагмэнтаў, элемэнтаў, шкіцоў, выстава прапануе акунуцца ў паток сьведамасьці маладых менчукоў. Таму істотна, дзе гэта было выраблена. Таму для віленчукоў гэта цікава. Бо ў Вільні мы сутыкнемся з зусім іншым, сваім адлюстраваньнем у краявідзе, на сьценах, у горадзе. І мы сустрэнемся ў Вільні па дарозе з дому дамоў...

Пасольства Літоўскай Рэспублікі ў Менску, якое наладзіла гэтую выставу, паабяцала дапамагаць беларускім студэнтам і надалей.

Сяргей Харэўскі


«Руіны — нябачная сьцежка да Гаспадыні Прыроды, — напісаў на пачатку 90-х беларускі філёзаф пасьля шпацыраў праз Верхні Горад у Траецкае і назад. — Руіны, заняпад, бяздомнасьць — непрамоўленая сутнасьць усякае спадчыны, ейны грунт і апірышча». Працяг гэтай думкі філёзафа я прыгадаў нядаўна, калі шыбаваў з прыяцелем праз Верхні Горад у музэй Максіма Багдановіча: «гэтую спадчыну» мы можам «толькі вытлумачыць».

Мы сьпяшаліся ў Траецкае, бо паспрачаліся наконт былога месца знаходжаньня Дамініканскага кляштару. Хацелі спраўдзіць на пано з старым Менскам, якое распачынае экспазыцыю музэю. Але тады быў панядзелак — выходны для ўсіх музэяў і рынкаў дзень...

***

Размовы аб тым, дзе стаяў і як выглядаў той ці іншы менскі будынак — тыповыя для сталіцы. Бадай, толькі цалкам зьнішчанае яшчэ на пачатку XIX стагодзьдзя Берасьце можа паспрачацца зь Менскам як з горадам-фантомам. Зладзіць высокага кшталту экскурсію па Менску магчыма толькі для людзей з моцным і тонкім уяўленьнем. «Плянэта Менск» назвала свой нарыс польская журналістка пасьля адной з такіх экскурсіяў. Апрача спрычыненьня да нябачных відавокі праяваў грамадзкага жыцьця, яна мела магчымасьць убачыць віртуальны Менск: «тут стаяў кляштар, там царква, за ёй палац, а замест вуліцы цякла рака з старымі кварталамі па берагох»...

Існуе такі вобраз — пустынная плянэта, па якой адно пясок перасоўваецца па засохлай гліне. З гэтага пяску лепяцца разнастайныя літары-назвы. Самыя розныя. Зь бегам часу плянэта скрозь пакрываецца такога кшталту манумэнтамі — цяпер можна праводзіць экскурсіі. Гэтак большая частка менскае прасторы ідэнтыфікуецца толькі дзякуючы надпісам на шыльдах гарадзкога транспарту. Сьцяры іх — і кварталы, і мікрараёны зьнікнуць з прасторы. Адзінае, што трывала мацуе



У кожнага горада, мне так здаецца, ёсьць свая каронная пара, свой матыў. Я маю на ўвазе месяц, час сутак і нават стан неба, пры якіх горад найбольш дакладна альбо выйгрышна паўстае перад тымі, хто жадае калі ня жыць і памерці тут, дык прынамсі пакінуць горад у сваёй памяці. У маёй асабістай калекцыі застануцца загульны студзеньскі вечар Масквы, прывідная шарая гадзіна верасьнёўскае Вільні, няўтульная кастрычніцкая ноч Петраграда ды п'янкі захад кастрычніцкага сонца ў Адэсе. І мне здаецца, я дакладна падгадаў свае зьяўленьні ў дадзеных месцах і часе, каб ужо ніколі не вяртацца ў тыя гарады. А калі й вяртацца, дык усё ў тыя ж дакладныя часы. Вызначаныя ня мной, а ўсё тымі паэтамі сваіх кварталаў, каб і я адчуў сябе масквічом, піцерцам ці адэсітам. Чые радкі й мэлёдыі ўжо даўно намалявалі майму ўяўленьню і «Москву златоглавую, звон колоколов», і «закутанный в дожди и холод фасад Петровского

Прэса за Бугам

З 11 па 14 траўня ў польскім мястэчку Казімеж Дольны прайшоў сэмінар для рэдактараў беларускіх культурніцкіх выданьняў, які наладзіла Фундацыя імя Стафана Баторыя. На ім прысутнічалі супрацоўнікі 11 выданьняў, у тым ліку і «Нашае Нівы».

...Што мусіць адчуць чалавек, калі апошняе, што ён пабачыў перад ад'ездам з роднага гораду — як трое маладых здаровых міліцыянтаў зьбіваюць старую? Зьбіваюць за тое, што яна спрабуе зарабіць хоць якую капейку на семках.

Цягнік на Варшаву крануўся, а ў мяне ў вушах яшчэ зьвінеў вусьцішны крык кабеты: «Людзі, дапамажыце!..».

Ня менш недарэчнае здарэньне адбылося на мяжы, калі беларускія памежнікі паставілі перада мною дылему: альбо ў мяне канфіскоўваюць «Нашу Ніву» і я зьнішчаю паштоўку Артура Клінава «З Новым годам!», альбо мне давядзецца выйсьці зь цягніка і йсьці ў пастарунак. Ня надта цямячы што да чаго старэнькі польскі ксёндз, сусед па купэ, спуджна лыпаў вачыма... Калі б гэта было летась і для ўезду ў Польшчу патрабаваўся б адзін толькі ваўчар, можна было б паспрачацца. Але я змарнаваў грошы і два дні для афармленьня падарожных дакумэнтаў... Пагатоў, неба зьбіралася на дождж. Спрачацца не было жаданьня... Выехаў.

...Люблiншчына. Надвісьлянскія разлогі. Мініятурнае мястэчка між горных лагчынаў. Казімеж Дольны. Гэтае мястэчка славутае сваім унікальным архітэктурным ансамблем, які склаўся ў 16 стагодзьдзі і ляндшафтам, дзеля захаваньня якога створаны адмыслова нацыянальны парк. Тры тысячы жыхароў. Тры кропкі продажу прэсы... Першае, што мне кінулася ў вочы, гэта мноства культурніцкіх выданьняў. Прычым не ў закутках, дзе нічога не разглядзець, як у Менску, а менавіта перад самымі вачыма пакупнікоў, наперадзе ўсяе астатняе паліграфічнае навалы, якая апошнія гады залівае Польшчу.

Чаму мы можам навучыцца ў Польшчы? Досьвед нашых суседзяў сьведчыць, што культура, у тым ліку й культурніцкая прэса, ва ўмовах лібэральнага ладу, ня толькі не «пасуе» перад «рынкам», але й наадварот, імкліва разьвіваецца, з годнасьцю несучы свае фундамэнтальныя каштоўнасьці... У гэтым сэнсе досьвед Польшчы, якая далей прайшла гэты шлях, найбольш паказальны. Вядома, польскі досьвед нялёгка стасаваць да нашых умоваў, ня тыя маштабы, ня гэткая дзяржаўная традыцыя, урэшце, ніколі палякі не выракаліся сваёй мовы. Але ж для нас гэта яшчэ адзін спосаб зазірнуць у заўтра.

Апроч грунтоўных бізнэс-курсаў, якія доўжыліся штодзень па 12 гадзінаў, нам давялося (у якасьці жывога прыкладу) пагутарыць з галоўным рэдактарам часопіса «Kresy». Гэта тоўсты (як два нашых «Полымя») часопіс маладых літаратараў Люблiншчыны, які, між тым, імкнецца весьці агульнапольскі дыялёг. Умоўна кажучы, гэта тая нэўтральная тэрыторыя, дзе амаль усе, якія ёсьць, літаратары Польшчы могуць стасавацца між сабою без публіцыстычных спрашчэньняў, безь якіх, нажаль, мы ня можам сабе сёньня ўявіць беларускай культуры. Больш таго, у абсяг тэмаў гэтага часопіса трапляе і найноўшае мастацтва, і архітэктурная крытыка, і тэалёгія. Сваю «крэсовасьць» гэты люблінскі квартальнік бачыць як абавязак знаёміць польскага чытача зь літаратурамі ўсходніх суседзяў, перадусім з украінскай. Сёньня «Kresy» можна набыць па ўсёй Польшчы, а рэдакцыйныя тэчкі шчыльна ўпакаваныя новымі матэрыяламі далёка наперад. У Казімежы Дольным, дарэчы, яны маюць восем падпішчыкаў. На тры тысячы чалавек...

Панятак «правінцыйнасьці» культурнае прэсы ў Польшчы, за апошнія дзесяць гадоў сьцёрты. Мяне, да прыкладу, ўразіў часопіс «Format» з Вроцлава, які прысьвечаны розным галінам выяўленчага мастацтва й культуры. Як і належа часопісу пра мастацтва, у ім выключнае месца займаюць ілюстрацыі. У кожным нумары блізу 250 здымкаў, палова зь якіх каляровыя. Уявіць сабе што-небудзь падобнае ў Беларусі я ня здолеў. Ня менш цікавы часопіс, як на маю думку, дык абавязковы для тых, хто цікавіцца авангардным мастацтвам, «Magazyn sztuki», выдаецца ў Гданьску. Амбіцыі гэтага выданьня сягаюць вельмі далёка — яны спрабуюць ахапіць аналітыкай усё сусьветнае мастацтва, ад інсталяцыяў і відэа да віртуальных кінэтычных твораў. Гданьскі «Magazyn sztuki» друкуе тэксты паралельна

У МУЗЭІ РУІНАЎ

Менск у прасторы й часе — Галоўны Праспэкт, які расьсякае карункі нашых ледзь прыкметных «сьцяжынак да спадчыны».

Мы марылі й марым аб НОВЫМ Менску, аб САПРАЎДНАЙ сталіцы. Аб утульным Старым Горадзе, акоЛеным мадэрновымі кшталтамі арыгінальнае вытворчасьці. Але наколькі рэальна мянчук можа ўявіць сваё жыцьцё ў РОДНЫМ горадзе без Галоўнага Праспэкту?

Гадоў дзесяць таму я ўяўляў, як Праспэкт ляжа абломкамі — пасьля пераможных баёў «нашых» з «саветамі», і, абапіраючыся на нешматлікія старажытныя камяніцы, якія засталіся ў спадчыну, мы адбудуем НАШ горад. Руіны — сутнасьць усякае спадчыны: прыкмета сапраўднасьці. Усьцешна, што Галоўны Праспэкт можа ператварыцца ў НАШУ спадчыну толькі ў выглядзе занядбаных, паточаных шматлікімі стагодзьдзямі руінаў...

***

... У панядзелак 21 траўня мы з прыяцелем апынуліся першымі наведнікамі музэю Максіма Багдановіча. Высьветлілася, што наша цікавасьць да старога Менску актывізавалася ў сусьветны Дзень музэяў. Ці варта казаць, што гэтая інфармацыя паўплывала на наш далейшы маршрут па горадзе.

На Камуністычнай, падчас агляду падарункаў «таварышу Сталіну ад беларускага народу» ў дамку РСДРП, я раскрыў кнігу «ганаровых гасьцей». Даглядчыца пачала сараміліва тлумачыць, што пішуць у кнігу «розныя людзі». Я зразумеў, што мы абралі правільны накірунак для экскурсіі. Мне падалося, што ў апошнія часы дамок наведвалі людзі, якія перад тым пабывалі ў Музэі Багдановіча. Кніга стракацела ад эмацыйных надпісаў зь «ь» і «ў» у словах, аздобленых тлустымі клічнікамі.

Плянэта Менск... Даведаўшыся, што адзін з нас не мянчук, даглядчыца патлумачыла, што дамок стаіць не на сваім месцы, бо у свой час замінаў будоўлі Праспэкту. Мы выйшлі з дамка, крыху пакрыўдзіўшы супрацоўніцу, бо не пакінулі аўтографаў, хай сабе зь «ь» і «ў», і крочылі да канцавога пункту накрэсьленага маршруту.

Менск — горад... чаго? Прынамсі, не музэяў. Але, ня гледзячы на больш-менш шырокі выбар, мы скіраваліся да былога Дому літаратараў...

***

Сымбаль, які існуе асобна ад сваіх рэчаў. Ім можа быць бюст Леніна на станцыі «Пляц Незалежнасьці», можа быць Дом літаратараў безь літаратараў, можа быць надмагільле без магілы, альбо наадварот. Але ж «гісторыя існуе адно ў нашай сьвядомасьці». Гэтак, калі сымбалі невядомыя, яны маўчаць, пакуль ты не захочаш адшукаць (ці прыдумаць) іхнае значэньне.

Аб чым у чужой краіне кажуць нам помнікі невядомым людзям і падзеям? Экскурсавод можа распавядаць любую гісторыю, нават, выдумляць штораз нову. Ён ня ў стане зьмяніць аднаго — карцінку. Таму сапраўдны палёт творчасьці экскурсавода магчымы, калі ён распавядае аб нябачных воку рэчах. Што да мяне, калі ў наступны раз мне давядзецца паказваць Менск іншаземцу, я правяду яго праз Верхні Горад, Траецкае, дамок РСДРП, а скончу перад польскай амбасадай, стоячы тварам да «Літаратараў». Увесь час буду распавядаць яму толькі адну гісторыю — пра... Янку Купалу.

***

... Наш далейшы шлях ад дому І-га зьезду РСДРП ляжаў у кірунку былога будынку СП, дзе можна падзівіцца на невялікую экспазыцыю беспрытульных (пакуль?) бюстаў і помнікаў вядомых дзячоў беларускае культуры. Перасекшы Праспэкт, мы ўвайшлі ў двары, і пайшлі невялікай сьцежкай, якая зразае кут паміж Захарава і Румянцава, мінае невялікі закінуты дом, што стаіць неўпрыкмет пасярод невялікага садка, і выводзіць акурат да польскае амбасады. Вядома, гэтую сьцяжынку мы абралі не выпадкова ...

***

Прасторы, якія мы адкрываем — гэта прасторы, якія мы перш-наперш ствараем. Бо, пакуль яны не зафіксаваныя позіркам, для нас яны не існуюць.

Пасьля свайго «Вытлумачэньня руінаў» вядомы беларускі філёзаф зрабіў кароткае вытлумачэньне Менску, як прасторы, што складаецца зь безьлічы пярэстых і недастасоўных адна да адной субпрастораў. Нібы з гармідару расцярушаных пчаліных аскепкаў-сотаў. Ідучы з прыяцелем у сусьветны Дзень музэяў непрыкметнай сьцежкай, мы ведалі ракурс, у якім зьменіцца кавалак менскай прасторы ў адным з пунктаў нашага маршруту. Ля агароджы, акурат побач з выйсьцем з закінутага садка на вуліцу, прыхаваны ценем куста і прысыпаны рознакалібровым сьмецьцем, ляжаў гранітны куб. На ім мы прачыталі прыцёртыя літары: «Янка Купала. 1882-1942. Народны паэт Беларусі»...

Перад тым, як патрапіць у засьмечаныя кусты на вуліцы Румянцава, камень стаяў на магіле Янкі Купалы з моманту перазахаваньня паэта і да 1971. Тады ён быў заменены бюстам працы скульптара Х.

Вось і ўся гісторыя. Ці варта ісьці далей — да Дому-помніка Саюзу беларускіх пісьменьнікаў?

Гэтае пытаньне з разраду чыстае філязофіі, кшталту канцэптуальнай спрэчкі аб тым, ці варта аднаўляць руіны. Выбірайце любы — аднаўляць (псаваць натуральнасьць), кансэрваваць (праяўляць бязвольле, ці, шчэ горш, нэкрафілію), пакідаць, як ёсьць (кшталтаваць натуральнасьць — «назад да будучыні!»).

***

... Руіны — непрамоўленая сутнасьць усякае спадчыны. Мы спрабуем вытлумачыць нашую спадчыну, ствараем еёныя вобразы, увасабляем у канкрэтныя формы. Мы ствараем музэі, узводзім манумэнты і помнікі. Нібы спрабуем даць новае жыцьцё сутнасьцям, убачаным у руінах.

Калі я гляджу на некаторыя выявы (помнікі?) асобаў беларускае гісторыі, мне падаецца, што матэрыял для іх выкалупваўся з адной зь сьценаў менскага Галоўнага Праспэкту. Што зь імі рабіць? Дакладней, што рабіць з Праспэктам, які ня кінеш у кусты. Нават разбураны, ён застанецца жыць у выявах, створаных зь ягонае «плоці».

Ня так даўна адзін саматужны культуроляг прапанваў вырашыць «віленскае пытаньне» — перайменаваць Менск у «Вільню». Магчыма, праблему Менску зь ягоным «Праспэктам-бэлькай для ўсёй канструкцыі сталіцы» можна вырашыць больш плёна. Трэба па-просту адбудаваць Вільню цалкам. А яшчэ лепей стварыць новую сталіцу, у якой сабраць адбудаваныя копіі ўсіх зьніклых архітэктурных каштоўнасьцяў. І тады Менск ператворыцца ў Горад-помнік.

Вырашыцца «менскае пытаньне», а разам зь ім праблема «канцавога пункту», безь якога любая экскурсія па горадзе робіцца падобнай да шпацыру па глінянай плянэце.

Севярын Квяткоўскі

НОТА «МЕ»

дворца», і «фонари, что за Пересыпью светятся», і, вядома, «паветра, напоенае цiхім гусьцеючым мрокам».

Ужо які месяц я жыву ў горадзе Менску. Але назваць сябе менчуком мне не паварочваецца язык. Называцца ж мінчанінам не паварочваецца нутро. Я не без хваляваньня толькі зараз пачынаю ўваходзіць у горад, які нанова, у які ўжо раз засяляецца менчукамі — пэрсанажамі новае беларускае літаратуры — Глёбуса, Дынько, Севярынца. Жывымі жыхарамі сваёй сталіцы, не абавязкова героямі вулічных баталіяў, але цалкам пазбаўленых якіх бы там ні было прыкметаў савецкасьці. Іхная прысутнасьць ня толькі на старонках новае літаратуры, але ў рэальным жыцьці ўсё больш заўважная. Пра што і на якой мове яны б ні гаварылі, я ведаю што слова «мінск» у іхных размовах не прамільгне. І справа тут ня ў выбары на карысьць моднай літары, а ў выбары свайго места й ладу жыцьця. Не жывецца ім у Мінску, і я разумею чаму.

Горад Мінск усё болей становіцца прыдуманым і несапраўдным. Вялізным але ня надта цікавым музэем побыту савецкага чалавека ў пэрыяд піку ягонага разьвіцьця з жывымі, але ад гэтага ня больш цікавымі, экспанатамі, сваімі жыхарамі — мінчанамі ды іхнымі достопримечательностями. Усяго, ад чаго цягне апрануць белую кашулю, ды мармычучы сабе пад нос «все стало вокруг голубым и зелёным» ці «цвети мой Минск под небом журавлиным» (адзіным, што мне прыгадваецца пра мінск) фляніраваць ад Доміка І зьезду да помніка Марату Казею. Але падман будзе цягнуцца нядоўга. Па тых маршрутах любімыя героі не хадзілі й наўрад ці пройдуць. А ў домік той я сам нядаўна зайшоў, і мне там спадабалася. Утульны менскі дамок, дзе сабраліся мілыя жыдоўскія людзі пагаманіць пра палітыку, і якія ўявіць не маглі, якія краявіды паўстануць за вокнамі праз колькі гадоў пасьля іхных пасядзелак за гарбатаю. Ды ўсё роўна ў горадзе, які на ўсіх мапах пазначаны як «Мінск», нават ля манумэнта Победы, гэтага сымбаля сталіцы БССР паветра ўсё роўна застаецца менскім. Насычанае воляю й жаданьнем жыць ствараючы. Калі-небудзь гэтае паветра набудзе моц шквальнага ветру й зьнясе бэтон вуліцы, што сёньня мае нахабства звацца Нямігаю, адновіць Верхні горад і замчышча, і на колішніх мінскіх вуліцах паставіць іншыя помнікі. Ці будзе каму тады ліць сьлёзы па зьніклым Мінску? Не ўяўляю.

Сёньня ў горадзе Менску выходзяць ажно дзьве газэты («Наша Ніва» й «Навінкі»), пішуцца наіўныя вершы й высокаклясныя эсэ, сьпяваюцца мацерныя прыпеўкі й рокавыя баляды, а галоўнае будуюцца самыя фантастычныя пляны на будучыню. У Мінску адбываецца ўсё астатняе — прэм'еры, матчы, гастролі, сэлектарныя нарады ды McDonald's'ы. І я бязь лішніх развагаў гатовы ахвяраваць гэтым усім астатнім дзеля таго, каб пакінуць сабе шанец калі-небудзь далучыцца да кагорты менчукоў. У Менску сёньня цікавей і цяплей, ня кажучы ўжо пра заўтра. Таму мне няма патрэбы мяняць час і месца свайго быцьця. У пошуках чыста менскага матыву.


Зьміцер Бартосік

па-польску й па-ангельску. Ці ня дзякуючы гэтаму, палова ягоных падпісчыкаў па-за Польшчаю.

Сёньня ў Польшчы выходзіць каля дзьвюх соцень выданьняў, прысьвечаных усім аспэктам культуры. Яны выдаюцца ў 44 гарадах і мястэчках. Палова зь іх мае агульнанацыянальную аўдыторыю. Гледзячы на паўдзясятка выданьняў па архітэктуры, я толькі ўздыхнуў, прыгадаўшы, што ў Беларусі няма ўжо ніводнага.

Адкуль бяруць грошы палякі, якія выдаюць сёньня культурную прэсу? Адусюль! Ад магістратаў, як люблінскія «Kresy» ці пазнаньнскі «Czas», ад заможных эмігрантаў, як «Kultura», ад каталіцкага клеру, як «Więź», ці «Znak». Ад замежных і айчынных спонсараў, ад грамадзкіх і палітычных арганізацыяў. Але найперш, кожнае выданьне зарабляе само па сабе. Стратныя выданьні не ўратуюць аніякія пэрманэнтныя датацыі. Шкода, калі зьнікае цікавае й важнае выданьне з-за браку сродкаў, як напрыклад вядомыя «Ex Libris» і кракаўскі «NaGlos». Але пры тым, краявід польскай культурнай прэсы не бяднее, адбываецца перацяканьне інтэлекту ў выданьні, дзе ёсьць больш спрытныя дырэктары й мэнэджары. Якія дадуць інтэлектуалам жыць лепей. Польскія калегі сьцьвярджаюць, што фінансавы прарыў яны адчулі толькі пасьля таго, як адмовіліся ад паслугаў дзяржаўнае пошты і самі пачалі афармляць падпісчыкаў. Манаполія была зламаная. Сёньня культурныя выданьні Польшчы жывуць найперш за кошт таго дадатковага прадукту, які можна стварыць у рэдакцыі — розныя віды паліграфічных паслугаў, рэкляма, фінансавыя апэрацыі, і, вядома, выраб кніг. Часопіс «Kultura», што выдаецца ў Парыжы, выдаў на сёньня ўжо больш як паўтысячы кніг. Дзясяткі, сотні кніг выдалі і іншыя часопісы і газэты. Гэтак званы «рынак» ўратаваў польскую культуру, зрабіў яе неабходнай і даступнай таварам. Як дарэчы і маленькае мястэчка Казімеж Дольны, у якім усю ноч гараць агні, асьвятляючы шэдэўры правінцыйнага рэнэсансу. Гатэлі, кавярні, рэстараны адчыненыя для 2 мільёнаў турыстаў, якія прыяжджаюць сюды штогод. На тры тысячы жыхароў...





Сяргей Харэўскі

Здымкі Дзяніса Раманюка

Шмат гісторыяў

Апошнім часам гістарычныя веды і гістарычныя вобразы зноў сталі ў Беларусі сфэраю пільнай ідэалягічнай увагі. Прыклады зь нядаўняе гісторыі ўвесь час прыводзяцца прадстаўнікамі кіруючага рэжыму; спасылкі на гісторыю пастаянна гучаць з боку апазыцыі. Апалягетыка часам замяняе гістарыяграфію ўвогуле.

Улады актыўна праводзяць палітыку зьнешняй рэсаветызацыі — аднаўляецца савецкая сымболіка, патэрналісцкая рыторыка, інстытуты і формы грамадзкіх паводзінаў савецкага пэрыяду: суботнікі, дружыньнікі, камсамол.... Утвораныя інстытуцыі толькі зьнешне нагадваюць зьявы папярэдняе эпохі, але ўся падобная дзейнасьць адбываецца пад лёзунгамі вяртаньня ў «страчаны рай».

Адначасова праводзіцца жорсткая цэнзурная палітыка — цалкам зьмененае кіраўніцтва выдавецтва «Беларуская Энцыкляпэдыя» і ўжо з падрыхтаваных тамоў «Гістарычнай энцыкляпэдыі Беларусі» вымаюцца цэлыя артыкулы, якія не зусім адпавядаюць ідэалягічным установўкам сёньняшняе ўлады; ствараюцца перашкоды выхаду гістарычна-папулярных твораў, створаных незалежнымі ад дзяржавы аўтарамі (прыклад — забарона друку кнігі Ўладзімера Арлова «Адкуль наш род»); некаторыя гістарычныя працы выходзяць у сьвет толькі пасьля таго, як адтуль пад прымусам выкідваюцца цэлыя разьдзелы (прыклад — кніга амэрыканскага прафэсара Яна Запрудніка «Беларусь на гістарычных скрыжаваньнях»).

Новая генэрацыя Беларусі, якая падрастае, ня мае досьведу таталітарызму, але ўжо сутыкнулася з новым аўтарытарызмам. Гэтая генэрацыя цяпер адчувае на сабе імкненьне да яе ідэалягічнай апрацоўкі. І адначасова, гэтая генэрацыя не заўжды мае ўласныя погляды на гістарычныя і палітычныя падзеі. Такая сытуацыя стварае магчымасьці для маніпуляцыяў над грамадзкаю думкаю з боку розных палітычных сілаў. Дэфіцыт уласнага погляду — вось праблема сучаснай Беларусі.

Таму як адзін з варыянтаў актывізацыі грамадзкае творчасьці мы фармулюем праекты шырокіх конкурсаў для школьнікаў на тэмы блізкае гісторыі. Абуджэньне інтарэсу да дасьледчых прыёмаў будзе спрыяць паступовым зьменам у беларускім грамадзтве ў кірунку ўмацаваньня каштоўнасьці асабістых свабодаў. Пры ўсім тым, нашыя конкурсы - гэта непалітычны праект, а дзейнасьць, скіраваная на ўзьнікненьне грамадзкае самарэфлексіі ў Беларусі.

Распачынаючы гэтак новыя для сябе праекты і формы дзейнасьці мы паслугоўваліся вельмі важнымі працэдурамі мысьленьня — сумневам і даверам, бо мы верым у адказнасьць удзельнікаў праекту і іхнюю здольнасьць зрабіць свой выбар. Тут важнае ўзьнікненьне самой сытуацыі прадумваньня і значыць — выбару. Конкурсы на тэму блізкае гісторыі — гэта сьвядомая адмова ад Мэтагісторыі і прызнаньне таго, што гісторыяў можа быць некалькі. Мы верым у разнастайнасьць нашага грамадзтва, бо рэаліяй ёсьць беларуская гісторыі, да нядаўніх падзеяў якой мы прапануем зьвярнуцца. Таму мы не зьбіраемся навязваць якія-небудзь стэрэатыпы — ня будзем агітаваць супраць савецкага бачаньня гісторыі, ня будзем абмяжоўваць самавыяўленьне нацыянальнымі канцэпцыямі. У пэўным сэнсе наш конкурс — сацыялягічны экспэрымэнт на тэму разуменьня блізкае гісторыі Беларусі.

Алег Дзярновіч

Паўсядзённае

Гэты тэкст ня ёсьць рэцэптам посьпеху. Ён утрымлівае толькі парады, інфармацыю ды перасьцярогі, якія будуць патрэбныя для самастойнай працы дасьледчага характару. Гэты тэкст для тых, хто гатовы займацца гісторыяй досыць нетыповым спосабам.

Гісторыя, да дасьледаваньня якой мы запрашаем — гэта гісторыя блізкага навакольля: сваякоў, вёскі, школы, вуліцы, помніка, групы знаёмых, грамадзкай арганізацыі, незвычайнага (а можа быць, менавіта звычайнага) чалавека з суседзяў... Гэтая гісторыя жыве ў памяці даступных Табе сьведкаў, хаваецца ў дасягальных для Цябе дакумэнтах і фотаздымках. Гэтая гісторыя затрымалася ў мурох дамоў, даступных месцах, а таксама ў мэнтальнасьці, навыках і досьведзе людзей. Сьляды тае гісторыі мы знаходзім і ў сёньняшнім дні. Жыцьцё ў нашых гарадах, мястэчках і вёсках; жыцьцё нашых бацькоў і бацькоў нашых бацькоў, іх стаўленьне да працы, да ўладаў, пабытовыя праблемы і асабістыя посьпехі — вось, што мы назавем паўсядзённым жыцьцём і што стане тэмай нашага Конкурсу.

Для Беларусі пэрыяд 1945-1965 гадоў быў насычаны жорсткімі падзеямі і спадзяваньнямі на лепшае; у гэтым пэрыядзе знайшлося месца для жаданьня свабоды. Час пасьля заканчэньня Другой сусьветнай вайны Беларусь зьмяшчае ў сабе спробы цывільных жыхароў аднавіць мірнае жыцьцё, але таксама сталінізм і нематываваны тэрор. Для Заходняй Беларусі паваенны пэрыяд характарызуецца масавай саветызацыяй і прымусовай калектывізацыяй. Да пачатку 50-х гадоў працягваўся антысавецкі Супраціў, а другая палова 50-х — сярэдзіна 60-х былі адзначаныя палітычнай Адлігай, калі тысячы палітвязьняў вярнуліся з ГУЛАГу. 1965 — гэта год зьмены кіраўніцтва ў БССР, калі замест Кірыла Мазурава 1-м сакратаром ЦК КПБ быў прызначаны Пётар Машэраў. Гады кіраўніцтва апошняга — з 1965 па 1980, зь іх масавай індустрыялізацыяй і канчатковай ліквідацыяй беларускіх школак у горадзе, складаюць асобны пэрыяд у Найноўшай гісторыі Беларусі.

Вось чаму для пачатку нашых конкурсаў для школьнікаў мы абралі асобны і кампактны пэрыяд з 1945 па 1965 гады.

Для нашага конкурсу таксама важна разуменьне таго, што розныя людзі могуць вельмі па-рознаму ўспрымаць гісторыю. У падручніках гістарычныя падзеі найчасьцей падаюцца ў іх "значных" пунктах і "вялікіх" датах. Затое вельмі рэдка можна пабачыць як гісторыя ўплывае на жыцьцё звычайных людзей. Таму мы прапануем удзельнікам Конкурсу самім для сябе адкрыць атмасфэру тых гадоў і паказаць розныя аспэкты тагачаснага жыцьця.

Удзел у Конкурсе патрабуе збору інфармацыі і дакумэнтаў, ацэнкі іх імавернасьці (праўдзівасьці) — таксама праз параўнаньне іх зь іншымі крыніцамі. На падставе гэтых параўнаньняў трэба рабіць самастойныя высновы. Апроч таго, ад удзельнікаў патрабуецца цікавае прадстаўленьне вынікаў сваіх досьледаў.

Запрашаем да прыгодаў у блізкай Гісторыі.

ПОШУК КРЫНІЦАЎ — ПОШУК ТЭМЫ

Чым бліжэй да нас гісторыя, тым складаней скласьці пра яе неэмацыйнае ўяўленьне. Але ж Ты мусіш зьвярнуцца непасрэдна да крыніцаў, а цікавіць Цябе могуць ня толькі крызысы і пераломы.

Пра гісторыю, да спазнаньня якой мы запрашаем, немагчыма знайсьці штонебудзь у падручніках. А ў нашай гістарыяграфіі практычна няма кніжак на гэты тэмат. Таму, адкрываючы для сябе блізкую гісторыю, Ты мусіш зьвяртацца да арыгінальных крыніцаў.

Памятай: **крыніцай можа быць усё, што ёсьць сьледам дзейнасьці чалавека ў мінулым і што можа служыць для спазнаньня гэтага мінулага**; колькасьць і ўсе віды крыніцаў назваць не магчыма. Крыніцы падаюць інфармацыю непасрэдна альбо гэтак, што яе трэба вычытваць паміж радкамі. Важна не ўпусьціць патрэбныя для цябе крыніцы — дакумэнты, фотаздымкі, дзёньнікі, мэмуары, лісты альбо рэчы штодзённага ўжытку. Але ёсьць яшчэ адзін від крыніцаў, які ты можаш сам ажывіць — гэта чалавечая памяць.

Ты мусіш адрозьніваць крыніцу ад дасьледаваньня, зробленага на яе падставе. Такое дасьледаваньне нясе ў сабе меркаваньні, інтэрпрэтацыі дасьледчыка. **Ты** сам выканаеш **потым** такую працу над крыніцамі.

Надрукаваныя дасьледаваньні — манаграфіі, падручнікі і г.д., — могуць Табе дапамагчы пры падрыхтоўцы, пры фармуляваньні пытаньняў, акрэсьленьня кірунку працы альбо праверцы праўдзівасьці зьвестак. Але гэтыя кніжкі не павінны быць прадметам дасьледаваньня "самі ў сабе". Няма нічога больш бясплённага, чым проста перапісваньне і злучэньне фактаў, узятых з чужых кніжак.

Не імкніся ахапіць вялікія тэмы ці доўгія гістарычныя пэрыяды. Калі паспрабуеш вывучыць "культурную сытуацыю" ці "гісторыю горада", то Ты сам прымусіш сябе да перапісваньня. Пэрыпэтыі тэатральнага калектыву ці здарэньне ў тваім горадзе на працягу абранага (няхай кароткага) пэрыяду, паказаныя дзякуючы вялікай колькасьці крыніцаў (напрыклад, праз розныя дакумэнты і ўспаміны) маюць большыя шанцы стаць аўтэнтычным, цікавым адкрыцьцём ды распавесьці нешта важнае пра эпоху.

З другога боку — калі, раптам, Ты знойдзеш асобнага надзвычай цікавага чалавека і прымусіш яго па-просту распавядаць пра 20 гадоў ягонага жыцьця, а Ты потым толькі перанясеш гэтыя ўспаміны з касэты на паперу, то гісторыя, хутчэй за ўсё, не адкрые Табе свайго сапраўднага аблічча.

Распачынай заўжды з дэталяў.

РЭГЛЯМЭНТ КОНКУРСУ

1. Тэма:

"Паўсядзённае жыцьцё ў Беларусі: 1945-1965".

2. Каму адрасуецца:

Конкурс скіраваны да навучэнцаў сярэдніх школаў і іншых сярэдніх навучальных установаў. Узяць удзел у конкурсе могуць вучні, пачынаючы ад 7 клясы (уключна). Важна тое, каб на момант абвяшчэньня Конкурсу ягоны ўдзельнік быў школьнікам.

3. Тэрмін:

1. Конкурс абвешчаны ў пачатку мая 1998 году. Адсутнасьць папярэдняга інфармаваньня (да 15 лістапада 1998) не пазбаўляе магчымасьці ўдзелу ў конкурсе.
2. Працы павінны быць дасланыя да 15 лістапада 1998 (вызначаюцца паводле даты на паштовым штэмпэлі) на адрас: а/с 71 Менск 220123 (Конкурс).
3. 15 сьнежня 1998 будуць абвешчаныя вынікі конкурсу.

4. Прынцыпы падрыхтоўкі конкурснай працы:

1. Конкурсная праца можа быць падрыхтаваная вучнямі індывідуальна альбо групай, пад апекай альбо самастойна.
2. Апекуном працы можа быць нехта з бацькоў, настаўнік, бібліятэкар... — чалавек, зацікаўлены ў дапамозе ўдзельніку Конкурсу. Апякун можа дапамагаць у пошуку тэмы працы, крыніцаў, формы працы, але ня можа сам выконваць гэтую працу замест удзельніка Конкурсу.
3. Праца павінна мець творчы характар — яна ня можа быць проста капіяваньнем альбо кампіляцыяй ужо вядомых крыніцаў і дасьледаваньняў.
4. Конкурсная праца павінна мець тытул (назву).
5. Праца падаецца на беларускай мове — правапіс можа быць як "тарашкевіцай", так і "наркомаўкай" (прынятая ў школах норма). Тэксты крыніцаў (дакумэнтаў, успамінаў) могуць перадавацца ў арыгінале. Калі робіцца іх пераклад, то гэта трэба зазначыць асобна.
6. Конкурсная праца можа выглядаць як:
   a) апрацаваньне сабраных гістарычных крыніцаў ці сьведчаньняў з камэнтарамі да іх;
   b) уласны дасьледчы тэкст з далучэньнем да яго гістарычных крыніцаў (крыніцы).
7. Форма конкурснай працы можа быць адвольнаю. У выпадку нятэкставых формаў (напрыклад — аўдыё, відэа, фотаздымкі) да працы павінна быць далучаная пісьмовая частка, якая адлюстроўвае працэс дасьледаваньня і збору інфармацыі, альбо камэнтар да гістарычнай крыніцы.
8. Конкурсную працу трэба даслаць у адным асобніку.
9. Да працы павінна быць далучаная *Мэтрычка*, фармуляр якой вызначаны Радай Конкурсу.

5. Узнагароды:

1. Журы ўзнагарожвае ўдзельнікаў Конкурсу* — асобных вучняў альбо калектывы вучняў.
2. Журы можа адзначыць спэцыяльнымі ўзнагародамі апекуноў конкурсных працаў ці рэгіянальных каардынатараў Конкурсу.
3. Рашэньне Журы адносна разьмеркаваньня, памераў і формы ўзнагароджаньня не падлягае зьменам.

6. Прызначэньне конкурсных працаў:

Дасланыя працы будуць каталягізаваныя і заархіваваныя ў Архіве Найноўшае Гісторыі, дзе створаць асобны фонд. Конкурсныя працы ня будуць вяртацца аўтарам. Прадугледжваецца публікацыя найбольш цікавых працаў. Да абвяшчэньня вынікаў Конкурсу працы ці іх фрагмэнты ня могуць публікавацца. Права на першапублікацыю працаў, якія атрымалі на конкурсе ўзнагароды, мае Архіў Найноўшае Гісторыі.

* Галоўным прызам будзе мультымэдыйны кампутар, іншыя прызы ўдзельнікам Конкурсу — дыктафоны і фотаапараты. Усім актыўным удзельнікам Конкурсу будуць уручаныя камплекты гістарычнай літаратуры й падпіска на «Нашу Ніву».

Арганізатары конкурсу:
Архіў Найноўшае Гісторыі (створаны Беларускім Гуманітарным Фондам "Наша Ніва")
пры ўдзеле Таварыства Беларускай Мовы імя Францішка Скарыны
пры падтрымцы Фундацыі Стэфана Баторага
пры мэтадычнай дапамозе Цэнтру KARTA (Варшава)

Рада і Журы конкурсу:
Уладзімер Арлоў (літаратар)
Вацлаў Арэшка (гісторык культуры, Беларускі Гуманітарны Фонд "Наша Ніва")
Ігар Бабкоў (філёзаф, "Эўрафорум")
Алег Дзярновіч (гісторык, "Наша Ніва") — старшыня Рады
Сяргей Дубавец (літаратурны крытык, "Наша Ніва")
Віталь Скалабан (гісторык)
Ніна Стужынская (гісторык)
Алег Трусаў (гісторык, Таварыства Беларускай Мовы)
Сяргей Харэўскі (мастацтвазнаўца, "Наша Ніва")
Міхась Чарняўскі (гісторык і археоляг)
Ірына Коваль — сакратар Конкурсу

БЛІЗКАЯ ГІСТОРЫЯ

Жыцьцё ў Беларусі 1945-1965

Конкурс для школьнікаў

Пашукай нешта тое, што Цябе зацікавіць: у размове зь людзьмі на тэму тых часоў (пытайся пра канкрэтныя моманты, постаці, погляды), у хатнім ці іншым даступным архіве, у альбоме з фотаздымкамі. Натхніць можа артыкул у газэце, плякат, афіша, шыльда крамы, можа быць кадар са старой кінакронікі альбо здарэньне, запісанае ў лісьце ці дзёньніку. Сьлед гісторыі можна знайсьці паўсюль. Трэба ўмець заўважыць у паўсядзённасьці тое, што ня ёсьць відавочным, але адначасова характэрным для свайго часу — хоць зь сёньняшняга пункту гледжаньня яно нават абсурднае ці неімавернае. Набыцьцё тэмы можа стаць добрым пачаткам.

Потым пытайся, шукай, сумнявайся — вяртайся, зноў пытайся, спраўджай. Не спыняйся на адной крыніцы, нават аўтэнтычнай, дзякуючы якой ты можаш раскрыць толькі адзін аспэкт рэчаіснасьці. Альбо наадварот, Ты можаш давесьці, што гэтая крыніца няпраўдзівая і ёсьць фальшывым сьледам — гэтаксама, як аўтэнтычны акт прысуду не абавязкова павінны быць пераліченьнем сапраўднай віны асуджанага, але можа стаць сьведчаньнем несправядлівасьці суда.

Усё гэта ня ёсьць такім простым, вымагае цярплівасьці і высілкаў. І... можа не атрымацца. Але варта паспрабаваць.

ЛЮДЗІ

На ўсіх этапах дасьледчай працы найважнейшаю для Цябе крыніцаю могуць быць перадусім людзі — жывыя сьведкі мінулых падзеяў. Яны могуць распавесьці цікавыя гісторыі, удакладніць, хто адлюстраваны на фотаздымку, зазначыць значнасьць дакумэнту — адкрыць пасьлядоўнасьць падзеяў калі не ў дэталях, то напэўна перадаць атмасфэру таго часу.

Варта спрабаваць размаўляць зь людзямі, распытваць іх, дазнавацца. Можа стацца, што нехта са сваякоў, сусед, "звычайны" знаёмы мае сваю ўласную гісторыю, быў сьведкам ці ўдзельнікам цікавай падзеі, зьдзейсьніў важны жыцьцёвы выбар.

Ёсьць людзі-апавядальнікі, якія гатовыя ад першага пытаньня распавесьці пра цэлае жыцьцё; ёсьць такія, якія будуць маўчаць, пакуль не патрапіш на найважнейшы для іх тэмат. Але ёсьць і такія, якія нават пры цярплівым распытваньні "цэдзяць" сваю гісторыю, альбо ніколі яе не распавядаюць: ня хочуць, ня ўмеюць, баяцца.

Кожны сьведка патрабуе свойго спосабу размовы, таму ўсе атрыманыя ўспаміны варта адпаведным чынам для іх апрацоўваць, але ўсе ўспаміны патрабуюць спраўджэньня, праверкі — калі Ты хочаш каб рэчаіснасьць, прачыненая Табою, была б праўдзівай, выразнай, цікавай.

Тое, што сьведка ёсьць цікавай (а тым больш, вядомай) постацю, ахвотна і маляўніча распавядае — мала для посьпеху. Ніводны ўспамін ня можа быць вольным ад суб'ектывізму, ніводны ўспамін нельга прымаць на веру некрытычна.

Важна тое, якое дачыненьне аўтар успамінаў меў да падзеяў. Па-рознаму ўбачаць падзею сьведка, ахвяра ці "ахоўнік парадку". Памяць ненадзейная. Часта выштурхоўваецца зь яе тое, што было кепскім, непрыемным. Часта наадварот — тое, што рабіла балюча, прымушала да цярплівасьці, запамінаецца назаўжды, а ў аповядах нават перабольшваецца.

З пэрспэктывы часу інакш ацэньваюцца людзі, іхныя паводзіны, матывацыі, мэты — іншы раз дзеля таго, каб пацьвердзіць слушнасьць (альбо не) іхнага выбару, калі-нікалі таму, што толькі пазьней сталі зразумелымі іхныя намеры, а бывае і такое, што час дазваляе дараваць іхныя ўчынкі.

Часам праз гады чалавек ня проста ўзгадвае, але і кампілюе свае "новыя ўспаміны" — з таго, што сапраўды здарылася з аўтарам успамінаў, з таго, што здарылася зь іншымі людзьмі, а таксама з таго, што было пачутае ці прачытанае. Бывае, успаміны базуюцца нават на плётцы ці пагалосцы, якія таксама могуць быць крыніцаю ведаў пра людзей і іх час. Гэта ўсё яшчэ бывае прапушчанае праз фільтар уяўленьня — як тое "павінна было быць", праз фільтар уласных ацэнак і досьведу пазьнейшых часоў. Можа здарыцца, што Ты сутыкнесься таксама са спробаю "абароны біяграфіі", калі апавядальнік будзе адстойваць сэнс свайго жыцьця, уласны выбар, мэты і ідэалы, якім служыў.

Трэба ўмець аддзяляць факты канкрэтнай біяграфіі ад агульнай ніці гісторыі.

Варта пытацца пра іншых людзей, пра зносіны зь імі, пра іншых сьведкаў ці ўдзельнікаў здарэньняў — можа быць удасца іх знайсьці, спраўдзіць, як яны бачаць той час, пачуць розныя меркаваньні пра тыя падзеі. Нават у тым выпадку, калі няма відавочнай розьніцы інтарэсаў, а гэтым самым і розьніцы ў ацэнцы падзеяў, расповяды могуць значна адрозьнівацца.

Неабходна шукаць розныя спосабы праверкі інфармацыі, зьвяртацца да разнастайных відаў крыніцаў.

ПАПЕРЫ

Эпоха, якую Ты будзеш дасьледаваць, спарадзіла шмат папераў.

Павелічэньне колькасьці дзяржаўных установаў і бюракратызацыя дзяржавы (плянаваньне, справаздачнасьць і кантроль на ўсіх ступенях) давалі ў выніку тоны дакумэнтаў. Кожная арганізацыя — школа, фабрыка, калгас, музэй, тэатар..., — павінны мець свой архіў, які зьяўляецца неацэнным сховішчам ведаў пра саму арганізацыю, пра яе людзей, пра яе зносіны з вонкавым сьветам.

Спрабуючы ўплываць на спосаб мысьленьня і дзейнасьць чалавека, "выхоўваць" яго, савецкая ўлада бамбардавала жыхара Беларусі штодня незьлічонай колькасьцю пісьмовых загадаў, забаронаў, аб'яваў, цыркуляраў, плякатаў, лёзунгаў... Асобы від крыніцаў — тагачасныя газэты.

Малая даступнасьць у тыя часы тэлефонаў спрыяла ліставаньню праз пошту. А дзейнасьць цэнзуры спрыяла пісаньню "ў шуфляду" ўспамінаў ці дзёньнікаў.

Усё тое, што было **напісанае**, можа быць для Цябе крыніцай інфармацыі.

Багатымі крыніцамі ведаў пра эпоху могуць быць дакумэнты, якія ўзьніклі ў выніку дачыненьняў "грамадзянін-дзяржава": пасьведчаньні, даведкі, дыплёмы, просьбы, заявы, звароты, прысуды, пэрсанальныя анкеты, скаргі... Такімі дакумэнтамі эпохі ёсьць паперы з працы, а нават рахункі ці запісы сямейнага бюджэту. Трэба спрабаваць праз гэтыя дакумэнты асьвятліць фрагмэнты жыцьця.

Можа пашанцуе і, дакрануўшыся да гэтых завалаў папераў, Ты патрапіш на выключны дакумэнт альбо на сьлед незвычайнай падзеі. Але праца з дакумэнтамі не заўжды абяцае посьпех. Таму трэба ад пачатку абраць які-небудзь кірунак і шукаць мэтадычна.

Гэта можа быць спроба рэканструкцыі нейкай справы, спрэчкі, пратэсту. Запісаныя ў паперах пэрыпэтыі ў межах якой-небудзь установы могуць раскрыць мэханізм функцыянаваньня ўлады. Можа быць, Твая ўвага скіруецца на цікавага чалавека, які дараспавядзе "рэшту".

Незвычайную ролю ў спазнаньні мінуўшчыны могуць адыграць разнастайныя асабістыя запісы — найперш, дзёньнікі (асабліва тыя, якія пісаліся штодня), успаміны, прыватныя лісты. Хоць і гэтыя крыніцы маюць пэўную абмежаванасьць, пра што ўжо распавядалася ў папярэднім разьдзеле, і не павінны быць адзінай крыніцай ведаў пра рэчаіснасьць.

Трэба праверыць, ці маеш Ты доступ да арыгіналу, ці да Цябе патрапіла толькі копія альбо перапісаны тэкст. А пры перапісваньні тэкст можа быць "папраўлены" самім аўтарам, які стаў "мудрэйшым", дзякуючы пазьнейшаму досьведу.

Важнымі ёсьць многія аспэкты, якія датычаць акалічнасьцяў, умоваў, повадаў і прычынаў паўстаньня тэксту. Ці фіксацыя на паперы адбывалася адначасова з падзеямі, ці была пазьнейшай — гэта зьмяняе ацэнку тэкстаў і стаўленьне да іх, зьмяняе іх герархію, уплывае на сэлекцыю. Зь якімі канкрэтнымі мэтамі стварався гэты тэкст — ці пісаўся ён дзеля публікацыі, ці ў пошуках нечыяй прыхільнасьці? Ці мог аўтар тэксту нечага баяцца, ад некага хаваў свае запісы — ад сваякоў, ад начальства, ад міліцыі, ад карных органаў... Наколькі гэтыя запісы ёсьць адбіткам рэчаіснасьці, а наколькі — асабістасьці аўтара. Некаторыя могуць прыпісваць сабе ўчынкі, якія не зьдзяйсьнялі, распавядаць пра месцы, у якіх не маглі быць, цытаваць пачутае меркаваньне як сваё.

Як і любая іншая крыніца, асабістыя запісы павінны быць разгледжаныя крытычна. Інакш кажучы, трэба правесьці іх аналіз — ацаніць праўдзівасьць.

ВОБРАЗЫ

Усё XX стагодзьдзе — гэта час рэвалюцыйных зьменаў у тэхніцы захоўваньня і перадачы інфармацыі. У пэрыяд, які Ты будзеш дасьледаваць, фатаграфія робіцца надзвычай папулярным, пашыраным спосабам фіксацыі рэчаіснасьці — і афіцыйнай, і прыватнай.

У пэрыяд, які будзем аналізаваць, выраб і пашырэньне афіцыйных фільмаў і фота ў большай ці меншай ступені мелі на мэце **прапагандысцкую функцыю** — гэта значыць, што яны мусілі паказваць рэчаіснасьць згодна з тым, як яны павінны былі выглядаць на меркаваньне ўладаў. Варта памятаць, што кінафільм, нават калі ён называецца дакумэнтальным (кінакроніка ці рэпартаж зь месца падзеяў) заўжды ёсьць **пераўвасабленьнем рэчаіснасьці**, гэта значыць канструкцыяй, выкананай аўтарам фільму праз адбор вобразаў, сюжэтаў, герояў, праз мантаж кадраў, праз камэнтар.

На стражы пажаданага для ўладаў вобразу рэчаіснасьці стаяла цэнзура. Але яе панаваньне ў прыватнай сфэры, у адрозьненьне ад сфэры публічнай, было досыць абмежаваным. Цэнзура не магла цалкам уплываць на прыватныя фотаальбомы, якія робяцца вельмі папулярнымі ў Беларусі ў 60-я гады. Сярод сюжэтаў, якія часта паўтараюцца — здымкаў зь сямейных урачыстасьцяў, з вандровак ці вакацыяў, — можна патрапіць на такія, якія паказваюць які-небудзь цікавы момант, напрыклад, дачыненьняў "грамадзянін-улада".

Пытайся, хто ёсьць на фотаздымку, дзе, кім, пры якіх абставінах быў зроблены здымак. Ад Цябе, ад Тваёй дапытлівасьці залежыць, ці ажывуць вобразы, ці даведаесься, што было перад тым і што сталася потым — у якой пасьлядоўнасьці падзеі ўвекавечаныя ў тыя хвіліны на здымку.

Ты маеш ня шмат шанцаў натрапіць на нецэнзураваныя матэрыялы, яшчэ меней — на тое, што цэнзура "зьела". Уважлівы разгляд розных "вобразаў", таксама створаных афіцыйна, можа адкрыць тое, што не зьбіраўся перадаваць фатограф (і на што магла не зьвярнуць увагу цэнзура) і што зьяўляецца праўдзівым настроем ці пачуцьцямі людзей таго часу.

Параўнаньне вобразаў рэчаіснасьці, "прычасаных" (таксама і ў прыватнай фатаграфіі) і бяз рэтушы, супастаўленьне гэтых вобразаў зь іншымі крыніцамі, можа прынесьці нечаканыя вынікі ў спазнаньні праўды. Паступова Ты зразумееш яе насуперак тагачасным прапагандыстам.

Бачаньне гісторыі могуць даць таксама іншыя захаваныя вобразы рэчаіснасьці: малюнкі (таксама карыкатуры), графіці, скульптура, прадметы штодзённага ўжытку, а таксама помнікі, архітэктура, асяродзьдзе чалавека...


Ня толькі тое, што ўспрымаецца непасрэдна, але таксама ўмовы, мэты і акалічнасьці зьяўленьня нейкай крыніцы, роля, якую яны выконвалі, рашэньні, зьвязаныя зь імі, стаўленьне да іх людзей, і г.д. — для дапытлівага дасьледчыка могуць стаць шанцам адкрыцьця цікавага сьледу мінуўшчыны.

Архіў Найноўшае Гісторыі, травень 1998

МЭТРЫЧКА ПРАЦЫ *(можа быць скапіраванаю ці перапісанаю ад рукі - у фармаце А4; калі ня хопіць месца, пішыце на адвароце)*

Назва працы	*Месца для нумару* *(прастаўляецца сакратаром Конкурсу)*
Форма працы, яе аб'ём і складовыя часткі (напрыклад, колькасьць частак, колькасьць старонак машынапісу, машынапіс + касэта відэа, аўдыё, колькасьць касэтаў; альбом фотаздымкаў, колькасьць здымкаў)	
Імя і прозьвішча аўтара (аўтараў) працы (падкрэсьліць імя асобы, якая рэпрэзэнтуе ўсю групу)	
Дакладны адрас аўтара (аўтараў)	
Тэлефон аўтара (аўтараў) з тэлефонным кодам мясцовасьці	
Адрас, нумар і назва школы ці вучэльні, у якіх займаюцца аўтары	
Узрост аўтара (аўтараў) і кляса, у якой ён (яна, яны) займаецца (займаюцца)	
Імя і прозьвішча апекуна працы	
Адносіны апекуна працы да аўтара (аўтараў) - настаўнік, маці ці бацька, іншае	
Кантакт (адрас, тэлефон) з апекуном працы	
У чым заключалася апека	

Вось сымбаль твой...



Анатоль Цітоў. Геральдыка беларускіх местаў / Мастак А.Бажэнаў. — Менск: Полымя, 1998.

Падмурак беларускай гісторыі памацнеў: зьявіўся новы варыянт кнігі Анатоля Цітова пра беларускія гарадзкія гербы. Прыемна ўзяць у рукі гэтае выданьне, падзівіцца на шматлікія, па-майстэрску зробленыя выявы гербаў на глянцавай паперы, перагартаць і перачытаць не адзін раз... Калі папярэдняя манаграфія аўтара (1989 году) зьмяшчала гербы 73-х гарадоў, то цяперашняя — 146-ці. Мусіць, аўтар наўмысна зрабіў падвышку роўна ў два разы. Такое памнажэньне беларускіх гарадоў з гербамі тлумачыцца тым, што А.Цітоў абраў этнаграфічны падыход да вызначэньня «беларускі»: калі раней такім загадвалі лічыць тое, што ляжала ў межах БССР, то цяпер магчыма называць беларускім менавіта беларускае. Зьмешчаныя ў кнізе аўтарытэтныя мапы паказваюць сапраўдныя межы нашай геральдыкі ад Бранска і Дарагабужа на ўсходзе да Бранска і Ломжы на захадзе, ад Себежа на поўначы да Славатычаў і Гародні (Гараднай) на поўдні. Таму падставай — зьвесткі лінгвіста Я.Карскага, гісторыка М.Доўнара-Запольскага і эканаміста Я.Канчара. Па-за межамі ўласна беларускай тэрыторыі апынуліся старажытныя гарады з гербамі Воін, Ламазы, Астраленка, Новы Груд, Кольна, Сувалкі, Сейны і іншыя, але А.Цітоў і іх уключыў у кнігу. З усіх «новых» набыткаў беларускай геральдыкі сапраўдным дыямэнтам ёсьць старажытная Вільня, але дзеля справядлівасьці трэба адзначыць, што яе герб уважаўся за беларускі і раней, прыкладам, складальнікамі энцыкляпэдыі «Беларусь» (1995 год).

Значна пашыраныя агульнатэарэтычныя разьдзелы кнігі, зьявіліся і зусім новыя матэрыялы (пра геральдыку рамесных цэхаў у гарадах). Аднак шмат засталося і таго даўняга «матэрыялу», ад якога было б варта адмовіцца. Ці ня дзіва, што амаль кожны разьдзел кнігі пачынаецца з цытатаў Маркса і Энгельса? «Клясычнае вызначэньне (мяшчанскай грамады пры фэадалізме) дадзена Ф.Энгельсам», — лічыць аўтар. У навуцы дастаткова сапраўды клясычных дасьледаваньняў пра фэадалізм, і пра гэтую тэму таксама. А вось каб спазнаць, што клясы і саслоўі — гэта не адно й тое ж, сапраўды можна было абмежавацца прачытаньнем згаданых «клясыкаў». Арыгінальны і, асьмелімся сказаць, не марксісцкі падыход у аўтара да складанай праблемы — чым адрозьніваліся гарады (месты) ад мястэчак. А.Цітоў мяркуе, што наяўнасьцю ў першых і адсутнасьцю ў другіх прывілею на магдэбурскае права. Вось адсюль і тлумачэньне назвы кнігі — яна прысьвечаная менавіта местам (гарадам), бо некаторыя могуць зьдзівіцца: а куды дзеліся мястэчкі зь іх гербамі. Для аўтара і яны — гарады.

Нягледзячы на салідныя дадаткі, у кнізе пастаянна адчуваецца брак агульнага разьдзелу пра геральдыку, правілы складаньня гербаў, левы і правы бок у гербах і г.д. Аўтар дае такія зьвесткі ашчадна, патроху і на розных старонках, так што недасьведчанаму чытачу будзе ў нейкай ступені нязручна скласьці з гэтых бліскучых мазаічных кубікаў цэласную карціну геральдыкі як мастацтва складаньня гербаў. Гэтае мастацтва прайшло такі складаны шлях і, дарэчы, жыве і зараз, бо ёсьць патрэба складаць гербы для нашых новых гарадоў. Чамусьці аўтар вырашыў адмежавацца ад сучаснасьці і даводзіць выкладаньне толькі да першых дзесяцігодзьдзяў XX ст. А.Цітоў прапануе вылучаць два этапы: дагеральдычны (сымбалі Наваградка і Віцебска) і геральдычны (усе астатнія з 146 гербаў). Дадатак пазагеральдычага этапу (герабавая творчасьць у БССР) паказаў бы сёньняшнім мастакам, што ня трэба выдумляць ужо прыдуманае і выдаваць сваю прадукцыю за геральдычнае мастацтва. Самы яскравы прыклад такой дзейнасьці — старажытны гербавы алень Гародні з чырвонай зоркай замест крыжа паміж рогамі. Жывёліна нечым нагадвае героя ўвядомага рамана Вайновіча.

Скарыстаўшы апошні прыклад, пяройдзем да разгляду канкрэтных гербаў. Гарадзенскі алень з падачы аднаго польскага дасьледчыка атрымаў мянушку «алень сьв. Губэрта». Быў у VIII стагодзьдзі такі біскуп Льежа. Пра яго распавядалі, што той, будучы паганцам у маладосьці, вельмі любіў паляваць. Аднаго разу перад ім зьявіўся цудоўны алень з крыжам паміж рогамі — знак Божага закліку. І Губэрт прыняў веру Хрыстову, стаў манахам. Беларускія дасьледчыкі яшчэ не зьвярнулі ўвагі на тое, што такую самую гісторыю расказвалі шмат вякоў раней пра бізантыйскага сьвятога Яўстафія Плакіду. Пра апошняга на Русі ведалі яшчэ ў XI ст. Каб пра яго ведалі яшчэ і ў XX ст. ідэалягічныя цэнзары, то, пэўна, не замянілі б крыж на зорку, бо «праваслаўны» герб быў бы ў нечым «прымальным», прынамсі, як дэкарацыя.

У кнізе прыведзеныя новыя цікавыя падрабязнасьці пра герб Шклова. У папярэднім варыянце кнігі А.Цітоў далучаўся да дасьледчыкаў мінулага стагодзьдзя, што герб горада з выяваю бязьмену сымбалізаваў гандаль. Цяпер высунута новае тлумачэньне, дзякуючы лацінскаму надпісу «юстыцыя» на гарадзкой пячатцы: бязьмен — гэта своеасаблівы сымбаль справядлівасьці. Тут нейкая старажытная блытаніна. Справядлівасьць, роўнасьць перад законам у Старажытным Рыме ўвасабляла багіня Эквітас, якую ў пазьнейшай Эўропе часта малявалі з шалямі ў руках. Бязьмен на такі сымбаль ну зусім не прыдатны, нават у руках і Юстыцыі. Магчыма, асэнсаваньне бязьмену як сымбалю Юстыцыі — зьява пазьнейшая.

Выкажам уласнае разуменьне словаў з апісаньня мсьціслаўскага гербу. У прывілеях ён апісаны як «меч з шчытом наверх». Паводле А.Цітова, на самой справе на рэальных пячатках маецца выява рукі, узброенай мячом, што высунулася з-за шчыта. З прыведзеных выяваў бачна, што тая рука высунулася з воблака, меч скіраваны ўгару. А што датычыць шчыта — то ў прывілеях так, пэўна, названая гарда — перакрыжаваньне мяча.

Аўтар часьцяком выкарыстоўвае ў тэксьце старасьвецкія тэрміны і выразы, якія, здавалася, ужо зьніклі з нашай мовы, сьмела ідзе на моўныя экспэрымэнты. Дзякуючы А.Цітову шмат якія словы атрымаюць сваё другое жыцьцё. Але гэта не пра тэрмін «полецаі» у сэнсе «паліцыя», які нібыта сустракаецца ў старажытным прывілеі вялікага князя. Той пісаў: «Полецаем теж войту и бурмистром и радцом вси месцы пустыя, в месте и около места, к осаженью и размноженью людей», што па-сучаснаму будзе: «Аддаем таксама войту і бурмістрам і радцам усе мясьціны пустыя...» Скрозь у кнізе трапляецца скарачэньне «ВкЛ», бо, маўляў, пішацца «Вялікае княства Літоўскае». Аднак тое напісаньне — «княства» праз малое «к» — старая маскоўская традыцыя, якая супярэчыць даўнім беларускім дакумэнтам, таксама адноўленай традыцыі напісаньня ВКЛ.

Пры ўсіх вартасьцях новая праца А.Цітова мае істотны грэх — там ня згадваюцца навуковыя апанэнты аўтара і іх погляды на некаторыя пытаньні генэалёгіі (погляды слушныя), ня згадваюцца іх працы. Дарма. Гэтай кнігай А.Цітоў даказаў, што ён па-ранейшаму — цэнтральная постаць у беларускай геральдыцы і не яму баяцца крытыкі.

Валеры Пазьнякоў.

КНІГА-ПОШТАЙ

Каб замовіць патрэбную Вам кнігу, неабходна пазначаную суму праз пошту пералічыць на наступны рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г.Менска, код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» ўказаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч.

№ Аўтар і назва	Кошт	Кошт перасылкі
1. Васіль Быкаў. Сьцяна	130.000	20.000
2. Гарт. З успамінаў пра Саюз Беларускіх Патрыётаў (1945-1947)	80.000	16.000
3. Аляксандар Лукашук. «За кіпучай чэкісцай работай...»: Сцэны з жыцьця катаў	50.000	12.000
4. Аляксандар Лукашук. Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста	28.000	12.000
5. Канвэер сьмерці: Дакумэнты, сьведчаньні, успаміны	250.000	20.000
6. Каралеўства Беларусь: Посткаляніяльная культура	150.000	15.000
7. Адам Глёбус. Толькі не гавары маёй маме...	30.000	16.000
8. Адам Глёбус. Койданава	45.000	10.000
9. Ж.-Б. Дзюрасэль. Эўропа з 1815 году да нашых дзён	15.000	16.000
10.Б.Фэйган. Уводзіны ў археалёгію	12.000	12.000
Выданьні «ЭўроФоруму»		
1. Энтані Сьміт. нацыяналізм у XX стагодзьдзі	30.000	12.000
2. Ш.Дэбаш, Ж.-М. Пант'е. Уводзіны ў палітыку	48.000	20.000
3. Ёран Тэрборн. Эўропа сёньня і заўтра	48.000	20.000
4. П.Брунэль. Што такое параўнаўчае літаратуразнаўства	36.000	12.000
5. Фрагмэнты. № 1	36.000	12.000
6. Фрагмэнты. № 2	60.000	20.000
7. Фрагмэнты. № 4	60.000	18.000

НОВЫЯ КНІГІ І ПЭРЫЁДЫКІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Баравікова Р. Сад на капялюшыку каханай: Лірыка. — Менск: Мастацкая літаратура, 1998. — 486 с., іл., партр. — («Залатая сэрыя». Паэзія XX ст.) — Наклад 2.700 ас. ISBN 985-02-0364-1

Дранько-Майсюк Л. Гаспода: Выбранае. — Менск: Мастацкая літаратура, 1998. — 382 с. — («Залатая сэрыя». Паэзія XX ст.). — Наклад 4.000 ас. ISBN 985-02-0401-X

Заклятае возера: Беларускія народныя гераічныя і фантастычныя казкі. / Апрац. А.Якімовіча. Маст. М.Селяшчук. — Менск: Юнацтва, 1998. — 224 с., іл. — Наклад 6.000 ас. ISBN 5-7880-0844-1

Згукі Бацькаўшчыны: Зборнік. Для малодшага і сярэдняга школьнага веку. / Уклад. У.Казьбярук, Я.Янушкевіч; Маст. В.Мікіта. — Менск: Юнацтва, 1998. — 269 с., каляр. іл. — Наклад 5.000 ас. ISBN 985-05-0111-1

Корчак Я. Кароль Мацюсь Першы. Кароль Мацюсь на бязьлюдным востраве: Аповесьці-казкі. Для малодшага школьнага веку. / Маст. В.Сідарава. — Менск: Юнацтва, 1998. — 462 с., іл. — (Бібліятэка замежнай дзіцячай літаратуры) — Наклад 4.000 ас. ISBN 5-7880-0769-0

Крук І. Сьледам за сонцам: Беларускі народны каляндар. Дапаможнік для пэдагогаў дзіцячых дашкольных установаў. — Менск: Ураджай, 1998. — 216 с. — Наклад 6.800 ас. ISBN 985-04-0135-4

Ліцьвінка В. Сьвяты і абрады беларусаў. — 2-е выд. — Менск: Беларусь, 1998. — 190 с., іл. — Наклад 7.000 ас. ISBN 985-01-0055-9

Марзалюк І. Магілёў у XII-XVIII ст. Людзі і рэчы. / Навук. рэд. Я.Рыер. — Магілёў: Веды, 1998. — 260 с., іл., пы ўдзеле МТ «Брама». — Наклад 1.000 ас. ISBN 985-6390-64-8

Міхно У. Азартныя гульні: Аповесьць. — Менск: Мастацкая літаратура, 1998. — 167 с. — (Першая кніга празаіка) — Наклад 2.500 ас. ISBN 985-02-0345-5

Пралеска: Чытанка для дзяцей-дашкольнікаў. / Уклад. і ўступ. арт. А.Сачанкі; Мастак М.Рыжы. — Менск: Юнацтва, 1998. — 318 с., каляр. іл. — Наклад 6.000 ас. ISBN 985-05-0043-3

Саламаха У. Апазнаецца асоба мужчыны: Аповесьці. — Менск: Мастацкая літаратура, 1998. — 382 с. — Наклад 1.000 ас. ISBN 985-02-0217-3

Сьвірыдаў С. Крык душы: Аповесьці, апавяданьне. — Менск: Мастацкая літаратура, 1998. — 286 с. — Наклад 700 ас. ISBN 985-02-0451-6

Танк М. Журавель і чапля: Казкі. Менск: Юнацтва, 1998. — 48 с. — Наклад 6.000 ас. ISBN 985-05-0164-2

Хатынь: Альбом. / Тэкст і фота Я.Казюлі. — Менск: Беларусь, 1998. — Наклад 5.000 ас. ISBN 985-01-0159-8

КАСЭТЫ-ПОШТАЙ

На складзе БГФ «Наша Ніва» ёсьць касэты (кошт 45.000 + 7.000 БРБ)

1. Народны альбом: Супольны музычны праект (1997)
2. Палац. Дарожка (1997)
3. NRM. Made in NRM. Песьні з альбомаў 1995-1996
4. Новае Неба. Мая краіна (1996)
5. Крама. Хворы на рок-н-рол (1993)
6. Данчык. Беларусачка і іншыя песьні (1974/1998)
7. Мясцовы час. Падвойны альбом (1998): Слота (1989), Мой дом (1990)
8. Zygimont VAZA. Стан Галюцынацыі
9. Андрэй Мельнікаў. Гэта мы! (1996)
10. Камэлот. У краіне талераў (1995)
11. Віктар Шалкевіч. Смутны беларускі блюз (1996)
12. Made in Belarus (1997)

Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч.

Каб замовіць патрэбную Вам касэту, неабходна 45.000 рублёў + 7.000 праз пошту пералічыць на наступны рахунак:

БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г. Менска, код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» ўказаць назву касэты, Ваш дакладны паштовы адрас і тэлефон.

На складзе БГФ «Наша Ніва» маецца ў наяўнасьці больш за 70 найменьняў касэтаў беларускіх рок-гуртоў, бардаў, поп-выканаўцаў. З поўным сьпісам можна азнаёміцца ў папярэдніх нумарах НН.

НАВІНКА!



Жоўтая кніга. Маніторынг 30.08.95 - 29.12.97. - Менск: Беларускі ПЭН-Цэнтар, 1998.

Гісторыя насьмяялася з нас і цяпер мы маем сваю «ўласную» Жоўтую кнігу.

Захапляльна і падрабязна, з ілюстрацыямі, на трох мовах (беларускай, расейскай, ангельскай) распавядаецца пра ўдушэньне свабоды слова ў Беларусі. Пры друку кнігі выкарыстаная каляровая папера (жоўтая).

НАВІНКА!



Страчаная спадчына / Т.Габрусь, А.Кулагін, Ю.Чантурыя і інш. Уклад. Т.Габрусь. - Менск: Полымя, 1998. - 351 с.: іл. ISBN 985-07-0036-X

Зрэалізаваны праект, пра які гаварылася апошніх 15 гадоў — збор матэрыялаў пра зьнішчаныя помнікі архітэктуры Беларусі і публікацыя гэтай інфармацыі. Усю нашую страчаную спадчыну немагчыма зьмясьціць у адным томе, таму гэтае выданьне можа стаць пачаткам цэлай сэрыі.

НАВІНКІ!



Дэкрэт «Аб Усходніх Каталіцкіх Цэрквах» [II Ватыканскі Сабор]. - Полацак: «Сафія», 1997. ISBN 985-644802-6

Дэкрэт «Аб Усходніх Каталіцкіх Цэрквах» нармуе ўзаемаадносіны Апостальскай Сталіцы да Ўсходніх Цэркваў як каталіцкіх, так і праваслаўных. Выхад беларускага тэксту дэкрэту сымбалізуе адраджэньне грэка-каталіцтва ў Беларусі.



Архім. Сяргей Гаек, іерам. Леанард Гурка. Эўропа, Эвангельле, Беларусь: Рэфлексіі напярэдадні Трэцяга Тысячагодзьдзя. - Ворша-Lublin-Харків, 1997 (Сэрыя СЛОВО, № 1). ISBN 83-7119-162-6

Гэтая кніжка — першая з сэрыі «Слово», заснаванай Марыянскім Домам Студыяў Сьвятых Кірыла і Мятода ў Любліне ў супрацоўніцтве з грэка-каталіцкімі асяродкамі ў Воршы і Харкаве. Мэта сэрыі і гэтай кнігі — служыць дыялёгу паміж славянскімі цэрквамі ў духу Салунскіх Братоў.



А. праф. Вацлаў Грыневіч. Пасхальныя матывы ў творах сьв. Кірылы Тураўскага. - Ворша-Lublin-Харків, 1997 (Сэрыя СЛОВО, № 2). ISBN 83-7119-167-7

Аўтар працы — кіраўнік экумэнічнага інстытуту Люблінскага каталіцкага ўнівэрсытэту. Праз увесь тэкст праходзіць тэзыс пра дамінаваньне ў рэлігійным сьветаадчуваньні ва Ўсходняй Эўропе апавядальнага і павучальнага элемэнтаў над рэфлексійна-інтэлектуальным. Велікодная тэалёгія і духоўнасьць сьв. Кірылы нагадвае аб прыярытэце жыцьця над дактрынай. У гэтым ён падобны да сьв. Кіпрыяна Картагенскага: «Мы філёзафы ня ў словах, але ў дзеяньнях; не гаворым вялікіх рэчаў, але жывем». У гэтым як сіла, так і пэўная слабасьць гэтак званага бытавога хрысьціянства.




Священник Виктор Данилов. Мой путь к Богу и к Католической Церкви. - Полацак: «София», 1997. ISBN 985-6448-04-2 (Бел) ISBN 83-85509-24-0 (PL)

Гэтая кніга-сьведчаньне пра тое, як ва ўмовах дзяржаўнага атэізму можна было стаць з атэіста перакананым хрысьціянінам. Айцец Віктар, былы вязень ГУЛАГу, з 1976 году ў Гародні, ва ўмовах падпольля, распачаў сваю дзейнасьць грэка-каталіцкага сьвятара. Гэтая грэка-каталіцкая парафія дзейнічае і цяпер.

СТО ТВОРАЎ XX СТАГОДЗЬДЗЯ

Пакроўскі сабор у Баранавічах



... Пачынаючы з 1910-х гадоў у архітэктуры Цэнтральнае Эўропы, у супрацьпастаўленьні да «бесстылёвасьці» эклектыкі і нарастаючай атэктанічнасьці мадэрну, пачала крышталізавацца новая хваля клясыцызму. Гэтае памкненьне да гармоніі і яснасьці вобразу, замяшанае на боязі найноўшых тэхналёгіяў, якія прынесла з сабою індустрыяльная рэвалюцыя, атрымала назоў «нэаклясыцызм». Аднак неўзабаве высьветлілася, наколькі бесьпэрспэктыўным аказаўся гэты зварот у мінулае (дарэчы, не такое і даўняе). Памкненьне да «чысьціні» дойліды, адпаведна свайму тэмпэрамэнту і таленту, успрымалі па рознаму. Для Пітэра Бэрэнса (якому пазьней падражаў Іосіф Лянгбард) гэта было ўдалым супадзеньнем, якое яшчэ больш падкрэслівала магутнасьць ягонага канструктывізму. Для славутага венца Ота Вагнэра, нэаклясыка стала адной з фарбаў на ягонай непаўторнай, вагнэраўскай палітры архітэктурных прыёмаў. Для юнага француза Агюста Пэрэ клясыцыстычныя прыёмы былі толькі прыступкай да авангарднага функцыяналізму...

...Сур'ёзьней за ўсіх да нэаклясыкі паставіліся ў Расеі. У свой час менавіта клясыцызм быў дзяржаўным стылем імпэрыі. А таму ягоны стылістычны працяг лёгка ўпісваўся ў расейскі урбаністычны краявід. Праўда, чамусьці, клясыку расейскага нэаклясыцызму склалі беларусы: Крычынскі й Лялевіч у Пецярбурзе і Жалтоўскі ў Маскве...

У беларускім дойлідстве 1910-х гадоў нэаклясыцыстычныя пабудовы адрозьніваліся дасканалым будаўляным майстэрствам, асаблівай пекнасьцю. Пры тым адразу выявілася пэўная халоднасьць вобразаў, здрабненьне фармальных дэкаратыўных прыёмаў. Найбольш яскрава творчыя прынцыпы нэаклясыкі выявіліся ў творчасьці менскіх архітэктараў Гая і Гайдукевіча, хоць помнікаў гэтага стылю багата па ўсёй Беларусі. Найбольш імпазантныя помнікі створаныя аднак у культавым дойлідстве: Пакроўская царква ў Жабінцы, касьцёл у Шклове, Петрапаўлаўская царква ў вёсцы Возера на Вузьдзеншчыне, капліцы ў Магілёве, у вёсках Моладава і Салтанаўка і шмат, шмат іншых...

...Напрыканцы 20-х гадоў і пачатку 30-х нэаклясыцызм атрымаў шырокае распаўсюджаньне ў архітэктурных школах Італіі, Нямеччыны і СССР у выглядзе маштабных спарудаў, якія адлюстроўвалі таталітарныя ідэалёгіі. У другой палове 20-х гадоў нэаклясыцызм вярнуўся і ў Заходнюю Беларусь. Гэта была ўжо другая хваля беларускага нэаклясыцызму. У той час, пакуль сакральнае дойлідства па ранейшаму кампілявала ў рэтраспэктыўных стылях, клясыцыстычныя формы прыйшлі на зьмену нэабарока ў архітэктуры дзяржаўных установаў, жылых дамоў і крамаў...

Шэдэўрам беларускага нэаклясыцызму стаў баранавіцкі Пакроўскі сабор. Ён быў пастаўлены на працягу васьмі гадоў, з 1924 па 1932. Асноўны аб'ём бажніцы — чатырохслуповы ў пляне куб з прымыкаючымі да яго трыма паўкруглымі апсыдамі, пакрыты вялікім (найбольшым па тым часе ў краі) купалам з шасьцю круглымі люкарнамі па ўсім дыямэтры, якія наскрозь асьвятляюць пакупальную прастору інтэр'еру. Купал (у трэць сфэры), сканструяваны ў дзьве абалонкі й эфэктна ўвянчаны шарам з крыжам, які проста пастаўлены на купал і ставарае ўражаньне хісткае раўнавагі. Здаецца, вось-вось падзьме вецер і гэты шар-«дзяржава» пакоціцца долу...

З заходняга боку, ад галоўнага фасаду, працяглая, завужаная трапезная злучае асноўны аб'ём з квадратнай у пляне трох'яруснай стромкай званіцай, якая сканчаецца чатырохгранным цыбулепадобным шатром з высокім шпілем. У сакавітай пластыцы званіцы марфалягічныя элемэнты клясыцыстычнага дэкору трактаваныя досыць вольна: кутавыя адзінарныя і спараныя калёны, паўкалёны, лапаткі, прафіляваныя гзымсы ствараюць узаемаспарадкаваныя, але асобныя ў кожным ярусе рытмы. Абрысы званіцы — алюзія на неўтаймаваную пластыку тутэйшага барока. Звыклая і больш натуральная тутэйшая традыцыя эстэтычных уяўленьняў. Галоўны ўваход вызначаны паўцыркульным тымпанам, шчыльна ўсталёным паміж дзьвюх паўкалёнаў. Паўднёвы й паўночны фасады выдзяляюцца манумэнтальнымі портыкамі, дэкараванымі моцна стылізаваным іянічным ордэрам. Яны, моцна вынесеныя за асноўны аб'ём, ствараюць надзвычай урачыстае афармленьне бакавых уваходаў у бажніцу, якія адчыняюцца падчас найбольшых сьвятаў. Атворы вокнаў і блэнды (вокнападобныя нішы) асноўнага аб'ёму, а таксамадругога ярусу званіцы аблямаваныя нягдыбака прафіляванымі ліштвамі з трохкутнымі сандрыкамі.




Асобна варта адзначыць, што гэтая бажніца мае вялізарныя скляпеньні ў цокальным паверсе, куды вядуць саматойныя бакавыя праходы. Яшчэ глыбей зьмешчаная вялікая крыпта, а пад алтаром і рызьніца. Гэтыя скляпеньні нагадваюць пра катакомбныя традыцыі ранейняга хрысьціянства.

Будаўніцтва сабора перацярпела шэраг істотных зьменаў. Першапачакова плянавалася ўзьвесьці невялікую драўляную царкву па праекце архітэктара Юрыя (Ежы) Жаландкоўскага, па праекце якога быў пабудаваны зусім побач Крыжаўзьвядзенскі касьцёл. Гэты драўляны касьцёл, разьмешчаны па дыяганалі за колькі дзясяткаў мэтраў ад Пакроўскага сабору, уяўляе сабою даволі зграбную фантазію на тэмы народнага беларускага дойлідства, готыкі й барока. Падобна, што пастаўленая непадалёк драўляная ж царква, мусіла б адлюстроўваць нейкую ідэйную праграму. Напрыклад — спалучаць беларускія і ўсходнія, бізантыйскія матывы. Але ў той самы час урад Польшчы вырашыў зьнесьці ў цэнтры Варшавы расейскі катэдральны сабор Аляксандра Неўскага, які ўвасабляў сабою трыюмф Расейскае імпэрыі над Польшчай. Гэтая каляісальная бажніца ў псэўдарускім стылі была пабудаваная ў 1902 годзе па праекце славутага пецярбурскага архітэктара Лявонція Бэнуа (які ў той самы час пабудаваў у Пецярбургу нэараманскі касьцёл у Ковенскім завулку). У 1923 годзе было вырашана яго зьліквідаваць. Але перад польскімі ўладамі паўстала праблема: як захаваць унікальныя мазаікі з гэтага сабору...

Буйныя мазаічныя пано для варшаўскага сабору былі выкананыя ў Пецярбургу, у буйнешай мазаічнай майстэрні В. Фралова. Мазаікі былі выкананыя паводле кардонаў і пад кіраўніцтвам славутых расейскіх мастакоў: М. Бруні, В. Васьняцова, М. Кошалева і В. Думітрашкі. Іх выраб адбываўся паэтапна, спачатку ў тэхніцы адваротнага набору (наклейваньне на кардон вонкавым бокам кавалачкаў смальты), а пасьля простага (мантаж на бэтон), ужо ў самой Варшаве. Унікальны мастацкі твор вырашана было закансэрваваць, зьняўшы са сьценаў сабору. Для іх разьмяшчэньня спатрэбілася іншае прыдатнае месца. Выбар выпаў на Баранавічы, дзе па настаяньню праваслаўнага клеру было вырашана пабудаваць бажніцу выключных памераў (зважаючы на верявызнаньне большасьці тутэйшага люду). Першапачатковая новая бажніца была задуманая, як паменшаная копія зьнесенага сабору ў Варшаве. Прыступілі да работаў. Але, на шчасьце, ад гэтай ідэі адмовіліся. Ад першага праекту засталіся толькі вялікія падземныя й цокальныя памяшканьні. Да новага праекту спрычыніўся архітэктар Станіслаў Філісевіч.

Творчае крэда Філісевіча можна вымоўна зразумець, пазнаёміўшыся зь ягонымі будынкамі банкаў, якія зьбераглiся дасёньня — у Берасьці (1926) і ў тых жа Баранавічах (1932). У ягонай творчасьці выкарыстаньне матываў позьняга клясыцызму спалучаецца зь іншымі стылёвымі запазычаньнямі, нагадваючы эклектызм 19 стагодзьдзя. Аднак свабодная, элегантная інтэрпрэтацыя рэтраспэктыўных элемэнтаў, арыгінальнасьць кампазыцыйных прыёмаў, а таксама простае абыходжаньне з найноўшымі матэрыяламі (сталь, бэтон, шкло) сьведчыць за ягоную мадэрнасьць.



Напрыклад, берасьцейскі банк уяўляе сабою трохпавярховы корпус з высокім цокальным паверхам, які складаецца з двух узаемапэрпэндыкулярных крылаў, злучаных аб'ёмам у выглядзе дамінуючай над усім гмахам ратонды са сфэрычным купалам. Кампазыцыйны акцэнт створаны на зарыентаваных на цэнтральную вуліцу і плошчу аб'ёмах, сцены якіх падзелены пілястрамі з іянічнымі капітэлямі й трохчвэрцевымі калёнамі. Дзякуючы дакладнай, халоднай і здробненай трактоўцы вонкавага дэкору, асабліва калі зважаць на магутны атык, будынак стварае ўражаньне манумэнтальнасьці, асаблівай значнасьці, што трапна адпавядае прызначэньню будынка. Няцяжка заўважыць, колькі элемэнтаў кампазыцыі й дэкору перанес на гэты будынак Філісевіч з праекту Пакроўскага сабору: скрыжаваньне аб'ёмаў, ратонда з купалам, высокі цокаль, які дадае манумэнтальнасьці, адвольна кампанаваны лёгкі іянічны ордэр...

Шукаць стылістычных аналягаў Пакроўскаму сабору ўсё ж бессэнсоўна... Па-першае, у тыя гады, бадай, толькі на Заходняй Беларусі былі магчымасьці разгарнуць такія работы для пабудовы праваслаўнага храму. Па-другое, спэцыфічныя задачы (экспанаваць ацалелыя мазаікі) вымагалі ад будаўнікоў і спэцыфічных архітэктурных прыёмаў.

На працягу 1926 і 1927 гадоў карпатліва закансэрваваныя мазаікі былі перавезеныя з Варшавы ў Баранавічы. Зробленыя ў сталіцы Расеі і адслужыўшы сваё ў сталіцы Польшчы, гэтыя шэдэўры мазаічнага мастацтва знайшлі прыстанак у Беларусі. Мазаіка В. Васьняцова, «Маці Божае з малым Хрыстом», фрагмэнт некалі вялікай кампазыцыі «Пра цябе радуемся», зьмешчаная ў канцы апсыды, у алтарнай частцы. Мазаіка «Спас з данатарам», у тымпане франтона паўднёвага портыку, і «Дэісус», у портыку з поўначы, выробленыя па кардонах М. Кошалева. «Данатар» на каленях перад Хрыстом — партэт архітэктара Бэнуа з мадэльлю варшаўскага сабору ў далонях... Па кардонах акадэміка М. Бруні зробленыя мазаікі «Маці Божая з анёлам» (у інтэр'еры над паўднёвым уваходам), а таксама фрагмэнт кампазыцыі «Сабор архістраціга Міхаіла» (у тымпане паўночнага портыка). У інтэр'еры сабора ёсьць таксама яшчэ дзьве мазаікі В. Думітрашкі: на паўночным стаўпе — выява мітрапаліта Алексія, на паўднёвым — Іосіфа Валоцкага.

Мастацтва мазаікі было фактычна невядомае ў Беларусі да XX стагодзьдзя. Ягонае зьяўленьне ў нашым краі — частка культурніцкага экспарту з Расеі ў каленіі. Ці то гэта тычыцца мазаікі на фасадзе капліцы-пахавальні Сьвятаполк-Мірскіх у Міры (таксама з майстэрні Фралова), ці то на Катэдральным саборы ў Менску, дзесяць гадоў таму прывезенай з Масквы, гэта ўсё ж толькі экспарт. Але сваімі маштабамі мазаічны цыкль у Баранавічах ня мае сабе роўных у Беларусі (і ня толькі), роўна ж як і самой ідэяй праекту — пабудаваць для ўжо існуючых мастацкіх твораў спэцыяльны сабор...

У інтэр'еры Пакроўскага сабору зьберогся таксама адзін з найбольшых у Беларусі іканастасаў. Вакананы ў псэўдабізантыйскім духу паміж 1929 і 1930 гадамі, ён быў адмыслова прызначаны для абразоў з варшаўскага сабору. Абразы, напісаныя і ў акадэмічнай манеры і ў «рускай», уяўляюць сабою ўнікальныя ўзоры афіцыйнага мастацтва, якія выкананалі клясыкі расейскага жывапісу: Васьняцоў, Бруні, Урубель...

Сярод усяе архітэктуры Беларусі Пакроўскі сабор у Баранавічах застаўся найбуйнейшым помнікам нэаклясыцызму і самай значнай сакральнай пабудовай XX стагодзьдзя, давершанай у 1932 годзе.

Сяргей Харэўскі

У ПАПЯРЭДНІХ НУМАРАХ ПРАДСТАЎЛЕНЫЯ ТВОРЫ:

1. Фэрдынанд Рушчыц. Зямля
2. Мсьціслаў Дабужынскі. Віцебск, лесьвіца
3. Марк Шагал. Прамэнад
4. Ільля Рэпін. Беларус
5. Марк Антакальскі. Помнік Кацярыне
6. Віталь Бялыніцкі-Біруля. Блакітная капліца
7. Хаім Суцін. Паж
8. Казімер Малевіч. Чорны квадрат
9. Язэп Драздовіч. Пагоня Ярылы
10. Валянцін Волкаў. Менск, 2 ліпеня 1943 году
11. Манумэнт Перамогі
12. Помнік Леніну ў Менску
13. Пётра Сергіевіч. Шляхам жыцьця
14. Аляксей Глебаў. Францішак Скарына
15. Міхал Філіповіч. Бітва на Нямізе
16. Лявон Вітан-Дубейкаўскі. Касьцёл Пятра і Паўла ў Дрысьвятах
17. Лявон Тарасэвіч. Бяз назвы
18. Ян Булгак. Выгляд з Зарэчча
19. Іосіф Лянгбард. Менская Опэра
20. Аркадзь Астаповіч. Дворык
21. Клаўдзі Дуж-Душэўскі. Сьцяг
22. Прывакзальная плошча ў Менску
23. Жукоўскі. Інтэр'ер

грамафон.

Алесь Адамковіч

***

Менск.
На вакзале ў чаканьні.
Непразьмерная зьдзеклівасьць.
Рэалі жыцьця.
Індывіду няма —
Загнанае стада.
Нежаданьне змагацца.
Памерклае сонца
І адвернуты твар.
Суіснаваньне.
Беспадстаўнасьць адстойваньня.
Надзея праходзіць.
Лысыя твары.
Больш, чым тэатар.
Жыцьцё ў сьне, нежаданьне быць...
Падпарадкаванасьць сцэнарыя.
Страчаны час.
Крок у абсурднасьць.

Андрэй Аляксандраў

***

Кожны дзень —
гэта крок у няўтульную цемру,
Што мы маем зрабіць
найярчэйшым сьвятлом;
Кожны дзень
ёсьць працягам блуканьняў па шэрым
Нашым шляху,
размытым халодным дажджом;
Кожны дзень —
гэта бітва за Праўду і Веру,
Кропля часу,
што ёсьць нашым вечным крыжом.

Аляксандар Антончык

ЦЫГАН

Раз ехаў па міру старому
Вяльможа з-за мора багаты.
Як певень ён быў ганарлівы,
Задзірысты і зухаваты.

Пад ім быў пародзісты, жвавы,
З далёкай Аравіі конь,
У якога, як мчаў па гасьцінцы,
З-пад срэбных капыт біў агонь.

Заўважыў чужак краму зброі,
Пад'ехаў, ў ёй бачыць тавар:
Сякеры, булавы, кінжалы
І шаблі зіхоткі, як жар.

Узяўшы кальчугу, спытаўся
Пагардліва, зь зьдзеклівай сваркай:
Мяне ў амуніцы гэтай
Дзіця не праткне часам палкай?

Цыган, гандляваўшы таварам,
Змаўчаў на чужынцавы словы,
Бо ўбачыўшы дзіва-каня
Лішыўся на міг дару мовы.

«Скакун, я цябе не ўпушчу»,
Падумаў ён тут жа міжволі,
За гэта лішуся калі
Жыцьця свайго нават ці волі.

І кальчугу надзеўшы, сказаў:
«Вяльможа, ня трэба папрокаў,
Я стану мішэньню, а ты
Страляй у мяне за сто крокаў.

Праб'еш на мне досьпех, што выбраў —
Бяры усю краму з таварам,
А не — аддасі скакуна
Свайго варанога задарам».

І закрыўшы шаломам твар мужны,
Ён выйшаў і стаў ля таполі.
Вяльможа ж мяжу згодна спору
Правёў за сто крокаў у полі.

Маланкаю перша страла,
Мільгнуўшы, у руку папала.
І ўбок адляцеўшы са сьвятам
У дрэве магутным застрала.

Другая ж зьмяёю сьмяротнай
У грудзі дакладна ўпілася,
Але ж не прабіўшы жалеза,
Адскочыўшы, ў неба ўзьвілася.

І трэцьцю імклівую сьмерць
Жывая мішэнь напаткала,
Але ж гартаваная сталь
І цяпер сьмельчака ўратавала.

«Ну што ж, — чужаземец тут кажа,
Гандляр, ты ўзяў верх, малайчына.
Кальчуга ў цябе проста цуд,
А сам ты — адчайны мужчына».

І купіўшы праверааны досьпех,
Ён далей дарогай падаўся,
Цыган жа з канём прызавым
Шчасьлівы ля крамы застаўся.

Тацяна Багарадава

***

Пакуль жывем — датуль лятаем:
У думках хуткіх, уяўленьнях.
Зь нябёсаў важна пазіраем,
Лунаючы ў летуценьнях.

Жыцьцё складаецца звычайна
Зь дзьвюх гарманічных палавінак;
Мы ж бессэнсоўна і адчайна
Шукаем ісьціны прыпынак:

Няма вясны без паху бэзу,
Як і зімы без завірухі,
І паслухмяных — без гарэзаў,
І радасьці няма бяз скрухі.

Няма рэальнасьці без мрояў,
І прыгажосьці без пачвараў,
Сталоў вясельных — без напояў,
Каханьня — ды без акуляраў.

Спакою — без магутных вояў,
І звону грошай — без кішэняў,
І пастарункаў — без канвояў,
І стрэл Амура — безь мішэняў.

Няма пачатку без сканчэньня,
І перамог — без намаганьня,
Настаўніка — без тлумачэньня,
Дасьледчыка — без назіраньня.

І доўгага жыцьця — бязь сьмерці,
І катаваньня — без ахвяраў,
Зямлі — бязь вечнай кругаверці,
Юнацтва дзіўнага — бяз мараў.

Няма нябёсаў без палётаў,
І караблёў — без капітанаў,
І самалётаў — безь пілётаў,
І астравоў — без акіянаў.

Нарэшце, прыйдзем да высновы,
Бо лепей позна, чым ніколі, —
Як нацыі няма без мовы,
Так годнасьці няма бяз волі!

Няма паэзіі бяз крылаў,
І трапных вершаў — без натхненьня,
Няма фантазіі бязь ліры,
Як і задач без вырашэньня.

Без патасных і гучых словаў,
Бо толькі гэтым існуем,
Паўторым цьвёрда, як замову:
Пакуль лятаем — мы жывем!

***

Синий май, голубая теплынь...
С.Есенин

Месяц кветак і траў,
Калі з сэрца паэзія льецца...
Шэпат першай лістоты,
Чаромхавы водар наўкол.
Месяц гэты ў народзе таму яшчэ
Траўнем завецца,
Што ў квецені зелень захутвае дрэвы і дол.
І блакітная бездань нябес
Так падобна да колеру бэзу,
Што духмянай галінкай пастуквае
Ціха ў вакно.
Пазрывае пялёсткі няўрымсьлівы ветрык-
гарэза
І памкнецца ўдалеч, будзе будзе
Яго не чутно.
Сарамлівы хлапчук-дзьмухавец
На палянку зьбянтэжана вылез.
Хутка жоўты андарачак зьменіць на
Белы жупан.
Для сябе ён, напэўна, адзіную
Ісьціну вынес:
Так бывае ў жыцьці, што сягоньня —
падпанак,
А заўтра ты — пан.
Кукаваньне зязюлі сярод шматгалосага
лесу
Адбіваецца рэхам у кронах
Замшэлых ялін,
Абуджае пранізьлівы золак. Туману завесу
Разрывае. І робіць адлік хуткаплынных
хвілін.
Ціха крочыць вясна,
Лёгкі поступ яе непрыкметны,
Ізумрудныя россыпы шчодра кідае ўбакі.
Не у тонкі паркаль ці сацін непрыгожы,
Тандэтны,
А ў зялёны ядваб апранае прыроду штогод,
—
І так будзе ўвякі!

Тацяна Барысава

ДОЖДЖ

Буйнымі кроплямі дождж
Грукае ў вокны, прагне
Майго засмучэньня.
Струменьчыкамі, быццам
Іголкамі, упіваецца
Ў мае жылы,
Зьліваецца з крывёй
І зноў выпадае туманамі,
Пакідаючы нямую пустэчу
Чыста вымытага цела.

Аляксей Бацюкоў

***

Я звык жыць на халодным
Вастрыі нажа.
Я звык чуць, як жалобна
Мой сьпявае стажар.

Гэта цемра прабіта
Залатым сьвятлом зор.
Асалода заліта
Чорна-белым вінам.

Мы забылі, як горка
Будзе потым, і зноў
Чую я твае крокі
На шляхах сваіх сноў.

Аляксей Бруй

***

Запалі сьвятло, уключы тэлефон,
Пачні ўсё спачатку, адкінь гэты сон.

Але нехта стучыць у пустое вакно,
Ён ня хоча вады, ён хоча віно.

І ўбачыў я здань, але што мне з таго,
Што ўбачыць ён і хто ўбачыць яго?

Дым заглынае цела маё.
Патушыце сьвятло. Мы будзем удваіх.

Уладзімер Васількоў

КАМЭТА

Серабрыстая камэта на нябёсах
Дыямэнтам дзіўным зіхаціць,
Быццам сымбаль долі, сымбаль лёсу,
Ў цемру чорную стралой яна ляціць.

І ляціць яна нястрымна і імклівa,
І шукае нешта век ад веку
На сваёй бясконцай цёмнай ніве,
І глядзіць на побыт чалавека.

І глядзіць, як вольна крочаць людзі,
Думаючы, як ісьці далей, —
А яна ня думае, што будзе,
І плыве шалёна ўсё хутчэй.

Выбіраць камэце той ня трэба,
Бо свой вечны шлях ёй не зьмяніць,
І заўсёды па бясконцым небе,
Зьзяючы, камэта будзе плыць...

Аляксандар Голуб

ВАЯРЫ

Ваяры!
Прысягнуўшы на вернасьць
Сваёй маці-зямлі і народу свайму,
У сэрцах тоячы праўду і мужнасьць,
Паскакалі на сечу за продкаў зямлю.

Ваяры!
У змаганьні з навалай,
Што прыходзіла зь земляў чужых,
Веру ў моц да канца не гублялі
І стаялі насьмерць за сваіх.

Ваяры!
У слаўных бітвах
Пад Грунвальдам, Оршай
Перамогу крывёй здабылі;
Мужны Вітаўт і князь Астроскі
У тыя дні за сабой вас вялі.

Ваяры!
Узьнімалі «Пагоню» —
Сымбаль праўды і чысьціні,
На круганах, палях і гонях
За бацькоўскія хаты ляглі.

Ваяры!
Вашы подзьвігі жыць будуць вечна!
У нашых сэрцах вы — назаўжды;
Заставайцеся з намі навечна!
На зямлі сьвятой Белай Русі —
Будзьце ж з намі, як і былі!

Ала Кажэра

***

Чорны дзень мой,
А вытрымаць трэба,
Як здаецца, што валіцца неба,
І вакол толькі масак парад,

... Грэю рукі над лямпай настольнай,
Калі здрадніцкім шэптам няўмольным
Рвецца ў сто галасоў хлусьняпад.

Яўгенія Каляда

***

Мы адзін аднаго сустрэлі
у Галерэі Цьмяных Абразоў.
А ў цемры рыпелі арэлі,
і чакала зіма маразоў...

Таямнічая цемра — сьвядомасьць —
разгайдала Арэлі Спакусаў.
Агарнула мяне невядомасьць
незнаёмых магчымых прымусаў.

Мы адзін у аднаго закахаліся
у Галерэі Самотных Сардэц.
Сто разоў мы з табой сустракаліся,
сто разоў мы шукалі канец.

А ў цемры рыпелі арэлі,
і чакала сьвядомасьць навін.
Мы з табой, бы пажар, дагарэлі
у Галерэі Высокіх Ялін.

Мікола Building Кананович

***

Ж.

І дождж, і хвароба,
і твой тэлефонны званок...
Словаў так многа,
а я ў адзіноце прамок.
Узабрацца на крызыс
сілаў ужо не стае.
Стрыптыз пачуцьцёвы
папера ўвабрала,
бялеючы вабна
у лямпы настольным сьвятле.
Адлегласьць між вершам і мной
скарачаецца словам,
А кілямэтры між мной і табой
застаюцца дарогай,
размытай вясеньнім даждджом,
каранцінай маёю хваробай.
— Сумую, кахаю, прыеду, — кажу,
а з тэлефона гудкі
мае словы бяруць у двукосьсе,
і я ўжо ня чую —
Чакаеш калі? —
Але й з-пад крыжа,
мне здаецца,
прыеду ў госьці.

ВЭРСЫФІКАЦЫЯ ІСНАСЬЦІ

Я проста здаю ў архіў яшчэ адзін дзень,
Я проста здаю ў архіў яшчэ адну ноч,
Я проста жыву паміж явай і сном,
Уцякаю ад явы ў сон
І хаваюся ў яве ад сноў.
Рэчаіснасьць спрабуе дагнаць,
Існуе амаль побач са мной,
І тады мне хочацца спаць,
І тады мне хочацца сноў.
Ды будзённасьць лезе ў сны,
Перамешвае яву і сон,
Наводзіць між імі масты,
Дзе я — пасярод мастоў,
Дзе я забываю сябе,
Жыву не сваё жыцьцё.
Пакуль у натоўпе чужым,
Над безданьню, на мяжы,
Ахутае сонны дым —
І я застаюся, жывы,
Здаю ў архіў свой дзень,
Здаю ў архіў і ноч.
У снах праганяю лень
І ад явы крочу наўзбоч.

Зьмітро Каток

***

Зьніклі анёлы, пахаваліся;
Ды на самоце мой канае дзень
У рэчцы промні адбіваліся.
Ды не сагрэе сэрца больш прамень.

Думкі кудысьці разьляцеліся;
У рызьзі каханьня строі адыйшлі...
Гронкі рабінай разгарэліся,
Толькі зазьзяці вочы не змаглі.

Думаў пазбыцца...
Толькі ня змыла чорную тугу...
Ранак вясёлы прывядзе сьвятло,
Я ж сваю цемру выгнаць не магу.

Якуб Колапс

***

А маладосьць сыходзіць, як заўжды,
Як зь яблынь дым — жахліва незваротна.
І, каб паўсюль шукаць яе сьляды,
Трэ пэўна быць сапраўдным патрыётам.

Патрыятызм падобны на аргазм,
Што цягнецца гады у нэкрафіла:
Злучыцца! Зьліцца! Быць адзіным! Разам!
Так, як з бацыланосьбітам бацыла.

А маладосьць сыходзіць, як заўжды.
Яе вяртаць — што закупорваць дупу.
Таварыш, вер — ты станеш маладым!
Але ўжо пасьля таго, як трупам.

Яўхім Корчак

БЕЗЬ СЬЦЯБАЧКІ

Не махайце крываваю пугай,
Не сьцябайце спакойны статак —
Проста сёньня пастух «пад мухай»
І кіруе, о дзіва!, матам.

Паважаюць бычкі уладу,
Не кідаюць пустую пашу.
Трохі ўбок — і ўжо чуюць: «Гады!
Перарэжу усіх, мацер вашу!»

Авадні пад абед шалеюць,
І нясьцерпна смыляць пракусы,
Ды ня могуць бычкі, ня сьмеюць
Паддавацца вадзе спакусы.

Заварожаны грозным рыкам
Пяражоўваюць сумна жвачку.
... Значыць, можна вас, браце, крыкам,
Можна нават і безь сьцябачкі...

Ігар Крэбс

ДАБРАЗЫЧЛІВАЯ ПАРОДЫЯ

Паэтам-грамафонцам

«Атручана Радзіма-маці!
Мая зьнямелая айчына,
прымі сыноў адвечную даніну,
якую мы заўсёды плацім.
наш стогн табе мы ахвяруем,
сьлязьмі хай захлынецца вораг!
Пачварам мы замочым порах
і для сябе свабоду ўпалюем».

Я кожны тыдзень на стале
Знаходжу «Нашу Ніву»,
настаўнікаў сваіх пачціва
вітаючы, але...

Мне сьмешна бачыць
вершаванай прозу,
як і паэта, што прыняўшы позу,
пакуты сьмертныя прадбачыць.

Марыля Лагодзіч

***

Я адмаўляюся іграць такую ролю.
Жыцьцё — тэатр, бяздумная гульня,
і мы — акторы крыху, мімаволі...
Я адмаўляюся іграць такую ролю,
і маску скіну сёньня, не пасьля.

Я адмаўляюся казаць такія словы,
што робяць паслухмянымі людзей,
што хваляць нецікавых, выпадковых...
Я адмаўляюся казаць такія словы,
што сьведчаць аб прыкметнасьці падзей.

Я адмаўляюся насіць тае адзеньне,
якое сьніць праспэктная чарга,
каторым трызьняць прывіды і цені...
Я адмаўляюся насіць тае адзеньне,
што раіць постмадэрная пурга.

Я адмаўляюся ад веры ў ідэалы —
іх не бывае, гэта ўсё мана:
канцэртныя пляцоўкі, кіназалы...
Я адмаўляюся ад веры ў ідэалы,
іх век — узьнікнуць, а затым сканаць.

Ігар Лосік

ЛОША
(рака ў Гарадзенскай вобласьці)

Ад чаго ўцякаеш нетаропка?
Мо натхняе сьветач, гоніць змрок,
Бараніў свой край калісьці тут Касьцюшка,
Сыракомля раптам напісаў радок.

Ён, Яна маўчалі вельмі палка,
Варажыла лісьцем цішыня.
І лагодзіш, як матулі хатка,
На якой крычала бусьляня.

Андрэй Мельнікаў

ГАРОДНЯ. КГБ.
У ЧАКАНЬНІ ЧАРГОВАГА ДОПЫТУ

У чаканьні чарговага дапросу
На сафе сяджу ў КГБ...
Не дадуць ні шакаляд, ні папяросу —
Я пайшоў у адмову сам сябе.

Адмаўляю склад свайго злачынства —
Мне сумленьне выдала дазвол!
І таму так хораша і чыста
У душы: вось стаў бы — і пайшоў.

Ды сатрапы дзьверы зачынілі.
Ды «браслеты» на маіх руках.
Я сяджу. Перад вачыма — Чылі,
Пінaчэт, Альендэ, Хара, Бог.

М.Міхееў

***

Казёл знайшоў раз дзірку ў плоце
І апынуўся ў агародзе.
(Калі той плот там гарадзіўся,
Казёл на сьвет шчэ не зьявіўся).

Казла сусёдзі не чапалі,
Бо гаспадыню ўсе чакалі,
А тая, мабыць, была хвора,
Яе ня бачылі з учора.

А што яму, што там пудзіла,
Яно ж бяз рук, і не хадзіла.
Калі сабака забрахаў,
Ён галавою пamахаў,
І хоць згінаўся той у дугу,
Але сядзеў на ланцугу.

А што ня зьявіцца на ганку
З дубцом вялікім гаспадыня?
То не памогуць, мабыць, рогі,
Каб шчэ ня здрадзілі і ногі!

Аляксандар Пазьняк

***

Ірвецца кудысьці душа,
Імкнецца ў нябачныя далі,
Разьведаць усе рысы жыцьця
Спрабуе яна маладая.
Пытаньняў лес цёмны стаіць,
Адказаў — што дрэваў ў пустэльні;
Праменьчык надзеі мігціць,
Мігціць, а калісьці ён згіне.
Але ж яшчэ рана глядзець
У вочы сканаyньню свайму,
Пакуль маладкы — трэба пець,
Я аб жыцьці марыць хачу.

Юрась Півуноў

МАКСІМУ БАГДАНОВІЧУ

Ўжо так здараецца
Ў жыцьці у нашым часта,
Што лепшыя сыходзяць
У нябыт, у цемру першымі...
Бывае, толькі-толькі пачынае
Дарунак Божы — талент — расьцьвітаць,
Як раптам... сьмерць
Й сьцюдзёны жвір магільны...
Што застаецца? —
Творы, кнігі, словы...

***

Я народу свайму
Пець гасану ня буду.
Ды й навошта,
Калі ён сьляпы і глухі?
Лепш радзімай старонцы
Прызнацца ў любові
І пражыць свае дні ўсе
На гэтай зямлі.
Хоць «у гэтай краіне
Ня маю я волі»,
Але лепшай на сьвеце
Нідзе больш няма.
ТУТ Радзіма мая,
Мае дрэвы і гоні,
Маіх продкаў прытулак —
ВЯЛІКАЛІТВА!

Браніслаў Пяткевіч

МЯДЗЬВЕДЗІ

Магчыва, гадоў праз дзясятак
Лад зьменіць напрамак памкненьню,
Засядзе на покуць дастатак
І вылезе сонца з-пад ценю.
Гісторык згадае падзеі
Пра час наш даўгі, пераходны,
Як людзі ня мелі надзеі,
А слухаць ману былі згодны.
Дзяды й бабулі старыя
Раскажуць знаёмым, суседзям,
Як шчодрай рукой мімікрыя
Кідала падачкі мядзьведзям.
А тыя ляжалі ў бярлозе,
Глыталі з паперкай цукеркі,
Раўлі аб дабавачнай дозе
Для рота бяздоннага меркі.
А час ім аддаўшы патолю,
Ня стане ганебным дакорам.
Яны ж сустракаючы волю,
Схавалі глыбока свой сорам.

Гандрусь Стрэмка

***

Дыктуе дэкрэты дэбільны дыктатар,
Пікет разганяе амапавец-малпа,
Паперку страчыць ў «вэртыкаль»
правакатар,
І справу заводзіць гэбэшнік пракляты.

Ды нас не пужае ўся гэтая хеўра:
Хай пішуць, складаюць і робяць падшыўкі.
Мы вогнішча палім, каб вынішчыць цемру,
Каб згінулі гэтыя людзі-фальшыўкі.

Я веру: мы дойдзем да сьветлае мэты,
І стане наш край зноў свабодным і мудрым.
Тады ўжо, паверце, гадзюшнік мы гэты
Адправім дадому — ў маскальскую тундру,

Каб людзі ня дыхалі чорным смуродам,
Якім гэта зграя атруціла волю.
Мы станем найлепшым у сьвеце народам,
Сяброў сустракаць будзем хлебам і
сольлю,

І больш не дапусьцім мы, каб кіравалі
У нашай краіне дэбілы ды малпы.
І блізкімі стануць далёкія далі,
І вернемся мы на сусьветныя мапы.

Андрусь Сьнежань

1 ВЕРАСЬНЯ 1996 ГОДУ

Сьпіш? Ну й сьпі надалей,
калі хочаш прапасьці бяз сэнсу, бяз гуку.
Сьпі! Бо скончыўся дзень,
які ты праспаў над міскаю з бульбай!

Сьпі!!! Бо колькі ж будзіць,
крычаць, заклікаць, плакаць і абурацца!
Сьпі! Бо ўжо, можа быць,
запозна, браточак, табе прачынацца.

А прачнесься калі,
убачыш свой край без свабоды і песьні!!!
Сьпіш?.. Ну што ж, родны, сьпі...
Відаць, ты наўрад ці калісьці прачнесься...

Давыд Сьцізорык

ЗАБІЦЕ МАЦІ ПАЭТА

Забіце маці Паэта
Дзеля ягоных Твораў!

Забіце маці Паэта,
Сымбалем зрабіце яскравым
І шматбаковым люстэркам
Усяго мастацкага жаху.

Хай закрэсьліць ён лініі ў сшытку,
Бо радкоў яму будзе мала.
Зрабіце вайну нажывай
Дзеля Таленту. «Маці... Мама...»

Катаваньне зрабіце натхненьнем —
Дзеля Гісторыі гэта ня сорам.
... Забіце маці Паэта
Дзеля ягоных Твораў.

Зруйнаваць сьціплы сьвет і ўтульны
Многа лягчэй, калі гэта
Будзе тварам агульным.
Забіце маці Паэта!

Каб зышоў у роспач Геній,
Каб вершы ад болю складаліся,
Каб любоў сваю на паперу
Ён паклаў шэдэўрам нянавісьці.

Тацяна Сьцізорык

МЫ

Ува мне ёсьць Ніхто, у табе, бачу, Нехта.
Мой Ніхто баіцца твораў тваіх.
Дзеля жаху і Творчасьці — адзінае Пекла.
А гэта значыць, мы сустрэнемся Дзе і Калі.

Ува мне ёсць Ніхто. У табе, бачу, Нехта.
Дзеля шчасьця майго не хапае бяды.
Адчынена акенца на дваццатым паверсе.
А гэта значыць, ты будзеш маім назаўжды.

Ува мне ёсьць Ніхто. Калі яму здрадзіць,
Ён заб'е і цябе, і мяне. Нас Ледзь-Ледзь,
Бо гэты Ніхто мае нешта на ўвазе,
Але Нехта ня можа яго зразумець.

Алесь Шадрын

ЧАКАНЬНЕ ВЯСНЫ

Дрыжыць сьвятло ў паветры пачарнелым
І ты дрыжыш, сядзіш каля вакна,
Сядзіш ды бачыш, як па сьнезе белым
Дзяўчынка йдзе, як ты, зусім адна.
Зусім адна — самотная дзяўчынка,
Наяве сьніць адлігі блізкай сны;
Каля сьцяжынкі кволая галінка
Стаіць і прагне падыху вясны.
Вясны, вясны пяшчотнае дыханьне
Ужо чуваць скрозь стогны маразоў,
Яна ўжо йдзе з сусьветам на спатканьне,
Зьнішчаючы працяглы сон лясоў.
І па-за тым барвовым даляглядам
Ужо бруіцца плыні цеплыні,
А ты сядзіш ды стомленым паглядам
Чытаеш лёс у хвалях цішыні...

... Зіхоткі ранак блішча навізною,
Дзяўчынку захапляе цеплыня,
Галінка ачуняла, над зямлёю
Узьнялася насустрач зьзяньню дня,
Іскрыцца ранак веснавым праменьнем,
Зіма пабегла прэч, — каля вакна
Ты не сядзіш, — ляжыш ты пад каменьнем,
Вясны не дачакаўшыся, адна.

Натальля Шкапіч

БАЛЯДА ВОСЕНЬСКАГА ЧАКАНЬНЯ

Даруй, Каханьне, што Цябе чакаю
І рыску кожную цалую у журбе.
Палынам горкім сон свой зажыўляю
І, як магу, сьпяваю, схаваўшыся ў імгле.
А восень не пытае, прыходзіць і адходзіць,
Бяссонную надзею прыносячы з сабой.
Халодная расою на вуснах застывае,
Даждджом лістоты жоўтай карае нас з табой.
Балючы мой анёл, ты сэрца саграваеш,
Прычына ты пакуты і радасьці арган.
Як шлях нязьведаны, мяне ты спакушаеш.
Дазволь чакаць Цябе, таемны мой вулкан.



ЭПІКОН

Дзімка Дарохін

Жаласны чалавек

Апошнія летнія ночы ўжо былі вельмі халодныя. На станцыях рэдкія ліхтары выхоплівалі зь цемры разгубленыя дрэвы, якія раптоўна заўважылі, што прыйшла восень. Мой сябра і я вярталіся дахаты на апошняй электрычцы. Ехаць было амаль дзьве гадзіны, і каб прабавіць час, мы распачалі гуляць у дурня. Стаміўшыся за дзень, мы мэханічна кідалі карты, не запамінаючы, якія масьці выйшлі, а якія застаюцца на руках. Праз пару прыпынкаў у вагон увайшоў маленькага росту чалавек. На ім была старая балёневая куртка, месцамі разадраная і акуратна заклееная, запыленыя штаны і стаптаныя чаравікі. У руцэ чалавек трымаў палатняную торбачку, зь якой высоўваліся клапатліва заматаныя ў анучку галінкі парэчкі.

Вагон быў амаль пусты. Апроч нас, у канцы вагона сядзелі п'яныя дзецюкі ў скураных куртках. Яны пілі гарэлку і гучна лаяліся. Маленькі чалавечак з асьцярогаю кінуў позірк на гэтую кампанію і ціхенька падсеў на ўскрайку нашае лаўкі. Беражліва засунуўшы торбачку як мага глыбей пад лаўку, ён цяжкім рухам дастаў з кішэні зашмальцаваную насатку і з уздыхам выцер лоб.

— Які зараз час, не падскажаце, час які? — запытаўся чалавечак.

— Палова на адзінаццатую, — адказаў я, — які ў нас козыр?

— Чырва, ці не, чакай, хрэсьці, — адказаў сябра.

— Гэта атрымліваецца, — як бы пра сябе пачаў лічыць чалавечак, — дваццаць пяць хвілінаў... цягнік прыбывае... на тры хвіліны спазьняемся, — заключыў ён і нясьмела паглядзеў на сябра і на мяне.

— Ці будзеце гуляць з намі?

— Не, дзякуй, — ажывіўся чалавечак. — Я вось еду з дачы да Пухавічаў. Зараз восень пачнецца, працы будзе на гародзе, во-о-ох...

— Хто ходзіць? — запытаўся я.

— Ты.

— Дай папіць, калі ласка.

Сябра дастаў з сумкі літровую бутэльку з рэшткамі колы. Потым пустую бутэльку засунуў пад бок і разгарнуў свае карты.

— Хлопцы, дайце гэтую бутэльку мне, — жаласна, ціхай скарагаворкай прагаварыў чалавечак. — На дачу вады набраць, бо так вечарамі накапаесься, што смага... у нас калодзежу няма, а...

— Калі ласка.

Чалавечак хуценька ўзяў бутэльку і пачаў разглядаць чырвоную этыкетку. Ззаду нешта прараўло, і пачуўся звон стаканаў.

— Зараз цяжка, — загаварыў чалавечак. — У нашым ПМК заробак маленькі, праўда, плацяць у час. Хлеба з малаком купіў і больш за дзесяць тысячаў аддаў.

— Твая чарга, козыр хрэсьці.

— Валет.

— Вось раней добра было: паабедаць у сталоўцы — дваццаць капеек, а зараз паабедай за дваццаць капеек. Развалілі Саюз.

— Ну і добра, што развалілі, — прабурчэў я, забіраючы тузін шасьцёрак.

Чалавечак у зьдзіўленьні ўскінуў на мяне позірк. На нейкую хвіліну ён замаўчаў у недаўменьні. Мы працягвалі кідаць карты.

— А чаму вы кажаце, што добра, што развалілі Саюз?

— А таму, што нічога добрага не было, — уступіў у размову сябра, — нават кілбасы, а калі й была, дык чэргі стаялі па паўкілямэтры.

У гэты момант ззаду падняўся адзін зь дзецюкоў і, жахліва хістаючыся, накіраваўся да нашага сядзеньня. Ён падыйшоў да чалавечка і прароў: «Дай бутэльку, запіваць трэба!»

Чалавечак, здалося, ад жаху яшчэ больш змарнеў. Ён спужана сьцяўся, як кацяня перад сабакам, загнана кідаў позірк то на нас, то на п'янога. Зразумеўшы ўрэшце, чаго ад яго хочуць, чалавечак шпарка замармытаў: «А-а, бутэльку, бярыця-бярыця...» Ён здагадліва працягнуў бутэльку і ўжо асьмялелым голасам паўтарыў: «Бярыця, мне што, не шкада». Дзяцюк заграбастаў бутэльку і сыйшоў да сваіх.

Чалавечак згорблена сядзеў, склаўшы дрыжачыя рукі на каленях і ўтаропіўшы позірк на свае стаптаныя чаравікі. Ён нагадваў маленькага, безабароннага зьвярка, што толькі ўнікнуў небясьпекі, але ўсьведамляў сваю татальную бездапаможнасьць.

Я скоса пачаў назіраць за ім. Чалавечку было за пяцьдзясят. На твары ляжаў адбітак цяжкой і аднастайнай працы. Падбародзьдзе паскубленае тупым лязом. У вачах нічога, апроч безнадзейнай стомы.

— Станцыя Пухавічы, — абвясьціў рэпрадуктар.

— Ну, мне выходзіць, хлопцы, — ціха, амаль грудным голасам прагаварыў чалавечак. Ён цяжка падняўся і зьнік у тамбуры.

Якуб Колапс

ВАЛАСЫ

... пад сярпом тваім.

З клясыкі.

Спачатку валасоў не было ўвогуле. Яно нават не адразу паверыла, пабачыўшы даўгі русы волас са сьлядамі даўняй фарбы на сваім пісьмовым стале. Яно нават не надало таму ўвагі — проста зьдзьмула недарэчную драбніцу, пасунула да сябе настольную лямпу і пабачыла на абажуры волас, падобны да першага. Яно накіравала гэты волас за сабратам, але на аркушы паперы знайшоўся трэці, зь лёгкай сівізной на канцы. Яно паспрабавала змахнуць яго рукой, ды няўдала — волас прыліп да далоні. Рука была потнай пасля нядаўняй вячэры, і яно пайшло мыць яе.

На дзьвярах у ванны пакой трапятаў наступны волас — брудны і скамечаны. Яно акуратна зьняло яго пазногцікамі і кінула на падлогу. А на падлозе ўжо ляжалі валасы — рудыя, сівыя, блакітныя... Яны былі і ў ванным пакоі — на люстэрку, чарупіне, на гелях, шампунях, зубных шчотках, на ручніках і ў самой ваньне. Яно паспрабавала іх змыць, але зьліў адразу забіўся мокрымі, брыдкімі валасамі. Ад вады валасы разбухлі й хутка пачалі пакрывацца цьвільлю. Яно ў жаху выскачыла з ваннага пакою і, топаючы нагамі па засьмечаным валасамі калідоры, кінулася на кухню па запалкі. На кухні валасы ўжо акупавалі ўсе паверхні: падлогу і стол, падваконьне і лядоўню, шафу і газавую пліту.

Валасы, маленькія і шурпатыя, былі і ў карабку ад запалак. І ў другім карабку. І ў трэцім. Яно сутаргава схапілася за сэрца і там, у нагруднай кішэні, адчула запальнічку.

Пырснуў агеньчык. Даўка запахла паленымі валасамі. Спужаўшыся, што задыхнецца ў чадзе, яно чапнула імбрык і прынялося ліць навокал, на валасяное вогнішча, потым, адно за адным, выплеснула туды зьмест рандэлкаў, затым, мяркуючы знайсьці яшчэ нейкі посуд з вадкасьцю, адчыніла лядоўню.

Уся лядоўня была забітая мерзлымі валасамі. Яно ў адчаі захлопнула лядоўню і пачало затоптваць рэшткі вагню нагамі. Гарэлае валосьсе чаплялася за лыткі, казытала сьцёгны, паўзло вышэй... Валасы сыпаліся са сьцен і столі, перасоўваліся па ваконным шкле, злавесна віравалі ў паветры.

Яно зь сілаю выпхнула сябе зь небясьпечнае кухні і скачкамі, штурхаючы валасы направа і налева, кінулася па калідоры да выхаду.

Раптам нешта прымусіла яго спыніцца.

Наперадзе, пераліваючыся, зьзяла вялікая, пажадлівая, гідкая пашча. Яна напружана пульсавала, імпэтна клікала да сябе дрыготкімі, рытмічнымі вібрацыямі неахайнай валасістай паверхні.

Яно з апантанасьцю кінулася да пашчы і ўваткнулася, укруцілася, увагнала сябе ў яе з усёй нянавісьцю, на якую было здольнае ў гэты момант...

Дзеяньне скончылася.

Вольга Колас

УРБАНІСТЫЧНАЕ АТАЧЭНЬНЕ

Жыцьцё ледзяша, прымацаванага да пад'езнага брыля, атрымалася такім кароткім. Ён хутка падужэў і з простае сьпіцы, нанізаўшы на сябе ледзяныя бранзалеты, ператварыўся ў статную перавернутую піраміду. Прыгажэў ён пры сонечным сьвятле, і нават тады, калі сонца адпачывала за хмарнасьцю неба; магутны, непаўторны, убіраў у сябе розныя адценьні навакольнага сьвету. Аднак пасьля ён згубіў усе свае бранзалеты.

***

«Хуткая дапамога» стаіць ля нашага пад'езда. Некаму да зьнямогі дрэнна, боль не праходзіць без умяшальніцтва мэдыкаў. Некаму заўсёды дрэнна, зараз, потым. «Хуткая дапамога» —прыкмета болю. Цёплы вечар. Кабіна шафёра асьветленая. Чалавек сярэдніх гадоў бачны як на экране. Ён піша. Чаму яны так часта пішуць, лекары і нават іхныя шафёры? Куды дзяецца пасьля непатрэбная пісаніна? Хваробы, а магчыма і чалавека ўжо ня будзе, а зьвесткі пра разлад арганізму застануцца.

***

На мосьце знаходзісься вышэй да неба, і калі гэта час захаду сонца, можаш больш поўна назіраць яго. Калі табе перашкаджае шум аўтамабіляў і цягнікоў, бо знаходзісься ты ў цэнтры гораду, прыцісьні далоні да вушэй і толькі глядзі ўдалечыню — наперад. Урбанізаванае, шумнае, недасканалае жыцьцё і вечны, спакойны захад.

***

Гадзіньнік надакучліва б'е цішыню. Чуеш, як паштальёнка апускае газэты і капэрты ў скрыні. Пайду пагляджу. Можа, пра нас нехта памятае. Не, сёньня зноў няма лістоў, як не было іх учора і пазаўчора. Сьвет вялікі, аднак часта ён абмяжоўваецца працай, крамамі — паўсядзённымі патрэбамі. Людзі часта забываюць пра людзей і ня маюць патрэбы ў падтрыманьні старога сяброўства.

Заўсёды маю спадзяваньне, што ўбачу чаканы ліст заўтра...

АСЭНСАВАНЬНЕ ЧАСУ

Часам папракаю сябе за ляноту, аднак адных папрокаў мала. Гэта ўсё адно што сто разоў напісаць на паперы: «я абавязкова выканаю гэта», але няўжо што-небудзь... зьменіцца? Я баюся часу. Ён такі імклівы і мне страшна не пасьпець заўважыць нешта важнае, не зрабіць крок у жаданым кірунку. Цяжка пасьпець рэалізаваць хоць частку сваіх магчымасьцяў.

***

Як часта кажуць: у канцы XX стагодзьдзя. І ўжо сталася банальным ужываць падобнае словазлучэньне. Дарэчы, ня важна, калі мы жывем і мусіць дрэнна, што жыцьцё неяк вымяраецца, лічбамі-гадамі. Спакайней бы жылі бязь лічбаў. Штодзённа лічым, як машыны. Як пагоршылася ў гэтым пляне жыцьцё чалавека і як наогул зьменшылася, амаль зьнікла каштоўнасьць жыцьця.

Цяпер шмат людзей, якія ня думаюць (у сэнсе не займаюцца рэфлексіяй), а толькі існуюць. І невычэрпна жыць сярод раўнадушша, калі маеш патрэбу ў сяброўстве і шанаваньні цябе як адметнай асобы і ў прызнаньні тваёй своеасаблівасьці і непаўторнасьці. Ты будзеш толькі раз, аднойчы, у кароткі пэрыяд, імгненьне, і больш ніколі... Разуменьне гэтага прыгнечвае і ўзносіць нас.

***

Стаўлюся з пагардай да схільнасці к пэсымізму і выкліканага ім сябешкадаваньня. Апошняе сьведчыць пра чалавечую слабасьць. Паглыбляесься, не... адмяжоўваесься ад рэчаіснасьці і сканцэнтроўваесься на ўласным, актуальным толькі тады, болю. Сьвет мяняе колеры, робіцца скрайне непрывабным. Здаецца, што рухацца далей бессэнсоўна — усё, што ні зробіш, не прынясе ніякай карысьці, ані задавальненьня, але і заставацца на прыпынку жахліва.

Алесь Менскі і Кася

АДЗІН ДЗЕНЬ

Чацьвер. 21.00

Ды што гэта за кава... Дрэнь нейкая, ды яшчэ ў гранёнай шклянцы.

Я сядзеў у невялічкім бары ўнівэрсаму «Рыга» ды марна намагаўся ўліць у сябе колькі глыткоў брыдкага напою. Нарэшце я стомлена адкінуўся назад, заплюшчыў вочы ды пачаў прыслухоўвацца да размовы двух хлопцаў ззаду.

Гэта, канешне, не зусім этычна, але што, прабачце, можна было рабіць яшчэ? Тым больш, хлопцы гаманілі па-беларуску.

— Не, не дуры мне галаву сваімі байкамі, Міхась, — казаў адзін зь іх.

— Ды я кажу табе як чалавеку: гэта магчыма, — цягнуў іншы занудлівым голасам.

— Я ведаю, што гэта было магчыма шэсьцьсот гадоў таму. Калі Вітаўт не прайграў бітву на Ворскле — тады так. Усё было па-іншаму.

— Усё будзе па-іншаму, Віталь. Што мы ведаем зараз: ход і зыход бітвы. Дык чаму б ня даць Вітаўту ведаць пра іх? Мо ён зробіць сякія-такія высновы і пераможа Цемір-Кутлука ды ўмацуе Княства яшчэ больш. Мо й мы тады ня будзем сядзець у гэтым ідыёцкім месцы ды цісн уць галаву ў плечы?

— Але, Міхась, прыгадай наш колішні экспэрымэнт з часам...

Размова набывала яўна правакацыйны характар. Па ўсім відаць, хлопцы зразумелі, што я прыслухоўваюся да іх ды вырашылі строіць жарцікі. Так і не дапіўшы каву, я выйшаў з унівэрсаму. На мяне патыхнула водарам веснавое гарадзкое вуліцы. Недзе за тралейбусным дротам сьвяціўся надпіс «Беларусьбанк». «Ужо дабудавалі», — падумаў я і рушыў дадому.

Чацьвер. 21.00

Не, гэта ўжо занадта. Содавая зусім выдахнулася, а ільдзінкі ў ёй даўно расталі. Я не зьбіраўся піць гэтую вадкасьць і міжволі агледзеўся па баках.

У невялічкай забягалаўцы пад незразумелай назваю «Alligator's Bar» было тлумна, як і ў кожным бары ў цэнтры Бостану. Публіка тут была, мякка кажучы, ня вельмі. Асабліва шмат было розных тыпаў з напаўлегальнага Таварыства ангельскае мовы ды іншай набрыдзі.

Маю ўвагу прыцягнула даволі гучная размова двух хлопцаў за суседнім столікам. Я ня ведаю, пра што яны размаўлялі, бо так і ня вывучыў ангельскае мовы. Аднак імя Вітаўта, бітва на Ворскле ды хан Цемір-Кутлук узгадваліся ледзьве ня ў кожным сказе. Але каму патрэбная тая ангельская мова, акрамя купкі дасьледчыкаў-энтузіястаў з абражаным гонарам? Я, па шчырасьці, і ня думаў, што на ёй нехта яшчэ размаўляе.

Калі я выйшаў з бару, горад віраваў, як заўсёды. Недзе далёка ўгары сьвяціліся літары «Беларусьбанк». «Ужо дабудавалі», — падумалася мне.



Юрась Півуноў

1994. ПРАСЬВЯТЛЕНЬНЕ

... Імкліва несучыся па горнай рацэ жыцьця, часам няма калі бывае нават на хвіліну прыпыніцца ў бясконцым бегу дзён, падумаць пра вечнае...

І толькі цяжкая хвароба, што на месяцы, а то й гады, пазбаўляе магчымасьці актыўна кантактаваць з навакольным сьветам, вырывае цябе з гэтае шалёнае плыні быцьця.

Вось тады й ёсьць час падумаць аб сапраўднай вартасьці тых рэчаў і людзей, што вакол цябе. Менавіта тады й праяўляецца часьцей за ўсё сапраўднае аблічча навакольнага.

Адразу становіцца бачна, хто сябра табе, а хто — так, знаёмец. Нечакана адкрываеш для сябе, што, нягледзячы на тваю амаль незаменнасьць (безумоўна, толькі ўяўную) на працы, ніхто не дадумаецца наведаць цябе, а часам і хаця б проста затэлефанаваць. Цікавіць толькі твая здольнасьць да працы (і тое, калі ты здолееш вярнуцца да яе). Тваё ж здароўе, па вялікім рахунку, стан душы мала каго цікавяць.

Пры ўсёй бачнай незайздроснасьці гэткага становішча, ёсьць, на маю думку, тут вялікі «плюс». Бо ёсьць час пераасэнсаваць пражытае, паразважаць, як жыць далей.

Шмат хто, вярнуўшыся пасьля доўгага перапынку да актыўнага жыцьця, становіцца літаральна ІНШЫМ чалавекам. І зьяўляецца думка: а ці не адмыслова гэта робіцца? Можа, тая цяжкая хвароба, тое насланьнё даецца табе Богам, каб задумаўся ты: «Ці так я жыву? Навошта я жыву? Дзеля чаго нарадзіўся на гэты сьвет?» І робіць гэта Ўсявышні-Збавіцель, каб сапраўды ЗБАВІЦЬ ад згубы духоўнай, а мажліва й фізычнай, спыніць ля краю бездані?

.. ТОЙ год быў цяжкім для мяне. Памерла шмат родных ды блізкіх мне людзей. Нават прыходзілі думкі пра нейкую фатальнасьць лёсу свайго роду (ці награшылі зашмат?), хацелася, каб страшны той год хутчэй скончыўся...

Урэшце, здарылася гэтак, што я й сам на апошнім месяцы таго чорнага году ледзь не разьвітаўся зь зямным жыцьцём...

Цяпер, пішучы гэтыя радкі, я ўдзячны Богу, што, паслаўшы мне цяжкое, сьмяротнае выпрабаваньне, ЁН збавіў маю душу. Чаго абдумаўшы, я стаў іншым. Я ўжо ня той, што быў...

АВАНТУРЫ ЯГО ЖЫЦЬЦЯ

Рысы да партрэту генэрала Хадзькевіча

Я, сын Фартуны, заўсёды шчасьлівы!
Зь ліста Ігнація Хадзькевіча да Яна Генрыка Дамброўскага

Ёсьць па кім вочы выцірацЬ! Тып, які ў Рыме зганьбіў сябе й Легіёны, як зграю барбараў, бліскануў на сваёй Бацькаўшчыне такой жа пышнасьцю!
Вацлаў Бэрэнт

Аднойчы я натрапіў на газэтны артыкул, дзе гаворка ішла аб апошнім навуковым адкрыцьці дасьледчыкаў з Дэлавэрскага ўнівэрсытэту ў ЗША. Было выяўлена, што людзі, схільныя да празьмернай рызыкі, у літаральным сэнсе зробленыя зь іншага цеста. Біяхімічны склад актыўных рэчываў у іх мазгу адметны ад нормы, што дазваляе адчуць ня жах, а эйфарыю. І чым вышэйшыя стаўкі, тым большае захапленьне апантанага. Кара галаўнога мозгу вылучаецца павышанаю трываласьцю...

У нашае гісторыі заўсёды хапала людзей зь «іншага цеста», асабліва ў XVIII ст. Я адчуў, што трохі наблізіўся да разуменьня нутраной прыроды гэтых людзей. Быў атрыманы штуршок да больш дэталёвага разгляду фэномэну.

Ігнаці Хадзькевіч (ён жа Ходзькевіч, Хадзкевіч, Хацкевіч. Ён жа граф Дэнгоф. Ён жа генэрал Лядаіска, ён жа «гулец», ён жа «шулер»), беларускі шляхціц. Каронны гвардзеец, капітан грэнадзёрскага Сібірскага палку князя Дашкава, удзельнік штурму Ачакава, падпалкоўнік войскаў Вялікага Княства Літоўскага, генэрал-ад'ютант пры штабах францускіх генэралаў-аншэфаў Шампіанэ і Масэны, кавалер Ордэну Ганаровага Легіёну, удзельнік Вялікае францускае рэвалюцыі і паўстаньня 1794 г. у Рэчы Паспалітай, расейскі і францускі шпіён, шэф паліцыі Нэапалю, шэф звышштатнага кавалерыйскага эскадрону ў польскіх Легіёнах, палітвязень, шулер найвышэйшае клясы...

ЧАСТКА 1

Поўнач Расеі. Зімовая пахмурная раніца 1823 г. Карчма ў ваколіцах Вяткі. Паклаўшы галаву на стол, паўляжыць чалавек. Побач пачатае вядро гарэлкі... Судовы прыстаў канстатуе сьмерць сасланага літоўскага шляхціца Хадзькевіча ці Хацкевіча, ці як яго там яшчэ?! Пры магчымай спробе зьбегчы... А ўвечары, праклінаючы надвор'е, дарогі і ўсё вакол, прымчаўся фэльд'егер з ужо непатрэбным Найвышэйшым дараваньнем.

Што нам сёньня з таго, што недзе калісьці памёр нейкі шляхціц — ці мала іх памірала? Ці дзіўна, што аддаваў сваю шаблю направа й налева? Не. Для тых часоў цалкам натуральная рэч. А між тым, перад намі — чалавек-легенда, адзін з апошніх вялікіх авантурнікаў XVIII стагодзьдзя.

I. РАДАВОД

Радавод ягоны нічым асабліва не вылучаўся з соцень падобных, што можна ўбачыць у гербоўніках літоўскае ці каронпае шляхты. Паходзіў з заможнага дому гербу «Касьцеша» з мсьціслаўскага ваяводзтва. Першым значным учынкам у жыцьці нашага героя была падробка ўласнае мэтрыкі — дзеля таго, каб хутчэй увайсьці ва ўладаньне спадчынай, якая засталася пасьля сьмерці бацькі Людвіка, віленскага земскага судзьдзі. Таму цяжка сказаць дакладна, калі Ігнаці зьявіўся на сьвет. Генрык Масьцiцкі лічыць прыблізнаю датай 1760 год.

II. ЮНАЦТВА НА ТЛЕ ЗАКАТУ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Нядоўга малады пан Ігнаці заставаўся спадчыньнікам — усё багацьце прагуляў ды спусьціў за зялёным столікам. І тым хутчэй прайграваў, чым больш уладаньні абрасталі даўгамі. Гэта быў усяго толькі кошт за навуку. Набывалася нешта, на яго погляд, куды больш важнае за бацькоўскія маёнткі — непераможнасьць у картах.

У пошуках багатага пасагу ўзяў шлюб з Кацярынай Вільгастоўскай, ад якога нарадзіліся два сыны. Старэйшы стане палкоўнікам у расейскім войску, а малодшы — пісьменьнікам і вучоным.

Любоў да бляску і зьнешніх эфэктаў падказвала ісьці ў войска. Нядоўга прабыўшы ў шэрагах каронпае гвардыі, прытулку для злачынцаў і падонкаў, зразумеў, што падвышэньня па службе лепш шукаць у Расеі.

III. ГЕРОЙ АЧАКАВА

Паступіў у Сібірскі грэнадзёрскі полк князя Ачакава. І прыняў удзел у вайне з туркамі. Ягоная сьмеласьць пры штурме Ачакава ўразіла старэчу Суворава. Атрымаў крыж і званьне капітана.

Вайну скончылі. Аднастайнае жыцьцё ў залоге зусім ня вабіла. Падаў у адстаўку і рушыў у падарожжа па Эўропе.

IV. «ХАДЗЕМА, ШАНОЎНАЯ ГРАМАДА!»

У Парыж прыбыў своечасова. Пачыналася Вялікая рэвалюцыя... «Хадзема, шаноўная грамада!» — гаркнуў Хадзькевіч і павёў уласны, хутка зьлеплены аддзел санкюлётаў пад сьцены Бастыліі. Але цяжка было доўга заставацца ў гушчары падзеяў і ня трапіць пад аўстрыйскія кулі ці пад сякеру гільятыны. Не рызыкнуў, тым больш, што дома цяпер рабілася ня менш цікавае.

V. ДОМА

З траўня прынялі Канстытуцыю. Тыя, хто былі незадаволеныя пераменамі, абапіраючыся на расейскія штыкі, стварылі канфэдэрацыю ў Тарговіцы. У кампаніі 1792 г. удзелу ня ўзяў, а сябраў меў з абодвух бакоў. Працаўнікі новага ладу не перамаглі.

VI. ХАДЗЬКЕВІЧ І ЯСІНСКІ

У 1793 г. пан Ігнацы пераехаў у Вільню, дзе разьвёўся з жонкай, адкрыў уласны ігорны дом ды ўступіў у шэрагі змоўнікаў. Тады ж, за картамі, ці раней — невядома, пасябраваў з кіраўніком літоўскіх патрыётаў палкоўнікам інжынэрыі Якубам Ясінскім. Не падазраваў палкоўнік, што для Хадзькевіча ўся канспірацыя была толькі забавай ды жартамі, а то, верагодна, упісаў бы прозьвішча сябра ў сотню-другую тых, каго трэба было б павесіць «дзеля выратаваньня мільёнаў». Ясінскі робіць пана Ігнацыя сваім ад'ютантам і надае званьне капітана войскаў Вялікага Княства Літоўскага. Некаторыя гісторыкі лічаць, што Хадзькевіч ужо тады быў на службе расейскага выведу.

Уначы з 22 на 23 красавіка 1794 Ясінскі на чале 240 жаўнераў абяззброівае ў некалькі разоў пераважаючую па колькасьці расейскую залогу. Праз два дні ён адпраўляе Хадзькевіча да Касьцюшкі са зьвесткамі пра паўстаньне ў Літве і пакараньне сьмерцю здрадніка гетмана Касакоўскага. Хадзькевіч прывёз Ясінскаму патэнт генэрал-лейтэнанта, а для сябе 11 жніўня дамогся эпалеты падпалкоўніка.

У канцы лета сытуацыя значна пагоршылася. Якуб апынуўся на другіх ролях, а Вільня пала 12 жніўня. Усё кацілася ў бездань.


VII. ПАН ТАДЭВУШ ПАКУТУЕ Ў ПЕТРАПАЎЛАЎСКАЙ КРЭПАСЬЦІ, А ПАН ІГНАЦЫ Ў ТУРЭЦКАЙ ПРАВІНЦЫІ

Пасьля падаўленьня паўстаньня быў арыштаваны расейцамі, як лічыў Масьціцкі, толькі дзеля выгляду, і як ваеннапалонны сядзеў у Пагрэбішчах, узяты на парукі Адамам Жэвускім, адкуль хутка зьбег, чым зрабіў гаспадару шмат непрыемнасьцяў.

Аб'явіўся на турэцкай тэрыторыі ў малдаўскага пашы Пасвана-Аглу. Хадзькевіч з цяжкасьцю трывае вымушанае знаходжаньне ў Малдове. «Туркі ні ваяваць ня ўмеюць, ні гуляць у карты», — гаварыў ён. Так і пакутаваў да траўня 1797 г., пакуль Павал I ня выпусьціў на волю Касьцюшку, а зь ім усіх, хто здолеў уцалець.

VIII. ЗА МАЛДАЎСКІМ ПАСТОМ - РАЙ У КАНСТАНЦІНОПАЛІ

Прыехаў у Вільню і прынес прысягу новаму імпэратару. Калі дагэтуль гісторыкі толькі дапушчалі, што быў шпіёнам, то цяпер гэта ні ў кога не выклікае сумневаў. Пасьля Вільні прамільгнуў у С.-Пецярбурзе (магчыма, атрымліваў інструкцыі), і зноў у Турэччыну, з таямнічай дыпляматычна-шпіёнскай місіяй.



На гэты раз у куды больш вясёлае месца — Канстанцінопаль. Рэзыдэнт Хадзькевіча амбасадар барон Качубей уводзіць яго ў вышэйшы сьвет сталіцы. Гэты было тое ж, як прывесьці ваўка ў аўчарню. Ардэнаносныя прафэсіяналы ад палітыкі, пераможцы бітваў на сушы і на моры, на зялёным сукне несьлі сакрушальныя паразы ад падпалкоўніка Хадзькевіча. Больш за ўсіх не пашанцавала партугальскаму консулу Лябрашу. На наступны дзень пасьля ад'езду «расейскага дыплямата» ўвесь Стамбул ведаў, што ён прыхапіў з сабой і жонку консула...

IX. LEGION DES FRANCE DU NORD

Карэта імчала каханкаў у Францыю. Якабінскі тэрор зьмяніўся смутнаю адлігаю Дырэкторыі. Па старой памяці наведаў Парыж. Колькі зьмянілася за гэты час! Дзе ажыўленьне 1789 году? Рэвалюцыя, патрабуючы абаронцаў, ачысьціла вуліцы. Там, на ўскраінах Рэспублікі, цяпер кіпіць сапраўднае жыцьцё. Пра гульню ў карты — бадай, адзінае крыніцы паступленьняў, — не было й гаворкі — усе ў войску. Хадзькевіч для м-м Лабраш грошаў не шкадаваў, так што першы раз у жыцьці апынуўся перад пагрозай арышту за даўгі. Як сапраўдны кавалер, ён ня мог кінуць жанчыну і ўцякчы з гораду. На шчасьце, здолеў угаварыць крэдытораў пачакаць. Вопытнаму афіцэру занятак знайшоўся хутка. Выступіў на чале батальёну супраць Вандэі. Добраахвотніцкі Паўночны Легіён Хоха стаў на той момант ягонай «Бацькаўшчынай». Граміў раялістаў і пра сябе не забываўся — цягнуў цэлы абоз нарабаванага антыкварыяту, каштоўных строяў ды іншых прадметаў раскошы. Крэдыторы засталіся задаволеныя.

X. ХАДЗЬКЕВІЧ І ЛЕГІЁНЫ

А ў гэты час легендарны генэрал Ян Генрык Дамброўскі пачаў ажыцьцяўляць вялікую справу, пра якую марыў яшчэ падчас II падзелу Рэчы Паспалітай. Дырэкторыя, якая ваявала амаль з усёй Эўропай, дала дазвол на фармаваньне ў Італіі за францускія грошы г.зв. Польскага Легіёну з грамадзянаў былых Кароны і Вялікага Княства, што змагаліся ў аўстрыйскім войску і трапілі ў палон пад Мантуяй.

Хадзькевіч і Легіёны... Калі ён зьявіўся на іхнім небасхіле, яго грэнадзёрская постаць на імгненьне засланіла Дамброўскага і ня менш магутнага Карла Князевіча, узьведзенага Касьцюшкам у генэралы на полі бітвы. Прамільгнуў хутка, як зьнік, але й гэтага было дастаткова, каб прымусіць Эўропу глядзець на легіёны як на гэткую ж супярэчлівую зьяву, якой быў сам.

У Хоха праваяваў нядоўга. У карты гуляць ізноў не было з кім, а агрaмадны абоз станавіўся цягнуць усё цяжэй і цяжэй. Сышоўся зь Пятром Малешаўскім, па словах Масьціцкага, таксама асобай цёмнай, і праз яго пазнаёміўся з самім Полем Барасам. Па пратэкцыі апошняга перанесься да Італіі. Уладкаваўся ў Рыме. На Віля Баргезэ адкрыў шыкоўны ігорны дом.

Ня ў стане доўга знаходзіцца ўдалечыні ад ваенных прыгодаў, выказаў жаданьне ўступіць у Легіёны. Дамброўскаму і так хапала падазроных постацяў, а перэтвараць здаровае цела свайго войска ў Легіён іншаземцаў не хацеў. Хадзькевіч зрабіў свае захады. У адзін зь дзён генэрал Макдональд выклікае Князевіча: «Мой генэрал, прыемна мне адчуваць дух, які між вамі пануе; выйшаў толькі што ад мяне афіцэр (яшчэ зь непрызначаных), мае доказы, што служыў падпалкоўнікам, хоча з намі ісьці як падпаручнік, просіць толькі аб тым, каб яго хутчэй прызначылі, а ён яшчэ роту сваім коштам апране. Як мага хутчэй, бо часу ня маем, таму прашу генэрала прызначыць яго зараз жа». Князевіч толькі выляяўся пра сябе, але нічога рабіць не заставалася. Трэба заўважыць, з французамі Хадзькевіч адну мову знаходзіў куды прасьцей і хутчэй, чым зь землякамі. Меў сябраў і добрых знаёмых сярод генэралаў: Шампіянэ, Макдональда, Жубэра, Масэны, Маро, Бэрнадота (гаварылі, Банапарт таксама заўважыў літоўскага падпалкоўніка). Праз некаторы час пачаў шукаць хады па атрыманьні шэфаўства над усёй кавалерыяй. Дарэмна. Для кіраўніцтва Легіёнаў ён быў у першую чаргу проста авантурнікам і драпежнікам. Раззлаваны, пачаў плесьці інтрыгі супраць Дамброўскага і Князевіча, павуціньне якіх разарваў выбух Нэапалітанскае вайны. З усіх бакоў на Рым рушылі аўстрыйцы, расейцы, нэапалітанцы. 8-мітысячная франкапольская залога сьпешна пакідала горад услед за 80 тысячаў генэрала Мака. Дзе ўжо тут да высьвятленьня адносінаў!

XI. ХАДЗЬКЕВІЧ, ШАМПІЯНЭ Й «ЗБАЎЧЫЯ ЛЁЗУНГІ РЭВАЛЮЦЫІ»

... Як толькі чуў звон шабляў, адразу ж кідаўся ў гушчар бітвы. Шампіянэ адзначыў «ільвіную адвагу» ліцьвіна і прыстроіў пры сваім штабе. Па войсках пайшла чутка, што ў адной з сутычак, калі генэрала-ншэфа абкружылі аўстрыйцы, Хадзькевіч адным ударам палаша зьнес галаву найвялікшаму з атакаваўшых драгуну. Пасьля гэтага выпадку для Шампіянэ стаў у адной асобе ад'ютантам, целаахоўнікам, памочнікам па асобых (і далікатных) даручэньнях, проста сябрам. Патуранькаў для сябе не рабіў, а кулі не выбіраюць — пад Ітры быў цяжка паранены...

На чале двух батальёнаў узяў Мандові, за што, як пісаў граф Жэвускі, атрымаў генэральства (іншыя крыніцы не пацьвярджаюць). Прагны і амбітны Шампіянэ ня супраць павялічыць сваю маёмасьць за кошт працаўніка, у чым знаходзіць падтрымку ўлюбёнага ад'ютанта. Аднойчы, пасьля таго, як вораг замардаваў параненых у францускім лязарэце, Хадзькевіч выступіў дабраахвотнікам на чале карнае экспэдыцыі. А калі нехта запытаў яго, куды рушыць, адказаў з уласьцівым яму цынізмам: «Маю загад даць асьвету мясцовым жыхарам, каб здольныя былі да прыняцьця свабоды, якая іх чакае» ці, як у Бэрэнта — «збаўчых лёзунгаў Рэвалюцыі». Мястэчка Маяна, побач зь якім ляжаў няшчасны лязарэт, пайшло

дымам, а ўсё, што было вартае паратунку — рабавалася.

... Дамброўскі і Князевіч з занепакоенасьцю назіралі, як шматлікія справы Легіёну цяпер залежалі ад падтрымкі Хадзькевіча.

XII. ГЕНЭРАЛ ЛЯДАІСКА, ШЭФ ПАЛІЦЫІ НЭАПАЛЮ

Аправіўшыся ад першых паразаў, французы дзень за днём прыводзілі хаўрусьнікам доказы свайго ваеннага мастацтва, народжанага свабодай Рэвалюцыі. У студзені 1799 здабылі Нэапаль. Хадзькевіч настолькі добра спраўляўся з абавязкамі, асабліва ў частцы трафэяў і кантрыбуцыяў, што Шампіянэ не знайшоў лепшай кандыдатуры на пасаду шэфа гарадзкой паліцыі. Галоўны паліцэйскі вельмі нагадваў героя з опэры-буф і, нібыта ў жаданьні да канца адпавядаць апэрэтачнаму антуражу, бярэ прозьвішча «генэрал Лядаіска» — аднаго з пэрсанажаў раману Лювэ дэ Куврэ «Прыгоды кавалера дэ Фаблэ», заснаванага на фікцыйных падзеях з жыцьця Рэчы Паспалітай.

XIII. ХАДЗЬКЕВІЧ І ЛЕГІЁНЫ - 2

Подзьвігі Хадзькевіча ня лепшым чынам адбіваліся на рэпутацыі Легіёнаў. Многіх абурала, што пры рабунках у Нэапалі ён карыстаўся паслугамі легіёнавых грэнадзёраў, а маладыя афіцэры, трапляючы пад уплыў прыцягальнасьці ягонай постаці, ператвараліся ў «дрэнных хлопцаў».

Нягледзячы ні на што, працягваў беспасьпяховыя спробы стаць шэфам кавалерыі і, нарэшце, угаварыў Дамброўскага даць згоду на стварэньне за ўласны кошт двух звышштатных эскадронаў. Дамброўскаму цяжка было зьвязваць сябе з марадзёрам, які цягнуўся за Легіёнамі «па ўсёй Эўропе крывавым сьледам». Але... Яму так не хапала кавалерыі!

XIV. ГЕНЭРАЛЬСКІЯ ЭПАЛЕТЫ І ОРДЭН ГАНАРОВАГА ЛЕГІЁНУ

Перамогу ў нэапалітанскай кампаніі адзначылі трыюмфальным уездам у Парыж. Не аддаючы перавагі зайздросным французскім генэралам, на чале калёны Шампіянэ паставіў Князевіча, чыя багатырская постаць і велічны жэст — нібыта адлітая з бронзы конная статуя, — рабілі зь яго ідэальнага прадстаўніка абодвух перамогшых войскаў. ...А ў ар'ергардзе рушыў прылучаны да вайсковага абозу Дамброўскага табар з трафэямі генэраланшэфа і Лядаіска.

Паводле чарговага сьведчаньня, на гэты раз віленскага актора Скібінскага, Хадзькевіч за ўдзел у кампаніі быў адзначаны генэральскімі эпалетамі, а пазьней — Ордэнам Ганаровага Легіёну.

XV. ХАДЗЬКЕВІЧ МІЖНАРОДНЫ ФІНАНСАВЫ АФЭРЫСТ

Урачыстасьці толькі суцішыліся, а Хадзькевіча выклікаў Барас — каб прапанаваць выкананьне буйной фінансавай дывэрсіі. Дырэкторыя надрукавала аўстрыйскіх банкнотаў на многія мільёны, і Хадзькевіч павінен быў паклапаціцца аб тым, каб яны як мага хутчэй разышліся па абшарах праціўніка. Французы ў выпадку правалу, па палітычных матывах не маглі аказваць дапамогу ў выратаваньні, але ж і стаўкі былі фантастычныя! За 100 падробленых атрымліваў 20 сапраўдных. Пад прозьвішчам графа Дэнгофа з Інфлянтаў, разам з м-м Лябраш адправіўся ў падарожжа. Зьдзіўляў і захапляў правінцыяльную Нямеччыну. Многа пазьней гаварыў графу Жэвускаму, што патраціў тады ня менш за 10 мільёнаў рэйнскіх гульдэнаў! Спыніўся ў Франкфурце ў сувязі зь цяжарнасьцю м-м Лябраш, дзе трапіў у поле зроку ўладаў. Нехта з атачэньня папярэдзіў, што ёсьць загад аб яго арышце. Прыхапіў самыя каштоўныя рэчы і пешшу ўцёк да Парыжу. У ліхаманкавай сьпешцы нават ня здолеў разьвітацца з м-м Лябраш. Пасьля зьнікненьня Хадзькевіча ў сваім сэкрытэры яна знайшла тысячу луідораў і шмат каштоўнасьцяў...

XVI. 18 БРУМЭРА НАПАЛЕОНА БАНАПАРТА

Пакуль ён разьяжджаў, група вышэйшых французскіх генэралаў, усё тыя ж Шампіянэ, Бэрнадот ды іншыя задумалі зьдзейсьніць ваенны пераварот — Дырэкторыю замяніць на Трыюмвірат на чале з Бэрнадотам. Шампіянэ ўзгадаў пра спрытнага ад'ютанта і запрасіў далучацца. Пакуль рыхтаваліся, 18 брумэра VIII году Рэспублікі ўсіх прагнучых улады апярэдзіў генэрал Банапарт, а цяпер — Першы Консул.

Прыйшлося хутка замятаць сьляды... І не сьвяціцца ў Парыжы.

XVII. У ЦЕНЮ ГІЛЬЯТЫНЫ

У наступным 1800 годзе Хадзькевіч удзельнічае ў аблозе Генуі ў войску Масэны. За адвагу і незвычайныя здольнасьці прызначаны генэрал-ад'ютантам пры штабе. Праўда, у Легіёнах далёка ня ўсе прызналі ягонае генэральства.

Занепад Масэны, замяшанага ў цёмныя грашовыя афэры і ваенна-палітычныя падкопы, пацягнуў за сабой ўсіх астатніх. Хадзькевіча арыштавалі на падставе... падробкі аўстрыйскіх банкнотаў. Канешне, гэта была толькі зачэпка. Напалеон, узмацняючы дыктатарскую ўладу, даручыў міністру паліцыі Фушэ высьвятліць пра ўсіх няўдалых канкурэнтаў. Не жадаючы настройваць супраць сябе вядомых генэралаў — калі хто зь іх і трапляў у няласку, дык ненадоўга. Затое без усялякіх цырымоніяў пахапалі дзеячоў другарадных.

Хадзькевіч хлусіў і выкручваўся як вуж. Гульня са сьледчымі каштавала пакуль што месяцамі чаканьня сьмерці. Памірае Шампіянэ. Лядаіска ні хвіліны не сумняваецца, што ягоны апекун быў атручаны. Пасьля гэтае весткі распавёў пра ўсё... Праз два гады сьледзтва кроў арыштаваных ужо нікому не была патрэбная, а іхныя паказаньні ўяўлялі цікаўнасьць хутчэй для архіваў. Рэспубліканская Францыя стаяла на парозе імпэрыі.

У Фушэ было досыць часу, каб упэўніцца ў здольнасьцях Хадзькевіча, якога намерваўся выкарыстаць у шпіёнскіх мэтах. Гэта было няцяжка — падчас Консульства слава генэрала Лядаіска парасла бур'янам.

XVIII. ФРАНЦУСКАЯ ПАДЗЯКА

Недзе ў 1802 г. выйшаў на волю. Атрымаў назад усе ўзнагароды і званьні, а таксама прызначэньне камандзірам над некалькімі батальёнамі, якія ствараліся ў Нармандыі, але разам з тым і вуснае ўказаньне, каб праз некаторы час падаў у адстаўку (як іншаземец, замяшаны ў палітычную змову). Французы, улічваючы



былыя заслугі генэрала, забясьпечылі пасьведчаньне аб адстаўцы найлепшымі рэкамэндацыямі і прызналі права патрабаваць палову пэнсіі, якая належыць ягонаму званьню. Ад пэнсіі з гонарам адмовіўся.

XIX. ПЕЦЯРБУРСКІЯ ЗЛОПРЫГОДЫ

Напрыканцы 1802 году з Гаўра паплыў да С.-Пецярбурга. У адзіноце. Неразлучная м-м Лябраш, пакуль таміўся ў Тамплі, знайшла новага каханка.

Непрыемнасьці насьцiглі і тут. Абыграў сына нейкага буйнога вяльможы. Бедны хлапец, ня ў стане разьлічыцца, спрабаваў скончыць самагубствам. Распачаўся скандал, які дакаціўся да самага верху. Хадзькевіча прыцягнулі да генэрал-паліцмэйстэра Хэртля. На пытаньне «Як адважыўся ўзяцца за занятак, які перасьледуецца па закону?» адказаў, што, ня маючы сродкаў для жыцьця, ухапіўся за шулерства «як тонучы за брытву». Варты жалю выгляд героя шматлікіх бітваў ня мог не выклікаць скупую сьлязу ў маладога рамантыка Аляксандра І. Мабыць, за былыя заслугі пад Ачакавым імпэратар прызначыў вэтэрану пажыцьцёвую пэнсію — 1 тысячу рублёў штогод. Але з гораду папрасіў зьехаць.

А Хадзькевіч і без таго не зьбіраўся марнаваць тут свой час. Нуда...

ЧАСТКА II

Лепш быць першым у правінцыі... Удаліўся ад эўрапейскіх цэнтраў і ад удзелу ў значных падзеях. З гэтага часу гісторыя ягонага жыцьця дайшла да нас у легендах, паданьнях, анэкдотах і дасьціпных афарызмах, якімі іскрылася амаль кожнае слова генэрала.

I. ХАДЗЬКЕВІЧ - ПРАВАДЫР ВОЙСКА ЗЯЛЁНАГА СУКНА

Тульчын на Валыні — рэзыдэнцыя апошняга вялікага магната на землях былой Рэчы Паспалітай, таргавічаніна Станіслава Шчэснага Патоцкага. Па яго сьмерці, у сакавіку 1805 г., спадчына — 1,5 млн. га зямлі і 130 тыс. сялянаў, перайшла сыну Шчэснаму Ежы, агарнутаму нейкай псыхапатычнаю прагай да азартных гульняў. Тульчын ператварыўся ў зборышча шулераў і прайдохаў, што зьляталіся як крумкачы. Правадыр зграі — Хадзькевіч. Паводле няслушнай заўвагі афіцыяліста Патоцкіх Антонія Хжаншчэўскага: «Больш доблесны на зялёным сукне, чым на полі бітвы». Тут ён заклаў сваю штаб-кватэру, адкуль рабіў вылазкі на кіеўскія кантракты, да Вільні і далей у Эўропу (у прыватнасьці, выконваў некаторыя даручэньні Фушэ).

Аднойчы, суправаджаючы маладога Патоцкага ў падарожжы зь Бярдзічава ў Кіеў і ўбачыўшы ў полі стог, прапанаваў прымітыўную, але настолькі ж, як высьветлілася, азартную гульню ў саломкі. Хто карацейшую выцягне — бярэ стаўку. Ніякі шулерскі досьвед у гэтай забаве ня меў вартасьці, і так дзіўна здарылася, што Хадзькевічу і тут пашанцавала, а Шчэсны Ежы ўсё больш распаляўся... Праседзеўшы пад стогам палову дня, прайграў ня многа ні мала — 14 тыс. дукатаў.

Шчэсны Ежы дзень за днём руйнаваў спадчыну, страчваючы наяўныя грошы, фальваркі, вёскі. Не прайшло і трох гадоў, як апынуўся поўным банкрутам. Толькі адзін Хадзькевіч выйграў у яго два мільёны польскіх злотых. Нехта са знаёмых, убачыўшы ў Тульчыне генэрала пасьля доўгага часу, заўважыў, што той папаўнеў. «Ба! Двух Патоцкіх зьеў!» — пачуў той у адказ.

II. У ВІЛЬНЮ — ЭЛЬДАРАДА ШУЛЕРАЎ

Зьеўшы «Пілаву», рушыў на Бацькаўшчыну. Уладкаваўся ў Вільні — сапраўдным Эльдарада шулераў. Зажыў па-магнацку. Стварыў уласную гвардыю, а хутчэй выведку з гарэзаў і свавольнікаў усіх сацыяльных групаў. Жартаўліва называў сваіх малойцаў «плёткамі». «Плёткі» мелі права доступу да ягонага стала, дома, багацьцяў. Штодзень бралі золата зь ягоных куфраў. Але за гэта павінны былі быць гатовыя на ўсё: ляцець удзень і ўноч з канца ў канец Эўропы, каб зьдзяйсьняць волю гаспадара, жартаваць, помсьціць, вышукваць прастакоў з грашыма, выведваць, дзе будзе і калі вялікі збор людзей — баль, кірмаш, пікнік ці нешта падобнае, дзе кватаруюць вышэйшыя расейскія афіцэры, ці маюць і ў якой колькасьці наяўныя, ці гуляюць у карты, і калі не, то як можна прывабіць і г.д.

III. РЭХА СЛАВУТАЙ МІНУЎШЧЫНЫ

Аўстрыйская кампанія 1809 г. зноў нагадала пра былое. Хуткі на рашэньні Хадзькевіч прадаў маёмасьць і нават каштоўнасьці другой жонкі, каб сфармаваць уласны полк у Галіцыі. Не атрымалася па невядомых прычынах...

IV. ЯГО АДМОЎНАЯ ПРЫВАБНАСЬЦЬ

Габрыэля Пузыніна з Гюнтэраў, дама недурная і добрапрыстойная, у сваіх мэмуарах пад назвай «У Вільні і дварах літоўскіх», безумоўна, не магла абысьці постаць Хадзькевіча. Асуджаючы выхадкі і паводзіны «гульца» і «шулера» (пад гэтымі прозьвішчамі яго ведалі ў Вільні), адчуваецца, глядзела на яго не бяз тайнага захапленьня. Маці Пузынінай паскардзілася аднойчы пану Ігнацыю на тлум з шынка, які знаходзіўся побач зь ейным домам. Гэты тлум не даваў заснуць. Наступнаю ноччу ўсё было ціха. А калі запытала, якім чынам яму гэта ўдалося, — «Гэта мае людзі, — адказаў. — Яны мяне слухаюць».

Жарты, моцна разбаўленыя цынізмам. Ці цынізм жартамі? Асабліва даставалася жанчынам. Мог даць фору Дон Жуану і Казанове разам узятым — гэткі зьбіральны вобраз. Ніводная паненка не магла ўстаяць перад яго д'ябальскаю чароўнасьцю. Шмат разоў браў фіктыўныя шлюбы, меў мноства каханак, разбэшчваў Вільню сваімі «Райскімі вечарамі» ці папросту оргіямі. У тульчынскія часы, калі са Шчэсным Ежы сядзеў пры фараоне ў шынку, узьнялася раптам моцная навальніца. Маланка ўдарыла ў комін і забіла пахолка, які стаяў побач з гульцамі. У Хадзькевіча ніводны мускул не дрыгануў. Не адкладаючы картаў, флегматычна заўважыў: «Калі б у мяне так стрэліла, гаварылі б, што кара Божая».

Спаткаўшы ўбогага, даставаў для яго з кішэні ўсё, што ў жменю ўмяшчалася, ня гледзячы — золата ці срэбра; ці грошы, гадзіньнік, табакерку ня зямлю ўроніць — не нахіляўся за імі, рабілася ўласнасьцю прыслугі. Але мог адмовіць нават у сухой скарынцы жабраку. Зусім непрадказальны.

Ня ўсе дамы ў Вільні былі адкрытыя для генэрала, бо хоць захапляліся ім, але й пабойваліся. Казімір Скібінскі ўзгадвае, як Хадзькевіч заявіўся без усялякага запрашэньня на яго вясельле са сьпявачкай Камінскай 5 лістапада 1814 г. «Прыйшоў каля поўначы. Вядомы ўсёй Вільні як любоўны авантурнік і карцёжнік. Гаварылі пра некалькі дзясяткаў ягоных жонак, якім ягоныя ўласныя лёкаі давалі шлюб. Высокага росту, апрануты балёва, у белых шаўковых панчохах, у чаравіках з дыямэнтавымі спражкамі, чорныя кароткія нагавіцы, белая аксамітная камізэлька, чорны фрак са стужкай (ордэнскай? — А.Ш.), chapeau bas пад пахай».

Доктар Станіслаў Мараўскі мог бы дадаць, што найдаражэйшае адзеньне, найдаражэйшую, заўсёды сьвежую парыскую бялізну насіў наўмысна нядбайна, усё на ім ляжала як бы ад нежаданьня. Фракі падраныя, кашулі пакамечаныя, але белыя, як сьнег.

Аблегчыўшы кішэні гасьцей больш чым на паўтара кіляграма золата, па-ангельску зьнік.

V. НЕЧАКАНЫ ПРЫЕЗД

Напрыканцы таго ж 1814 г. Хадзькевіч назаўсёды пакінуў Вільню, каб рэшту дзён правесьці ў сваіх уладаньнях на Валыні. Прыезд генэрала парушыў спакой, што быў наступіў пасьля сканаць Шчэснага Ежы. Сафія Патоцкая «Грэчанка» добра бачыла небясьпеку. Дзеля зьберажэньня роду трэба было нешта рабіць, балазе памочнікі знайшліся ўплывовыя — сын ад яе першага шлюбу расейскі генэрал Вітэ (ён жа дэ Віт), царскі обэр-шпіён, і жаніх яе дачкі ад другога шлюбу са Станіславам Шчэсным малады флігель-ад'ютант Аляксандра І, начальнік штабу 2-ой арміі ў Тульчыне — Павал Дзьмітрыевіч Кісялёў. Вітэ сутыкнуўся з Хадзькевічам у Кіеве падчас кантракту. Убачыўшы Аляксандра Патоцкага на яго кватэры, седзячым на канапе між панам Ігнацыем і яшчэ нейкім карцёжнікам, вымавіў: «Як мне шкада, Аляксандар, бачыць цябе як Хрыста на крыжы паміж двума разбойнікамі». «Куды больш цікавей бачыць столькі крыжоў на адным разбойніку», — парыраваў Хадзькевіч.

У канцы 1819 г. генэрал за картамі літаральна да ніткі абабраў камісара інтэндатуры Бясчаснава, а камісар разьлічваўся казёнными грашыма. Повад быў мізэрны, але Вітэ і Кісялёў паклапаціліся аб тым, каб арыштавалі менавіта Хадзькевіча, кінулі ў кіеўскую турму, а адтуль выслалі ў Вятку.

Згодна легендзе, дзякуючы намаганьням апошняй каханкі Хадзькевіча, вясковай дзяўчыны па прозьвішчы Сойка, пра справу стала вядома Аляксандру І. Калі ён запатрабаваў дакумэнты і ўбачыў у іх розныя юрыдычныя парушэньні, у другі раз выратаваў героя Ачакава — памілаваў і загадаў вярнуць назад.

... Пан Ігнацы зразумеўшы, што Фартуна кінула яго сам-насам зь Лёсам, не знайшоў сілаў змагацца ці проста не схацеў. Запіў насьмерць. І ў нудзе, бязьдзейнасьці і нягодах скончыў жыцьцё...


VI. АПОШНЯЯ ЗАЎВАГА

Карціна супярэчлівага жыцьця генэрала Хадзькевіча была б няпоўнаю, калі б не дадаць яшчэ адну рысу — сьведчаньні графа Жэвускага.

«... Адну толькі рэч шанаваў — рэлігію, у якой быў выхаваны. Ніколі супраць яе не дазваляў сабе наймалейшага жарту.

Даведаўся раз, што ў Печажы памірае яго добры знаёмы афіцэр батальёну скарбовай міліцыі Драч. Набажная гаспадарыня Печажа паведамляе Хадзькевічу, што паміраючы ня хоча паяднацца з Богам і сьвятара да сябе не пускае. Хадзькевіч хутка ляціць да Драча і робіць тое, чаго ніхто зрабіць ня мог. Пасьля кароткае размовы Драч просіць сьвятара і памірае як добры каталік».

Андрэй Шпунт



Адам

СВОЙ

Усё часьцей згадваецца мой горад, якога няма...

Бераг Сьвіслачы, Траецкае прадмесьце, ружовая лазьня, тоўстыя сьцены, маленечкія падсьлепаватыя вокны. Старыя менчукі кажуць, што ў той лазьні падчас апошняй нямецкай акупацыі мясьцілася падпольная друкарня, дзе выдавалася антыфашысцкая газэта. Уяўляюцца: стосы набрынялай вільгацьцю паперы, людзі, што выходзяць у ваенную ноч, хаваючы за пазухай скруткі антырэжымных лісткоў, аголеныя кабеты зь дзецьмі, што мыюцца й ведаць ня ведаюць пра патаемную рэдакцыю... Лазьню зьнесьлі, разбурылі сьцены, падобныя да абаронччых муроў. Лазьня не ўпісалася ў рэстаўрацыйны праект. Шкада.

Так не знайшлося месца ў архітэктурных плянах будучага Менску й стадыёну, што некалі стаяў за Палацам спорту, што на праспэкце Машэрава. Стадыён спачатку закінулі, і, як кожны закінуты стадыён, ён пачаў нагадваць свайго прашчура — рымскі Калізэй. Трыбуны пазарасталі быльнягом. Камэнтатарскія будкі страцілі шыбы, а пазьней — рамы. Поле пакрылася ямінамі, у якія зьбіралася вада. Спартоўцы туды не хадзілі, замест іх мясцовыя сабачнікі выгульвалі сваіх улюбёнцаў. Разбураны стадыён мне падабаўся, асабліва ў ціхую, летнюю, перадвечаровую пару. Можна было прысесьці на трыбуне й напісаць хоку пра зьменлівы сьвет і нетрываласьць існага. Стадыён ня проста зьнесьлі, на ягоным месцы выкапалі катлаван, які залілі рачной вадою — такім чынам пашырылі Сьвіслач.

Аднойчы мне давялося назіраць, як у люстры Сьвіслачы адбіваецца полымя пажару. Гарэў кінатэатар «Летні», што некалі стаяў у парку культуры й адпачынку імя пралетарскага пісьменьніка Горкага. У «Летнім» праходзілі самыя позьнія кінасэансы. Пачыналіся яны ў 22-20, а то і ў 22-30. Хадзілі чуткі: што там зьбіраюцца бандыты, і нехта з крымінальнікаў кінуў недапаленую папяросу ў складкі заслоны. Пачаўся пажар. Менчукі з усяго гораду зьехаліся паглядзець на начное відовішча. Пажарнікі асабліва не шчыравалі. «Летні», збудаваны з сухога дрэва, згарэў ушчэнт. Па горадзе луналі спадзеўкі, што кінатэатар адбудуюць, што «Летні» будзе прыгожым і шкляна-бэтонным. Але ніхто не распачаў адбудоўваць кінатэатар. Неўзабаве скончылася эпоха вялікага кіно. Тэлевізія й відэамагнітафоны забралі ў кінатэатраў іх папулярнасьць. Цэлыя й дагледжаныя кінатэатры стаяць паўпустыя. Некаторым пашанцавала, іх пераабсталёўваюць, як «Беларусь» — перабудоўваюць у музэй сучаснага мастацтва. Пра кінатэатар «Летні» забыліся.

Так пачалі забывацца чырвоныя агітацыйныя шчыты, якімі ўпрыгожвалі горад у часы таталітарнага рэжыму. Ледзь ня кожны заводзкі паркан завешваўся лёзунгамі пра вялікую камуністычнай партыі й выключную ролю пралетарыяў у пабудове сьветлай будучыні. Камунізм не надышоў, як не прыйшоў Гадо ў п'есе Бэкета. Савецкую агітацыйную дыкту зьнесьлі на сьметнік. Пралетары завялі. Папрыцхілі заводы. Усе «Трактарныя», «Маторныя», «Шарыкападшыпнікавыя»... Менск не належыць пралетарыяту. Пачварная дыктатура рабочых зьмянілася на гадкую дыктатуру электарату. Хаблы ад імя хаблоў запраўляюць у Менску.

Толькі быў і кароткі сьветлы час. Тады ў доміку, дзе адбываўся першы зьезд Расейскай Сацыял-Дэмакратычнай Рабочай Партыі, гандлявалі галяндзкай мэбляй. На тэлевізіі ў фатэлі сядзеў падобны да Пятра Машэрава артыст, курыў люльку, пускаў дым і казаў пра выдатную мэблю з Амстэрдаму. Зараз у дамку ізноў адно музэй расейска-яўрэйска-беларускіх рэвалюцыянэраў. Але мне падабаўся гэты крыты шыфэрам, зялёны аднапавярховы дамок якраз у той час: калі палова была музэем, а палова крамаю, калі не прыпаўзалі ў яго чырвона-карычневыя маргіналы са сьвянчымі прозьвішчамі, кшталту Зюган. Не прыходзілі, не размахвалі крывавымі анучамі й не агітавалі зьнішчыць Беларусь. Камунякі агітуюць удзень, а ўвечары каля зачыненага дамка зьбіраецца басота й п'е гарэлку за столікамі пад парасонамі.

Цяпер у Менску можна піць гарэлку, віно й піва проста на вуліцы, а ў часы камуністычнага завіхрэньня за гэта забіралі ў аддзяленьне. Людзі, што хацелі выпіць, хаваліся ў цёмных кутках паркаў, у пад'ездах, на могілках. Усе менскія могілкі былі неахайныя, непрыбраныя, дзікунскія. Кальварыя не складала выключэньня. Стаяла захламленая сьмецьцем, іржавая, нямеценая. Цяпер Кальварыйскія могілкі прыбралі, пафарбавалі, пачысьцілі й падмялі. Сёлета на іх зноўку пачалі хаваць. Месца каштуе шаснаццаць мільёнаў рублёў. Нядорага. Зьбіраць грошы на аднаўленьне Кальварыйскага касьцёлу менскія каталікі пачалі ў 70-х. Да нас у кватэру прыходзіла маміна сваячка, цётка Вікця. Бацька даў на касьцёл дзесяць савецкіх рублёў. Вікця казала, што ўсе, хто жыве побач з Кальварыяй, ахвотна ахвяруюць. Абрыдла сьметніца, у якую ператварыліся старажытныя могілкі. Касьцёл адчынілі. Вікцін сын — Анатоль — іграе ў ім на аргане. Можна ў нядзелю раніцай схадзіць і паслухаць.

Ня ведаю як хто, а я люблю рок-канцэрты. Быў у Менску час, калі ўсе хадзілі на рок-тусоўкі. У горадзе склалася можа сто, а можа й дзьвесьце рок-камандаў і ўсе лабалі, і ўсе сьпявалі, і ўсе хацелі стаць вялікімі й знакамітымі. Не атрымалася. Цяпер у Менску пануе музыка расейскай эстрады. Ня слухаю й не люблю.

Напрыканцы 80-х здавалася, што яшчэ крок, і нашая «Бонда» ці «Мроя» стануць «Depeche Mode» ці «AC/DC». Ня сталі. Так і з адлегласьцямі. Раней, калі даводзілася прыляцець у стары менскі аэрапорт, што на вуліцы Аэрадромнай, думалася: як далёка аэрапорт ад цэнтру. Цяпер, як зьявіўся Менск-2 пад Смалявічамі, Менск-1 ледзь ня ў цэнтры сталіцы. Фокус. І раніцай, едучы сорак кілямэтраў у Менск-2, думаецца: добра было б, каб... Каб працаваў Менск-1. Каб беларускі рок-гурт «Бонда» займеў сусьветную вядомасьць. Каб Васіль Быкаў атрымаў Нобэлеўскую прэмію. Каб... Дарэмныя спадзяваньні. Ніхто ня зьдзівіцца, калі заўтра-пазаўтра аэрапорт Менск-1 наогул зьнясуць, як стадыён за Палацам спорту.

Што зьдзіўляцца, ва ўсе часы ў Менску нехта нешта зносіў і будаваў, будаваў і зносіў. Зьдзіўляе іншае — зьнесьлі ледзь ня ўсю вуліцу Чарнышэўскага, а мой любімы дуб застаўся. У маленстве пад тым дубам, дубам зеляненькім, я зьбіраў жалуды. Ідучы ў дзіцячы садок, мы з бацькам заходзілі па жалуды. Што можа суцешыць хлопчыка болей за жолуд у кішэні? Ну хіба што каштан. Прыемна зьбіраць каштаны, але жалуды люблю больш. Дуб стаіць, а ніводнага двухпавярховага дамка побач няма.

У нягеглых дамках жылі мае аднаклясьнікі. Дзе яны? Ня ведаю. Пэўна, большасьць засталася ў Менску, але мінула трыццаць гадоў, і пазнаць іх не змагу.

Мусіць, не пазнаю Мішу Пракоф'ева, зь якім хадзіў у гурток маляваньня да Сяргея Пятровіча Каткова. Мішка выдатна маляваў тралейбусы, Менск і талеркі зь яблыкамі. Сяргей Пятровіч любіў Мішку Пракоф'ева. Пятровіч наогул любіў дзяцей, якія малявалі. Праз гурток Каткова прайшлі ледзь ня ўсе менскія мастакі.

Ігар Сідарук

Пяць хлябоў з Дабравесьця

Апавяданьне

Была змрочная раніца.

Дзеці хацелі есьці. Яшчэ зь вечара. Не, ня зь вечара. Дзеці хацелі есьці заўсёды, колькі сябе памяталі. У хаце даўно не было ані каліўца, ані скарынкі. Але яны яшчэ памяталі, як выглядае ежа.

Асабліва ім падабаўся хлеб. Звычайны чорны хлеб, які дзеці любілі ўмакнуць у ваду і, калі ў хаце вадзіўся цукар, пасыпаць ім зьверху. Калі цукру не было, яго замяняў пясок. Пясок хрумсьцеў на зубах ня горай за цукар. Ды, бадай, і смакам амаль не адрозьніваўся ад таго жоўташэрага сыпунку, зь якім, калі выпадала такое шчасьце яны раскашавалі дзень, а то й два.

Яшчэ дзеці любілі звараную неабранай бульбу. Тады яны хапалі яе гарачай з казанчыку ды, прагна абіраючы халоднымі танклявымі пальцамі пяклівае шалупіньне, з насалодаю запіхвалі сабе ў рот, апякаючы языкі ды паднябеньні, ані не зважаючы на гэта. Калі ж казанчык пусьцеў, а люты голад усё роўна сьціскаў да шаленьня маленькія каўтунчыкі, тады дзеці давалі рады й шалупіньню, няхай ужо й астыламу, аднак з тае прычыны зусім не страціўшаму свае смакаты. Але праўдзівая бульба ў іх хаце вадзілася рэдка. Часьцей — усё тое ж шалупіньне, калі яго шчасьціла назьбіраць па якіх сьметніцах ды проста — па загаджаных пустках, яшчэ не абланых, не абгледжаных такімі ж, як яны, галечамі. Бывала, што маці проста кідала ў кіпень тоўчанае жалудовае карыцы, і тады дзеці мусілі ласавацца тым варывам, як дзень таму з насалодаю частаваліся бурачковаю гніллю таўчанкаю...

Аднак на гэты раз справа выглядала зусім кепскаю. Ежы ў хаце не было ўжо тыдзень ці болей: ніхто зь сямейцаў проста ня памятаў, калі ды што ж такое яны елі ў апошні раз. А тут, як на тое ліха, самая маленькая двухгадовая Ганначка занядужала ды пачала зыходзіць проста крываваю бягункай. Выклікалі дохтара. (Мэдыцына па-ранейшаму заставалася бясплатнаю, і гэта лічылася ці не найбольш ганаровай заваёвай цяперачаснага ладу...) Таўсмаценькі дохтар, прымружыўшы вока, агледзеў Ганначку, з абыякавым зацікаўленьнем пацікаў ёй на жывоцік ды абвесьціў бацькам свой катэгарычны вырак: калі дзіця не пад'есьць уволю, прычым пажадана, каб гэтым уволю жратвом была посная гавяда, а яшчэ лепей, сьвінячае сэрцайка, ды пад маркоўнаю поліўкаю, ды каб зеляніны паболей-паболей!, а гарчычка-хрэнчык — гэта ўжо само сабою; то жыць ёй засталося... самі ведаеце колькі дзён.

«А калі ня ведаеце, то скажу проста, — безапэляцыйна абвесьціла раёнае мэдычнае сьвяціла. — Жыць вашаму чарвячочку засталося сама болей дванаццаць гадзінак. Ну, можа, трынаццаць, калі ўжо па максымуму!..» І сьвяціла, хукнуўшы ў пусты кулак, у якім, да свайго неабмежнага дзіваваньня, анічога не намацала, расчаравана выкацілася зь іхнага бядотнага жытла пакутаў.

Маці, глянуўшы на амаль што згаслую Ганначку, была захліпала-загаласіла, але бацька гыркануў на яе так, што яна толькі спуджана залыпала павекамі да ўраз сьцішылася. «Сэрца дык сэрца», — толькі й вымавіў бацька.

І вось надышла тая самая змрочная раніца. Тая раніца, калі дзецям ужо схацелася есьці так, што, здавалася, жываты зараз палопаюць, а пустыя кішкі наматаюцца вакол бэлек пад стольлю. І толькі маленькай Ганначцы не хацелася ўжо анічога. Яна ляжала ў рызьзі на бацькоўскім ложку, і ейнае адно паўрасплюшчанае пустое вочка не маліла нават аб

Глёбус

МЕНСК...

Суровыя, як Стальмашонак і Данцыг. Дадаістычныя, як Сумараў і Хацкевіч. Практычныя, як Рагалевіч і Кірылаў. Каткова даўно няма. Вучні носяць кветкі на



магілу. Я не нашу. Пэўна ня ходзіць да Сяргея Пятровіча на могілкі й Мішка Пракоф'еў. Можа й памыляюся. Дакладна тое, што на вуліцы Чарнышэўскага стаіць дуб, пад якім у маленстве я зьбіраў жалуды.

Мне хутка сорак, і, натуральна, узьнікае жаданьне занатоўваць успаміны. Зрэшты, мэмуарнасьць і дакумэнтальнасьць мяне вабілі заўсёды. Разважаць на адзіноце пра хуткаплыннасьць існага досыць прыемна, а таму й занатоўваю згадкі пра свой Менск. А што за горад безь людзей, бяз постацяў, без асобаў?

Даволі часта мне кажуць: «Табе пашанцавала... Ты ведаў Караткевіча, Стральцова, Танка, Анікейчыка, Кішчанку...» Сапраўды, я шмат каго ведаў, шмат з кім гаварыў, працаваў... І амаль нічога не напісаў пра вядомых людзей. Не лічыў за важнае ўхваляць тубыльцаў. Верыў ва ўласную адметнасьць, абранасьць, веліч. Парыж, Лёндан, Нью-Ёрк, Камю, Пікаса, Вазарэлі — вось постаці й гарады, дзе шукаліся адпаведнасьці і ў якіх бачыліся ўзоры чыстае красы. А Менск, тутэйшыя людзі — эпізод, фрагмэнт, кавалак, ня варты ўвагі. Цяпер інакш. Зараз маленькая дэталь, зьнітаваная зь Менскам майго дзяцінства, даражэйшая за залатую маску Тутанхамона.

Вяртаўся я са школы, мне было гадоў восем. У двары сустрэў маму, яна йшла адчыняць сваю бібліятэку. Загаварылі пра школу. На той самай вуліцы Чарнышэўскага, дзе стаіць мой дуб. Быў дзень раньняе восені з сонечнасьцю й мяккім цяплом. У Стральцовых, на першым паверсе, былі паадчыняныя вокны. Раптам у ваконным прагале зьявіўся дзядзька Міхась зь вільготнымі шкарпэткамі ў руцэ. Шкарпэткі павесіліся на асьветленую промнямі фортку. «Міша, ты што робіш?» — заўсьміхалася маці. «Ня бачыш? Шкарпэткі дасушваю. На працу трэба бегчы, а яны з самай раніцы ніяк ня высахнуць». «Ты іх папрасуй. Прас хутка падсушыць». «Ай, на сонцы высахнуць». Стральцоў прапаў у цемрадзі маленечкай двухпакаёўкі. Чаму так ярка помніцца мокрыя шкарпэткі ў руках маладога Стральцова? І так цьмяна, невыразна праступаюць у памяці доўгія вечаровыя размовы пра паэзію. Можа час не прыйшоў, каб занатоўваць гутаркі са Стральцовым?

Успаміны пра Ўладзімера Караткевіча гэтаксама зьнітаваныя больш з побытам, чым з творчасьцю. Аднойчы Валянціна Браніславаўна — жонка Караткевіча — зьяжджала ў камандзіроўку. Напярэдадні пасправалася зь дзядзькам Валодзем, што схавае ў кватэры пляшку гарэлкі, а той ня знойдзе да яе вяртаньня. Сказала. Схавала. Зьехала. Караткевіч, вялікі майстар хаваць і знаходзіць, шукаў-шукаў і не знайшоў. Калі цётка Валя вярнулася, дык вачам не паверыла — пляшка была на падваконьні за пісьмовым сталом, там, дзе яна яе і паставіла. «Нашто хаваць, калі знойдзе? Вось і паставіла ў кабінэце, на самае віднае месца». Уладзімер Сямёнавіч закрыўдаваў. Сказаў, што ніякай пляшкі на падваконьні не было, што Валька яе паставіла тады, як прыехала. Караткевіч быў крыўдлівы, як дзіця. Усе пра тое ведалі. Ну прывезла Валянціна Браніславаўна бутэльку, дык прывезла. Ня можа чалавек прайграць спрэчку, дык Бог зь ёй, зь нікчэмнай спрэчкаю. Ніхто не шукае на відных, сьветлых, чыстых месцах. Шукаюць у цемры, у кутках, у тайніках. Нашто хаваць празрыстую вадкасьць каля сьветлых шыбаў? Ня трэба так рабіць. І доказам хай служыць пляшка на падваконьні ў Караткевічаў.

Так і я адмовіўся ад доказаў і пераканаўчым у гутарцы-спрэчцы зь сябрам Караткевіча — Валянцінам Ждановічам. Мы бралі чарку з нагоды выхаду маёй кніжкі «Сьмерць-мужчына». Валянцін, тады супрацоўнік часопіса «Маладосьць», даставаў паперу на часопіс і адпаведна на кніжкі, што выходзілі ў бібліятэчцы «Маладосьці». Я быў яму ўдзячны. За сталом я згадаў, як у 78-м, пад самы Новы год, ён фатаграфаваў мяне разам з Уладзімерам Сямёнавічам. Валянцін сьцяўся, набычыўся, сказаў, што ніколі ў жыцьці не здымаў мяне з Караткевічам. Я настойваў. Згадваў пра тое, як трымаў лямпу асьвятленьня. І чым больш пераканаўчымі былі дэталі, тым больш непахісным рабіўся Ждановіч. Нарэшце ён выбухнуў, сказаў, што я ня маю маральнага права кепска пісаць пра Караткевіча. Ждановіча супакойвала ўся тагачасная рэдакцыя «Маладосьці». Зрабілася млосна. Я адмовіўся ад сваіх словаў і папрасіў прабачэньня ў Валянціна Ждановіча. Ну не здымаў. Ну не было пляшкі. Ні Караткевіча, ні Валянціны Браніславаўны, ні Ждановіча няма. Валянцін павесіўся ў дзень сьмерці Ўладзімера Сямёнавіча. Павесіўся ў рэдакцыйнай фоталябараторыі. Цяжка было глядзець на апячатаныя міліцыянтамі дзьверы.

Колькі ні спрабую, а не магу згадаць, каб хоць раз я маляваў Дом ураду ці Палац Прэзыдэнта. Я сто, а можа й дзьвесьце разоў выходзіў з дому, каб маляваць Менск. Блукаў у старых кварталах, рабіў замалёўкі невысокіх дамкоў, хат, касьцёлаў, цэркваў... Аднойчы старэнькая кабета спытала: «Нашто ты малюеш трухлявае мінулае? Не сягоньня-заўтра нас адсюль выселяць, дамкі-баракі зьнясуць, а на іх месцы пабудуюць высокія хмарачосы». Пытаньне загнала ў змрочную разгубленасьць. Сапраўды. Нашто мне стары Менск? Нашто малюю тое, чаго заўтра ня будзе зусім? Яно сплыве ў бясконцае далёка, сплыве незваротна... Менск 60-70-х значна далей ад нас, чым Рымская імпэрыя. Рым ёсьць у кожнай другой кніжцы, у кожным падручніку. А Менск зьнікае. Дык нашто пра яго пісаць? Нашто маляваць дом, які заўтра-пазаўтра зьнясуць? Значна пазьней, праз гадоў пяць пасьля размовы са старой цёткай, я прыйшоў да высновы: каб працаваць і плённа рабіць работу, нельга пытаць: «Нашто?» Ніхто, сам Бог дакладна й адназначна не адкажа на пытаньне: «Нашто ёсьць тое, што ёсьць?» Але я мусіў адказаць старой жанчыне. Маўляў, тут будуць рабіць рэстаўрацыю, а я рыхтую праекты рэканструяваньня вашых дамоў. Кабета ня верыла. Я й сам ня верыў, але выйшла па-мойму. У доме, намаляваным у той дзень, праз дзесяць гадоў адчынілі музэй Максіма Багдановіча. Я схлусіў жанчыне, а мая няпраўда абярнулася праўдаю. Такое здараецца ў Менску. Гэта здарылася ў той час, калі менскім мастакам падабалася маляваць старую архітэктуру, калі фатограф Зянон Пазьняк блукаў па горадзе ў даўгаполым палітоне. Зянон фатаграфаваў Менск, а я маляваў сонечную восень.

Менск – 20.04.1998

літасьці. Аднак Ганначка была яшчэ жывая. Яна ціха й часта, амаль незаўважна, дыхала, але гэты подых з кожнаю хвіляю згасаў, паволі падбіраючыся да самай апошняй рэшты...

Маці нешта ўнесла ў пакой і, хаваючы вочы, паставіла на настольнік. Дзеці нясьмела пацягнуліся да стала. Гэта былі дзьве талеркі, накрытыя адна адною. Малыя нават нічога не запыталіся — такім шаленскім, такім неабмежным было дзіцячае зьдзіўленьне, а можа, бадай, захапленьне. Маці, хвілю памарудзіўшы, зьняла верхнюю талерку-накрыўку, і дзеці ледзь ня ляснуліся на падлогу. Неверагодны пах сьвежазваранага мяса адначасна тонка расшырыў і сакрушальным кувадлам ударыў па іхных наздрынах. І яны ўбачылі, убачылі на ўласныя вочы: на ніжняй талерцы ляжаў ладны, мускулісты кавал таго, чыя доля вызначался толькі адным: быць зьедзеным, зжэртым, праглынутым, згрызеным, згаманым, стопчаным, пракаўтнутым, зжаваным, расшкамутаным, стрэсканым, злопаным і прычым неадкладна. Дзеці нават спужаліся: так нерэальна, нават так містычна было ўсё гэта. І яны маўчалі, са страхам, не, нават з жахам уваччу шырака пазіраючы на талерку зь мясам.

А маці, гэтак жа моўчкі, узяла ў рукі тонкі двухрогі відэлец ды тонкі даўгі нож-сталовец і пасунула талерку бліжэй да сябе. Ейныя рукі дзелавіта рэзалі-кроілі дымнасакаўную страўнасьць. Нож мякка ўваходзіў у пяшчотную тканку мяса, яно рэзалася свабодна й лёгка, жылкі ды белы тлушч пад тонкім лязом сталоўца ціха разрываліся й разыходзіліся, адкрываючы воку карычневата-блакітную існасьць варыва. Маці паклала перад кожным па тонкім скрылі, не забыўшы кожнага папярэдзіць, каб еў нетаропка, не глынаючы цэлымі кавадламі. Найболей пяшчотны ды сакаўны кавалак яна падхапіла відэльцам і хуценька панесла, падтрымліваючы рукою пад ніз, каб не зваліўся долу, да ложку, на якім памірала Ганулька.

— Еш, дачушка, еш! — толькі ціха вымавіла маці, кранаючыся цёплым мясам сшэрхлых вуснаў дзіцяці, ужо бяз хоць бы якое надзеі.

На дзіва, Ганначка заварушылася, затрапятала, расплюшчыла вочы. Яна асьцярожна разьляпіла ссохлыя вусны, пацягнулася ротам да дымнае стравы.

— Што гэта? — раптам здолела вымавіць зьнясіленае дзяўчо.

— Гэта сэрца, дачушка...

— Якое смачнае!.. — сказала Ганулька, зь цяжкасьцю глынаючы амаль неразжуты кавалак стравы. — А можна яшчэ?

— Можна, можна, а як жа!.. — замітусілася маці, памкнуўшыся да стала, дзе астатнія дзеці яшчэ не прыкончылі едзіва. Яна адрэзала такі ж тонкі скрыль ад таго, што заставалася, і хуценька вярнулася да Ганулі. Цяпер у вачох дзіцяці было заўважна ўжо болей жыцьця ды, адпаведна, прагнасьці. Яно ўжо ня так душылася мясам, а таму прыкончыла дугі кавалак многа хутчэй, чым першы.

— Ну гэта ж і праўда смаката, матуся! — лагоднела ды сьвятлела аблічча Ганначкі. — А дзе татка? — раптам спытала яна.

— Татка?.. Ваш татка... — але ня здолела вымавіць да канца ўсе словы маці, усхліпнула голасна, выхапіла з-пад бруднага фартуху нейкую паперчыну, пачала шкамутаць ды смаркацца ў яе.


Усё раптам паднялося-завіхурылася ў галаве няшчаснае, зьнясіленае жанчыны: і апошнія карткі на няісныя крупы ды на гарэлку, і пяць хлябоў ды дзьве рыбіны з кніжачкі Дабравесьця, зачытанай імі доўгімі нуднымі вечарамі да дзірак, і тая акрываўленая сякера пад лаўкаю, і суседка — вялікая аматарка пяцёх лыжак заціркі на дарэмшчыну, і выбарчыя ўчасткі зь бязьмежжам мястачковага піва ды польскіх селядцоў, якіх некаторыя адважваліся-такі купляць у складчыну, а потым, дзелячы іх на шматку бруднае газэціны з выяваю ўсьмешлівага прэзыдэнта, сварыліся да голас крыві, каб толькі не займець самую ненаедную частку — касьцісты голаў, і той разрабаваны эшалён на станцыі, дзе ў велізарных лядоўнях былі адно скалелыя сабакі, сабакі, сабакі, бясконцая чарада вагонаў адно толькі з сабакамі, сярод якіх дзе-нідзе трапляліся, аднак, струпянелыя пацукі й нават каты, і тая тужлівая ноч, калі бацька, ужо ня могучы нават дыхаць ад роспачнае, пачварнае існасьці, стаяў з нажом над сьпячаю дзятвою, а яна, ашалелая маці, зь бязгучным енкам вісела на ягонай руцэ...

Дзеці толькі ніжэй унурылі галовы ды больш шпарка запрацавалі сківіцамі...

Аднак праз нейкую хвілю маці, прыкрываючы рот, пудліва сьцішылася, адвярнулася да вакна і пачала разгладжваць скамечаны аркуш. «Чыстасардэчнае прызнаньне» — было выведзена ўверсе старонкі ня надта роўнымі літарамі.

Заўтра яна перапіша яго нанава і панясе ў мястэчковы пастарунак. А сёньня...

Сёньня ўрэшце дзеці наеліся.



Бясплатныя прыватныя абвесткі

Віншуем з днём нараджэньня легенду беларускага рок-н-ролу, знакамітага блюзавага гітарыста Леаніда Вярэніча. Чакаем новых блюзавых гукаў. Музыкі з «Крамы» і «Яблычнай гарбаты»

Бясплатна вышлю каталёг карыснай інфармацыі на ўсе выпадкі жыцьця. Ад вас капэрта са зв/а + купон д/а. 246012, Гомель-12, а/с 147

Шматпаважаны Зьміцер Кісель! Віншуем з днём нараджэньня! Жадаем зьдзяйсьненьня і рэалізацыі! Сям'я Мельнікавых

Студэнт-нацыяналіст шукае пару, каб разам здымаць пакой да 20$ за месяц. Тэл.: 220-29-26, 220-37-92, для Вадзіма

Алачка! Каханая дзяўчынка! Віншую з угодкамі нашага спатканьня! Я бязьмежна цябе кахаю! Твой Алесь Шадрын

Zaprašajem lićvinaŭ-manarchistaŭ da zhurtavańnia. Z nami iścina! My z Boham! Vielič, nacyja, niezaležnaść, Boh, mova, samabytnaść! A/s 124, 246012, Homiel

Vinšuju brata Hienadzia Švierdlikava z dniom naradžeńnia. Michaś

Maryna! Ja kachaju ciabie! Ale rviecca majo serca, tamu što ty nikoli nia budzieš majoj

Zaprašajem lićvinaŭ da zhurtavańnia!!! A/s 124, 246012, Homiel

Беларуская, баўгарская, польская мовы: пераклады якой заўгодна складанасьці, індывідуальнае навучаньне. Тэл.: 221-23-68

Настройка піяніна. Тэл.: 221-23-68

Прадаю сэрыю з 4 марак Беларускай Народнай Рэспублікі, якая прысьвечаная 40-м угодкам Слуцкага збройнага чыну. Кошт 75.000 руб. Алесь Сабаленка, а/с 268, 220131, Менск, Беларусь

Беларуская, ангельская мовы: пераклады якой заўгодна складанасьці, індывідуальнае навучаньне. Тэл.: 278-27-35, 221-23-68

Праца ў хатніх умовах, паштовая, з выкарыстаньнем хатняга тэлефону, ад 3 млн. на месяц. Капэрта са зв/а + купон. 220073, Менск, а/с 26

Ксэракопія. Ф-А4, 900 руб. Тэл.: 253-92-26

Лідзкая філія ТБШ шукае фундатара дзеля правядзеньня конкурсу беларускай песьні і верша сярод першаклясьнікаў Лідчыны 7 ліпеня 1998 г. Код 711, р/р 3015202880019 «Белбізнэсбанк»

Алесь Карніенка! Віншую з днём нараджэньня! Андрэй

Маджахеда з Гомеля Алеся Карніенку віншую з днём народзінаў. П.Р.

Алеся Карніенку віншуем з днём нараджэньня. Калегі па барацьбе

Вітаю, віншую, зычу шчасьця ў дзень народзінаў Алесю Карніенку. Алесь М.

Гомельскага пасіянарыя Алеся Карніенку віншую з днём народзінаў. Менскі пасіянарый

Гомельскія маладафронтаўцы, прашу адгукнуцца (пажадана праз «Нашу Ніву»). Патэнцыяльная сяброўка Фронту

Праца ў хатніх умовах, 4 млн. на месяц. 2 капэрты, 1 са зв/а + купон б/а. 220073, Менск, а/с 26

Любы Алесік! Рызыкую прайграць спрэчку, але віншую з днём народзінаў! Цалую моцна й чакаю адказу (пакуль яшчэ)! Яўгенія

Ведайце ўсе! Гомельскі Грамадзянскі Форум жыў, жыве й будзе жыць! Я.

Здыму кватэру з тэлефонам у Менскім раёне. Тэл.: 221-18-60, 221-23-68

Happy birthday to you, Ales Karnijenka. Friends

Лепшыя віншаваньні для Алеся Карніенкі ў ягоны дзень нараджэньня. Сам ведаеш, хто

Прашу адгукнуцца, хто мае калекцыю «Песьняроў» на кампакт-дысках. Тэл.: 251-42-56 увечары (Хведар)

Дарагая Ванда! Віншую з днём народзінаў і горача цалую. Sahid

Кампутары 286 — Pentium, любая канфігурацыя. Тэл.: 237-56-12

КУПОН

Бясплатнай прыватнай абвесткі

Тэкст:

....

....

....

....

Імя і прозьвішча

Адрас, тэлефон

НАША НІВА

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220123, Менск, а/с 71

Беларускі Калегіюм

220036 Мінск, П.С. 31 тэл. 256 -36-13. E-mail: kalegium@user.unibel.by

Абвяшчае набор студэнтаў на дадатковае з 1 кастрычніка 1998 г.

Бакалаўрскае / магістэрскае навучаньне ў спэцыялізацыях:

філязофія / літаратура (праграма навучаньня прадугледжвае спэцыялізацыю: пераклад літаратуры па сацыяльных навуках)

журналістыка

найноўшая гісторыя

Цыкл навучаньня — тры гады, з наданьнем па выніках навучаньня ступеняў бакалаўра і магістра.

Прымаюцца студэнты старэйшых курсаў гуманітарных спэцыяльнасьцяў альбо асобы з вышэйшай адукацыяй па выніках сумоўя. У выключных выпадках прымаюцца й студэнты малодшых курсаў. Навучэнцы Калегіюму забясьпечваюцца навучальнымі і мэтадычнымі матар'яламі.

Навучэнцамі непасрэднай адукацыйнай сыстэмы Калегіюму могуць быць толькі асобы, што пастаянна альбо на час вучобы пражываюць у Менску. Разгортваньне дыстанцыйнай сыстэмы навучаньня (для студэнтаў Калегіюму па-за межамі Менску) плянуецца распачаць з 1 чэрвеня 1999 г.

Навучаньне ў Беларускім Калегіюме — бясплатнае.

Дыплём Калегіюму не замяняе сэртыфікат аб вышэйшай адукацыі.

Лекцыі Калегіюму зьяўляюцца адкрытымі. Асобы, якія не зьяўляюцца студэнтамі Калегіюму, але сыстэматычна наведваюць лекцыі, рэгіструюцца ў якасьці вольных слухачоў.

Навучальныя праграмы Калегіюму не дублююць існуючыя праграмы дзяржаўных і недзяржаўных унівэрсытэтаў у Беларусі.

Кірункі навучаньня па спэцыялізацыях ажыцьцяўляюць Цэнтар Эўрапейскага Супрацоўніцтва «ЭўроФорум» (філязофія / літаратура), Беларускі Гуманітарны Фонд «Наша Ніва» (найноўшая гісторыя), Беларуская Асацыяцыя журналістаў (журналістыка).

Запіс абітурыентаў — праз тэл.: 256-36-16 з 10.00 да 17.00 штодня акрамя суботы і нядзелі.

5 чэрвеня 1998 году **Славамір Адамовіч** запрашае да ўдзелу ў публічнай art-акцыі «Паэзія супраць дыктатуры». У **18.00** каля помніку Янку Купалу, што насупраць цырку, Аўтар чытае свае вершы.





ВІЛЕНСКІ ПЭДАГАГІЧНЫ ЎНІВЭРСЫТЭТ

па конкурсу атэстатаў набірае студэнтаў на 1 курс факультэту славістыкі па спэцыяльнасьцях:


*беларуская мова і журналістыка
*беларуская і расейская мова і літаратура
*беларуская мова і літаратура і гісторыя культуры
*беларуская мова і мэтодыка пачатковага навучаньня

Навучаньне платнае.
Форма навучаньня: завочнае (5 г.).
Прыём дакумэнтаў - да 1.09.98 г.

1. Атэстат (копія) альбо дыплём вышэйшай школы (выпіска).
2. Мэдыцынская даведка.
3. 4 фотакарткі (3х4).
4. Выпіска з працоўнай кніжкі (калі ёсьць).

Дакумэнты можна выслаць на адрас:
Baltarusių kalbos, literatūros bei etnokultūros katedra
Vilniaus pedagoginis universitetas
Studentш g. 39-527
2034 Vilnius
LIETUVA
тэл.: 72 58 01, 73 18 41
тэл. у Баранавічах — 8-01634-70503

1. Дакумэнты прымаюцца асабіста ці праз пошту на адрас унівэрсытэту. Пры перасылцы праз пошту далучаецца заява на імя рэктара ў свабоднай форме з указаньнем спэцыяльнасьці і зьвестак пра сябе.
2. 10 $ за рэгістрацыю дакумэнтаў і афармленьне візы ўносіцца асабіста пры падачы дакумэнтаў альбо пасьля прыезду на вучобу (калі дакумэнты перасланыя праз пошту).
3. Разам з выклікам на вучобу даецца інфармацыя адносна візы, жыльля, аплаты і г.д.
4. Віза пад час вучобы бясплатная.
5. Інтэрнат даецца пры наяўнасьці месцаў і аплочваецца студэнтам.
6. Аплата за вучобу пераводзіцца пасьля залічэньня праз банк, паштовым пераводам ці асабіста ў касу унівэрсытэту па прыезьдзе на сэсію. Тады ж падпісваецца дамова паміж студэнтам і рэктарам ВПУ.
7. Дыплём на тэрыторыі Беларусі мае юрыдычную сілу.
8. 1$ ЗША = 4 літы


Здымак М.Баразны

"Наша Ніва" незалежная газэта

НАША НІВА

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

рэдактар выпуску .... Сяргей Харэўскі
выдавец .... Рэдакцыя газэты "Наша Ніва"
заснавальнік .... Павал Жук
галоўны рэдактар .... Сяргей Дубавец
адказны сакратар .... Алег Дзярновіч
аддзел інфармацыі .... Андрэй Лапцёнак
Віктар Корзун
дызайн і вёрстка .... Лявон Раманчык
набор .... Аляксандра Макавік
стыль і карэктура .... Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле .... Сяргея Шупы

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220050 Менск, а/с 537
Тэл./факс (017) 227-78-92
E-mail: niva@user.unibel.by
http://members.xoom.com/Nasa_Niva

© НАША НІВА. Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая. Наклад 2780. 8 палос фармат А2 нумар падпісаны ў друк 3:56, 01/6/1998. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 3305. Кошт свабодны. [redacted]

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты "Известия", д. 8, кв. 173.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12